Беларуская рэспубліканская грамадская арганізацыя
“Аб’яднаны шлях”

# Энцыклапедыя
## тэрмінаў для грамадскіх арганізацый

М А З Ы Р
ТАА ВД “Белы вецер”
2 0 0 3

УДК
ББК

У к л а д а л ь н і к і :
В.С.Самалоўскіх, І.М.Чырко

Рэдактар:
Н.М.Козіч

Карэктура Н.М.Козіч
Камп’ютэрная вёрстка А.Д.Радзькоў
Дызайн вокладкі і малюнкі М.А.Нікіфаровіч

**Энцыклапедыя тэрмінаў для грамадскіх арганізацый** / БРГА “Аб’яднаны шлях”; Уклад. В.С.Самалоўскіх, І.М.Чырко; Рэд. Н.М.Козіч. - Мазыр: ТАА ВД “Белы Вецер”, 2003. - 120 с.

ISBN

Дадзенае выданне з’яўляецца спробай абагульнення ў адной кнізе тэрмінаў, якія датычацца розных бакоў дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў.

Прызначана для ўсіх, хто цікавіцца дзейнасцю грамадскіх арганізацый.

Выданне падтрымана Фондам Чарльза Сцюарта Мотта.

БРГА “Аб’яднаны шлях”, 2003

## Прадмова

Цэнтр развіцця грамадскіх арганізацый БРГА "Аб'яднаны шлях" прадстаўляе Вашай увазе "Энцыклапедыю тэрмінаў для грамадскіх арганізацый".

Гэта выданне з'яўляецца першай спробай абагульнення ў адной кнізе тэрмінаў, якія датычацца розных бакоў дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў. Энцыклапедыя ўтрымлівае як агульныя паняцці, так і тэрміны, што маюць дачыненне да прававых аспектаў дзейнасці грамадскіх арганізацый, пошуку фінансавання, арганізацыйнага развіцця, стратэгічнага планавання дзейнасці, грамадскіх сувязяў, сучасных тэхналогій, а таксама ў ёй прыведзены звесткі пра некаторыя міжнародныя арганізацыі.

Спадзяемся, што гэта кніга будзе карыснай як для нядаўна створаных, так для больш сталых і дасведчаных грамадскіх арганізацый, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца грамадскім жыццём і дзейнасцю "трэцяга сектара".

Свае меркаванні і ўдакладненні можна дасылаць на адрас:

БРГА "Аб'яднаны шлях"
вул.Уральская, 3-30,
Мінск, 220038, Беларусь

Тэл./факс.: (+375 017) 2303276, (+375 017) 2308054

Электронная пошта: uwb@user.unibel.by

Вэб-старонка: www.uwb.user.unibel.by

## Аб карыстанні

У дадзеным выданні тэрміны і фразеалагічныя спалучэнні згрупаваныя ў алфавітным парадку.

Кожны тэрмін альбо тэрміналагічны зварот даецца на беларускай, рускай і ангельскай мовах і ўтварае самастойны слоўнікава-панятыйны артыкул. Прадметны раздзел, да якога адносіцца тэрмін пазначаны у дужках пасля вызначанага слова (каля беларускамоўнага варыянта).

Звяртаем Вашу ўвагу на тое, што ў нашым выданні, у адрозненне ад іншых, тэрміны-словазлучэнні падаюцца ў найбольш ужывальным выглядзе, г.зн. найчасцей на першым месцы стаіць прыкметнік. Напрыклад, *"адміністратыўная адказнасць"* ці *"стратэгічнае планаванне"*.

Таксама, патрэбна заўважыць, што большасць з прыведзеных тэрмінаў маюць інтэрпрэтацыю з пункту гледжання грамадскай дзейнасці, альбо іх тлумачэнне непасрэдна звязана з прадметным раздзелам, да якога яны аднесены.

У сувязі з тым, што большасць з паняццяў, якія датычацца пошуку фінансавання і сувязяў з грамадскасцю прыйшлі да нас з-за мяжы, многія з іх падаюцца ва ўжывальным зараз выглядзе праз транслітэрацыю. Напрыклад, *"фандразінг"*.

У энцыклапедыі ўжываецца таксама сістэма спасылак, якія набіраюцца курсівам. Сістэма спасылак уключае пазнакі: *Гл.* ці *Гл. таксама.* Далей прыведзена, узятая ў двухкоссе, назва артыкула, на які ідзе спасылка.

**Умоўныя скарачэнні прадметных раздзелаў:**

**аг. п.** – агульныя паняцці,
**арг. разв.** – арганізацыйнае развіццё,
**стратэг. план.** – стратэгічнае планаванне,
**чалавеч. рэс.** – чалавечыя рэсурсы,
**пошук фінанс.** – пошук фінансавання,
**грамад. сув.** – грамадскія сувязі,
**сучасн. тэхн.** – сучасныя тэхналогіі,
**прав. аспекты** – прававыя аспекты,
**канкр. арг.** – канкрэтныя арганізацыі.

**Беларускі алфавіт:**
Аа, Бб, Вв, Гг, Дд (Дж, дж) (Дз, дз), Ее, Ёё, Жж, Зз, Іі, Кк, Лл, Мм, Нн, Оо, Пп, Рр, Сс, Тт, Уу, Ўў, Фф, Хх, Цц, Чч, Шш, ы, ь, Ээ, Юю, Яя.





# A

**Абавязак** (аг. п.)
**Обязанность**
**Duty**

Шэраг дзеянняў, ускладзеных на каго-небудзь і безумоўных для выканання.

**Абавязацельства** (прав. аспекты)
**Обязательство**
**Obligation**

Від цывільных праваадносін, у якіх адна асоба (даўжнік) абавязана здзейсніць на карысць другой асобы (крэдытора) пэўныя дзеянні (перадаць маёмасць, выканаць работу, заплаціць грошы і інш.) або ўтрымацца ад іх, а крэдытор мае права патрабаваць ад даўжніка выканання яго абавязку.

**Абавязкі грамадскіх арганізацый** (прав. аспекты)
**Обязанности общественных организаций**
**Responsibilities of NGOs**

Грамадская арганізацыя, як юрыдычная асоба мае наступныя абавязкі: да пачатку ажыццяўлення дзейнасці зарэгістравацца ва ўстаноўленым парадку, пасля дзяржаўнай рэгістрацыі здзейсніць усе неабходныя дзеянні і фармальнасці, звязаныя з набыццём статусу юрыдычнай асобы, ажыццяўляць статутную дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", іншымі актамі дзеючага заканадаўства і Статутам Грамадскага аб'яднанняў, прадастаўляць рэгіструючаму органу дакументы аб змене юрыдычнага адрасу, своечасова і ў поўным аб'ёме ўносіць падаткі і зборы, своечасова прадастаўляць статыстычную інфармацыю, арганізоўваць працу з дакументамі ў адпаведнасці з заканадаўствам аб справаводстве, забяспечыць накапленне, улік і выкарыстанне архіўных дакументаў.

**Абарона** (прав. аспекты)
**Защита**
**Defense**

1. Тое, што абараняе.
2. Працэсуальная дзейнасць, якая ажыццяўляецца бокам абароны з мэтай абвяржэння падазрэння альбо абвінавачвання альбо

змякчэння абвінавачвання, забеспячэнне правоў і інтарэсаў падазронага, абвінавачваемага, асобы, якая здзейсніла грамадска небяспечнае дзеянне.

**Аб'яднанне наймальнікаў** (прав. аспекты)
**Объединение нанимателей**
**Association of employers**

Добраахвотнае аб'яднанне юрыдычных і фізічных асоб, якім заканадаўствам дадзена права заключэння і спынення працоўнай дамовы з работнікам, якое мае на мэце прадстаўніцтва і абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў.

**Аб'яднанне юрыдычных асоб (асацыяцыі і саюзы)** (прав. аспекты)
**Объединения юридических лиц (ассоциации и союзы)**
**Unification of juridical persons (associations and unions)**

Камерцыйныя арганізацыі ў мэтах каардынацыі іх прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама прадстаўлення і аховы агульных маёмасных інтарэсаў могуць па дамове паміж сабой утвараць аб'яднанні ў форме асацыяцый альбо саюзаў, якія з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі.

**Агенцтва ЗША** (канкр. арг.)
**Агентство США**
**USA agency**

Карпарацыя, якая створана на падставе акта Кангрэса і з'яўляецца "агенцтвам" ЗША і кваліфікавана такім чынам па федэральных законах аб падатках, што яна не падлягае падаткаабкладанню.

**Аглядны артыкул** (грамад. сув.)
**Обзорная статья**
**Round-up article**

Сціслае абагульненае паведамленне ў друку пра падзеі, што адбыліся за пэўны прамежак часу ў грамадскім жыцці, навуцы, тэхніцы, мастацтве, літаратуры.
Шматлікія выданні не асабліва добра ставяцца да матэрыялаў, якія ўтвараюць імідж асобнай кампаніі (арганізацыі), але ж пры гэтым ім падабаюцца артыкулы, якія інтэгруюць досвед некалькіх арганізацый. Імідж некалькіх арганізацый можа палепшыцца ў выніку далучэння матэрыялаў аб іх у аглядны артыкул разам з матэрыяламі аб буйных арганізацыях.

**Агульнамэтавы грант** (пошук фінанс.)
**Общецелевой грант**
**General purpose grant**

Сінонім - агульная падтрымка. Грошы, неабходныя для працягу нармальнага функцыянавання арганізацыі і не прызначаныя для канкрэтных мэтаў.

**Адвакат** (прав. аспекты)
**Адвокат**
**Attorney**

Асоба, якая аказвае юрыдычную дапамогу грамадзянам і арганізацыям і з'яўляецца сябрам калегіі адвакатаў. Адвакатам Рэспублікі Беларусь можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, стаж працы па спецыяльнасці не меньш за тры гады альбо які не мае такога стажу, але прайшоў стажыроўку тэрмінам ад шасці месяцаў да аднаго году ў адвакатуры, здаў кваліфікацыйны экзамен і атрымаў ліцэнзію, якая дае права весці адвакацкую дзейнасць.

**Адміністратыўная адказнасць** (прав. аспекты)
**Административная ответственность**
**Administrative responsibility**

Адзін з відаў юрыдычнай адказнасці грамадзян і службовых асоб перад дзяржавай (у асобе правамоцнага адміністратыўнага органа або суда) за ўчыненае антыграмадскае дзеянне, адміністратыўнае правапарушэнне. У адрозненне ад крымінальнага злачынства адміністратыўная адказнасць настае за ўчыненне антыграмадскіх дзеянняў, што не ўяўляюць сабой вялікай грамадскай небяспекі. Выяўляецца ў накладанні на вінаватага адміністратыўнага спагнання. У адрозненне ад дысцыплінарнай адказнасці ўжываецца правамоцным органам за правапарушэнні, не звязаныя з выкананнем службовых абавязкаў. Падставы і парадак прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці рэгулююцца Кодэксам аб адміністратыўных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь і іншымі прававымі актамі.

**Адміністратыўны грант** (пошук фінанс.)
**Административный грант**
**Operating grant**
Грошы на пакрыццё выдаткаў, якія звязаны са штодзённай адміністратыўнай дзейнасцю арганізацыі.

**Адміністрацыя** (прав. аспекты)
**Администрация**
**Administration**
Дзяржаўныя органы, якія ажыццяўляюць выканаўча-гаспадарчую дзейнасць і забяспечваюць рэалізацыю законаў і іншых актаў заканадаўчых органаў у агульна-дзяржаўным маштабе. Органы кіравання прадпрыемствамі, аб'яднаннямі, установамі і арганізацыямі з'яўляюцца іх адміністрацыяй. Правы і абавязкі агульнадзяржаўнай адміністрацыі вызначаюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь (арт. 115-123), Законамі аб іх паўнамоцтвах і іншымі нарматыўнымі актамі. Адміністрацыя нясе адказнасць за працу давераных ёй устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый.

**Адрасная рассылка** (аг. п.)
**Адресная рассылка**
**Address mailing**
Вельмі важны метад звароту за ахвяраваннямі. Ён складаецца з перасылкі друкаваных матэрыялаў адразу на хатні адрас альбо ў кантору асобам ці арганізацыям.

**Акт** (прав. аспекты)
**Акт**
**Act**
Дакумент, складзены групай асоб, які пацвярджае ўстаноўленыя імі факты (акты інвентарызацыі, няшчасных выпадкаў, прыёмуперадачы матэрыяльных каштоўнасцяў і г.д.)

**Актывы** (пошук фінанс.)
**Активы**
**Assets**
Некаторая колькасць капіталу – грошы, акцыі, аблігацыі, нерухомая маёмасць альбо іншыя рэсурсы, якімі кіруе фонд альбо якая-небудзь праграма прадастаўлення фінансаў. Звычайна актывы ўкладаюцца далей і прыбытак ад іх выкарыстоўваецца на прадастаўленне грантаў.

**Аналіз навакольнага асяроддзя** (стратэг. план.)
**Анализ внешней среды**
**Environmental analysis**
Працэс стратэгічнага планавання, прызначаны для кантролю фактараў, знешніх у адносінах да арганізацыі, з мэтай вызначэння магчымасцяў і небяспек.

**Аналітык** (чалавеч. рэс.)
**Аналитик**
**Analyst**
Чалавек, які можа добра аналізаваць, схільны да аналітычнага мыслення.

**Анатацыя заяўкі** (пошук фінанс.)
**Аннотация заявки**
**Summary**
Кароткі, не больш за адну старонку, пераказ праекта, які паўтарае ўсе часткі поўнай заяўкі. Гэта адна з найважнейшых частак заяўкі. Большасць рэцэнзентаў на пачатку чытаюць толькі анатацыю, і калі яна падабаецца, пераходзяць да чытання поўнай заяўкі. Таму анатацыя павінна быць канкрэтнай і выразнай.

**Апісанне праблемы** (пошук фінанс.)
**Описание проблемы**
**Statement of need**
Раздзел заяўкі, у якім прадстаўлены доказы важнасці праблемы і безадкладнасці яе вырашэння.

**Апякун** (пошук фінанс.)
**Опекун**
**Trustee**
Сябра праўлення фонду, які дапамагае прымаць рашэнні аб прадастаўленні грантаў.

**Арганізацыйная культура** (арг. разв.)
**Организационная культура**
**Corporate culture**

Каштоўнасці, перакананні, чаканні і мадэлі паводзін, якія прымаюць усе, хто працуе ў арганізацыі.

**Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)** (канкр. арг.)
**Организация Объединённых Наций (ООН)**
**United Nations (UN)**

ААН – міжнародная арганізацыя, якая створана для падтрымкі міру, бяспекі, каардынацыі і развіцця міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і гуманітарнай галінах. Асноўныя прынцыпы дзейнасці ААН распрацоўваліся яшчэ падчас 2-й Сусветнай вайны дзяржавамі – ўдзельніцамі антыгітлераўскай кааліцыі. Заключным этапам стварэння ААН з'явілася канферэнцыя ў Сан-Францыска (1945), удзельнікамі якой былі 50 дзяржаў-заснавальніц, у тым ліку Украіна і Беларусь. На ёй быў прыняты статут ААН. Асноўнымі задачамі ААН абвяшчаюцца: пазбаўленне будучых пакаленняў ад бедстваў вайны, усталяванне веры ў асноўныя правы чалавека, у роўнасць правоў вялікіх і малых нацый, садзейнічанне сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоў жыцця, стварэнне ўмоў, пры якіх народы могуць захоўваць справядлівасць і павагу да міжнародных абавязацельстваў, выяўляць цярпімасць і жыць у міры адзін з адным, як добрыя суседзі. ААН мае выразны, добра збалансаваны структурны механізм, які складаецца з сістэмы галоўных і дапаможных органаў. Да галоўных адносяцца: Генеральная Асамблея ААН, Савет Бяспекі ААН, Эканамічны і Сацыяльны Саветы, Савет па апецы, Сакратарыят і Міжнародны суд ААН. Зараз налічваецца каля 300 дапаможных органаў. Колькасць іх неабмежавана, яны ствараюцца па неабходнасці галоўнымі органамі.

**Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па Пытаннях Адукацыі, Навукі і Культуры (ЮНЕСКА)** (канкр. арг.)
**Организация Объединённых Наций по Вопросам Образования, Науки и Культуры (ЮНЕСКО)**
**United Nations Educational Scientific and Cultural Organisation (UNESCO)**

Міжнародная арганізацыя, спецыялізаваная ўстанова Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, створаная 4.11.1947. Мэтай ЮНЕСКА з'яўляецца садзейнічанне ўмацаванню міру, бяспекі і супрацоўніцтву ўсіх народаў шляхам развіцця адукацыі, навукі і культуры ў інтарэсах забеспячэння ўсеагульнай павагі да справядлівасці, законнасці, асноўных правоў і свабод чалавека незалежна ад расы, полу, мовы альбо веравызнання. Штаб-кватэра ЮНЕСКА знаходзіцца ў Парыжы. У Рэспубліцы Беларусь камісія па справах ЮНЕСКА створана 15.11.1956, яна каардынуе дзейнасць культурна-асветніцкіх і навуковых устаноў Рэспублікі па супрацоўніцтве з ЮНЕСКА. Дзейнасць ЮНЕСКА ахоплівае шырокае кола пытанняў, такіх як: ліквідацыя непісьменнасці і барацьба з дыскрымінацыяй у галіне асветы, выхаванне моладзі ў духу міру, міжнароднага ўзаемаразумення, садзейнічанне ў падрыхтоўцы нацынальных кадраў, вывучэнне нацыянальнай культуры, праблем акіянаграфіі, біясферы, сацыяльных навук і інш., садзейнічанне міжнароднаму кнігаабмену.

**Арганізацыя ўзаемадапамогі** (прав. аспекты)
**Организация взаимопомощи**
**Organisation of mutual assistance**

Арганізацыя людзей з агульнымі праблемамі альбо жыццёвымі сітуацыямі, якія вельмі часта ахопліваюць нацыянальную альбо рэгіянальную зону. Людзі, якія зацікаўлены ў дадзенай праблеме, хаця самі яе і не маюць, таксама могуць быць прынятыя ў арганізацыю.

**Артыкул** (аг.п.)
**Статья**
**Article**

1. Невялікі (бывае і значны памерам) навуковы, публіцыстычны або літаратурна-крытычны твор у газеце, часопісе, зборніку, кнізе.
2. У праве – асобная самастойная частка нарматыўнага акта, у якой найчасцей змешчана адна юрыдычная норма, адно абавязковае правіла.
3. У бухгалтарскім уліку – раздзел, які змяшчае назвы крыніц прыбытку і мэтавага прызначэння фінансавых выдаткаў.

**Арэнда** (прав. аспекты)
**Аренда**
**Lease**

Заснаванае на дамове часовае кампенсуемае валоданне і карыстанне маёмасцю, неабходнай арандатару для самастойнага ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці.

**Арэндная плата** (прав. аспекты)
**Арендная плата**
**Rent**

Грашовая кампенсацыя за арандаваную плошчу. Арэндная плата ўсталёўваецца дамовай як частка матэрыяльных затрат арандатара, якая ўключаецца ў сабекошт прадукцыі (работ, паслуг), і як прыбытак арганізацыі. Арэндная плата можа ўсталёўвацца на ўсю арандаваную маёмасць у сукупнасці ці асобна на кожны аб'ект. Адносіны паміж бакамі па амартызацыйных адлічэннях ад кошту арандаванай маёмасці вызначаюцца ў дамове арэнды зыходзячы з разліку абавязкаў бакоў па аднаўленні перададзенай ў арэнду маёмасці. У выпадках, калі аднаўленне арандаванай маёмасці цалкам здзяйсняе арандатар, амартызацыйныя адлічэнні не перадаюцца арэндадаўцу і належаць толькі арандатару. У гэтым выпадку рашэнне аб аднаўленні арандаванай маёмасці арандатар прымае самастойна.

**Асабіста-дзелавы ліст** (грамад. сув.)
**Лично-деловое письмо**
**Personally-business letter**

Гэта ліст, напісаны прыватнай асобай (кліентам) у дзелавую арганізацыю па дзелавым пытанні.

**Асацыяваны фонд** (пошук фінанс.)
**Ассоциированный фонд**
**Company-sponsored foundation**

Прыватны фонд, актывы якога атрыманы ад унёскаў бізнес-сектара. Нягледзячы на тое, што асацыяваны фонд цесна звязаны з камерцыйнай арганізацыяй, якая яго фінансуе, гэта – незалежная арганізацыя з яе ўласным забеспячэннем, якая падпарадкоўваецца тым жа правілам і інструкцыям, што і астатнія прыватныя фонды.

**Асноўныя капіталаўкладанні** (пошук фінанс.)
**Основные капиталовложения**
**Basic investments**

Сродкі, неабходныя для фінансавання асноўнай структуры арганізацыі, уключаючы заработную плату штатных супрацоўнікаў, аплату памяшканняў, сродкаў сувязі, а таксама штодзённыя працоўныя затраты. Бюджэт асноўных капіталаўкладанняў часта





робіцца асобна ад астаніх звязаных з праектам фінансавых выдаткаў.

**Асобасны стыль кіравання** (арг. разв.)
**Личностный стиль управления**
**Personal style of leadership**

Кіраўнік тыпу "спачатку людзі, справа потым". Галоўнае для яго – добрыя ўзаемаадносіны ў арганізацыі. У якасці стымулу спрабуе зрабіць так, каб людзі былі задаволены: пры дапамозе розных ільгот, падтрымкі пачуцця бяспекі, сацыяльных праграм.

**Аўдыт** (аг. п.)
**Аудит**
**Audit**

Сістэматычная і незалежная праверка дакументацыі і дзейнасці арганізацыі. *(гл. таксама "аўдытарская дзейнасць")*

**Аўдыт адпаведнасці** (аг. п.)
**Аудит соответствия**
**Audit of accordance**

Праверка выканання дзяржаўных патрабаванняў, падатковых ці іншых прававых аспектаў, часцей за ўсё ён праводзіцца прадстаўнікамі дзяржаўных органаў.

**Аўдытар** (аг. п.)
**Аудитор**
**Auditor**

Асоба, якая на падставе спецыяльнага кантракта правярае фінансава-вытворчую дзейнасць арганізацыі ці ўстановы.

**Аўдытарская дзейнасць** (аг. п.)
**Аудиторская деятельность**
**Audit**

Незалежная праверка аўдытарамі ці аўдытарскімі арганізацыямі бухгалтарскай (фінансавай) справаздачы і іншых дакументаў суб'ектаў гаспадарання з мэтай ацэнкі дакладнасці і адпаведнасці здзейсненых фінансавых і гаспадарчых аперацый заканадаўству Рэспублікі Беларусь, накіраваная на абарону інтарэсаў уласнікаў; аказанне дапамогі суб'ектам гаспадарання, сад-

зейнічанне ім у правільнасці разлікаў з бюджэтам і ў павышэнні эфектыўнасці іх дзейнасці.

**Аўтаномны рэжым сістэмы** (сучасн. тэхн.)
**Автономный режим системы**
**Offline**

Рэжым, калі Ваш камп'ютэр не злучаны з мясцовай сістэмай ці Сеткай.

**Аўтарскае права** (прав. аспекты)
**Авторское право**
**Copyright**

Права аўтарства вызначае прыналежнасць твора канкрэтнаму аўтару. Парушэнне гэтага выключнага права (прысваенне аўтарства – плагіят) вядзе да пакарання ў крымінальным парадку. Права на аўтарскае імя азначае, што толькі аўтару належыць права вызначыць, пад якім імем (уласным, псеўданімам, ананімна) ён будзе выпускаць твор у свет. Права на недатыкальнасць твора не дазваляе нікому, акрамя аўтара, уносіць якія-небудзь змены ў сам твор, у яго назву.

**Аўтарскі артыкул** (грамад. сув.)
**Авторская статья**
**By-liner**

Зварот да грамадскасці праз надрукаваны артыкул ад імя канкрэтнай службовай асобы арганізацыі (кіраўніка), часцей за ўсё, складзены спецыялістам па сувязях з грамадскасцю. Выкарыстанне такога артыкула надае публікацыі прэстыжнасць. Аўтарскія артыкулы прадстаўляюць кіраўніка ў якасці эксперта і павышаюць рэпутацыю арганізацыі і кіраўніцтва, як крыніцы, якая заслугоўвае даверу. Арганізацыя выкарыстоўвае копіі такіх артыкулаў у прамой рассылцы ў мэтах фарміравання і падтрымкі свайго пазітыўнага іміджу для ключавых кантактных груп (мэтавай аўдыторыі).

**Ахвяраванне** (прав. аспекты)
**Пожертвование**
**Endowment fund**

Ахвяраваннем лічыцца дарэнне рэчы ці права ў грамадскакарысных мэтах.





**Ахоўныя дакументы аўтарскага права** (прав. аспекты)
**Охранные документы авторского права**
**Copyright safe-conduct documents**

Пісьмовы акт, які сцвярджае ці абвяргае права на ўзнікненне і ажыццяўленне аўтарскага права. Па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь не патрабуецца рэгістраваць выкананыя ці выконваць якія-небудзь іншыя фармальнасці, таму што аўтарскае права (арт. 9 Закона "Аб аўтарскім праве і сумежных правах") узнікае з-за факта стварэння твора навукі, літаратуры і мастацтва.

**Ацэнка вынікаў праекта** (пошук фінанс.)
**Оценка результатов проекта**
**Results evaluation of a project**

Гэта працэс выяўлення адпаведнасці выкарыстоўваемых падчас выканання праекта мер і запланаваных мэтаў, а таксама выяўленне, у якой ступені гэтыя меры садзейнічаюць дасягненню сфармуляванай у праекце мэце. Ацэнкі павінны быць закладзены ў плане дзеянняў і здзяйсняцца ў працэсе ажыццяўлення праекта і пасля яго завяршэння, каб можна было ўбачыць ці дасягнуў праект чаканых вынікаў. Унутраныя ацэнкі, у выпадку наяўнасці праблем могуць, час ад часу, ажыццяўляцца супрацоўнікамі праекта. Кансультанты, а таксама прадстаўнікі арганізацыі, якая фінансуе праект, могуць зрабіць свае ацэнкі, каб вызначыць ступень дзейнасці прымаемых мер, дзеля далейшага развіцця праекта.

**Ацэнка дзейнасці** (арг. разв.)
**Оценка деятельности**
**Activity evaluation**

Працэс вызначэння карыснасці і эфектыўнасці працы.

## Б

**База дадзеных** (аг. п.)
**База данных**
**Database**

Збор узаемазвязаных дадзеных, якія могуць размяшчацца і сарціравацца пры дапамозе электронікі.

**Баланс** (аг. п.)
**Баланс**
**Balance**
1. Параўнальны вынік прыходу і расходу.
2. Зводная ведамасць аб стане прыходна-расходных сродкаў прадпрыемства на канкрэтны дзень.

**Банкі** (аг п.)
**Банки**
**Banks**
Банкамі з'яўляюцца дзяржаўныя, акцыянерныя, кааператыўныя і іншыя ўстановы, якія прыцягваюць грашовыя сродкі і размяшчаюць іх у форме крэдыту, таксама яны ажыццяўляюць іншыя аперацыі ў адпаведнасці з існуючым заканадаўствам.

**Бачанне арганізацыі** (арг. разв.)
**Видение организации**
**Vision of NGO**
Вобраз будучай арганізацыі праз год-тры-пяць, які фарміруецца разам з місіяй.

**Бенефіцыяр** (пошук фінанс.)
**Бенефициар**
**Beneficiary**
Асоба, якая атрымлівае грант ад фонда альбо па якой-небудзь праграме прадастаўлення фінансавай падтрымкі, з'яўляецца бенефіцыярам *(гл. таксама "грантаатрымальнік").*

**Бланк дакументаў** (аг. п.)
**Бланк документов**
**Form of documents**
Аркуш са спецыяльна надрукаванымі графамі, які запаўняецца якімі-небудзь афіцыйнымі звесткамі, афіцыйным тэкстам.
Ва ўстановах, арганізацыях патрэбна распрацоўваць бланкі двух відаў: бланк для лістоў і агульны бланк для іншых арганізацыйна-распарадчых дакументаў. Бланкі тыпавых дакументаў масавага ўжывання, як правіла, павінны мець трафарэтныя часткі тэксту са сталай інфармацыяй, якія пры афармленні дакумента дапаўняюцца пераменнай інфармацыяй.





**Брашура** (грамад. сув.)
**Брошюра**
**Brochure**
Сфальцаванае і сшытае неперыядычнае выданне адносна вялікага аб'ёму (звыш 4, але не больш за 48 старонак), у якім падрабязна выкладаюцца ўласцівасці пэўнага прадукту ці дзейнасці, звычайна выкарыстоўваецца для падсумавання досведу.

**Брэндынг** (грамад. сув.)
**Брендинг**
**Branding**
Стварэнне фірменнага стылю арганізацыі, які фарміруе яе ўнікальны імідж і дапамагае адрозніваць ад іншых. На практыцы брэнд – назва, якая звязана ў свядомасці публікі з вобразам канкрэтнага тавару, фірмы ці арганізацыі. Часта падмацоўваецца візуальнымі выявамі – лагатыпам ці фірменным знакам, сімволікай. Яго мэта – зрабіць магчымым адрозненне адных рэчаў, якія прапануюцца (у нашай практыцы гэта можа быць арганізацыя, кампанія, акцыя), ад іншых.

**Буклет** (грамад. сув.)
**Буклет**
**Booklet**
Сфальцаванае, але не сшытае выданне вялікім накладам, можа быць прысвечана аднаму ці некалькім прадуктам альбо ўсёй арганізацыі. Асаблівасці буклету – перавага мастацкага афармлення (дызайн, фота, малюнкі) над тэкстам.

**Бухгалтарскі ўлік** (аг. п.)
**Бухгалтерский учёт**
**Business accounting**
Сістэма суцэльнага і безупыннага дакументальнага адлюстравання ў грашовай форме інфармацыі аб абароце капіталу ў працэсе гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства, установы, арганізацыі і іншых юрыдычных асоб. Ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам і нацыянальнымі стандартамі рахункаводства ўсімі юрыдычнымі асобамі незалежна ад іх арганізацыйна-прававога статуса і формаў уласнасці з моманту ўтварэння і да ліквідацыі.

**Бэкграўндэр** (грамад. сув.)
**Бэкграундер**
**Backgrounder**

Інфармацыя бягучага характару. Гэта навіна, якая не з'яўляецца сенсацыяй. Напрыклад, аб надыходзячым "Дні адчыненых дзвярэй". Такую інфармацыю неабходна адсылаць рэгулярна – дзеля падтрымкі наплыву навін, якія зыходзяць з арганізацыі.

**Бюджэт** (аг. п.)
**Бюджет**
**Budget**

Заканадаўча зацверджаны роспіс грашовых прыбыткаў і выдаткаў дзяржавы, прадпрыемства, арганізацыі ці канкрэтнай асобы на вызначаны тэрмін.

**Бюджэт праекта** (пошук фінанс.)
**Бюджет проекта**
**Project budget**

Фінансавы план, які паказвае арганізацыям і донарам колькі каштуе дасягненне канчатковай мэты праекта.

**Бягучы рахунак** (прав. аспекты)
**Текущий счёт**
**Liquid bank account**

Рахунак, які адчыняюць у крэдытнай установе для залічэння паступаючых для яго грашовых сродкаў і ажыццяўлення разліковых аперацый як у безнаяўнай, так і ў наяўнай формах, якія выцякаюць са статутнай дзейнасці.

# В

**Валанцёр** (чалавеч. рэс.)
**Волонтёр**
**Volunteer**

Чалавек, які добраахвотна бярэ на сябе якую-небудзь працу.

**Велічыня праграмы** (пошук фінанс.)
**Величина программы**
**Programme amount**

Колькаснае выражэнне запатрабаваных сродкаў на ажыццяўленне праграмы; сума, якая выдаткавана на фінансаванне





ВАЛАНЦЁРЫ



*Нам хлеба не трэба – нам працу давай*

вызначанай праграмы, па раней узгодненай дамове з фондам-грантадаўцам.

**Відэаканферэнцыя** (аг.п.)
**Видеоконференция**
**Videoconference**

Канферэнцыя, удзельнікі якой могуць знаходзіцца на вялікіх адлегласцях адзін ад аднаго і абменьвацца моўнай, графічнай і іншай інфармацыяй, а таксама відарысамі ўдзельнікаў з выкарыстаннем сродкаў тэлевізійнай сувязі ці кап'ютэрнай сеткі. *(гл. таксама – "канферэнцыя")*

**Выбар стратэгічных мэтаў** (стратэг. план.)
**Выбор стратегических целей**
**Choice of strategic goals**

Высвятленне прыярытэтаў магчымых накірункаў дзейнасці, заснаваных на правільным і доўгатэрміновым прагназаванні.

**Выдавецкая дзейнасць** (аг. п.)
**Издательская деятельность**
**Publishing activity**

Гэта дзеянні, якія ўключаюць у сябе рэдакцыйна-выдавецкую падрыхтоўку выдання і якія накіраваны на атрыманне паліграфічна аформленага выдання (выдавецкай прадукцыі), якое мае ўстаноўленыя зыходныя звесткі, і прызначана для перадачы інфармацыі.

**Выданне** (аг. п.)
**Издание**
**Publication**

1. Выдадзены твор друку.
2. Адзіночны выпуск у свет (друкаванага твору) у канкрэтнай колькасці экзэмпляраў.

**Выключнае права** (прав. аспекты)
**Исключительное право**
**Exclusive right**

Пад выключным правам разумеюць суб'ектыўныя абсалютныя правы, якія забяспечваюць іх носьбітаў правамоцным здзяйсненнем розных дзеянняў з адначасовай забаронай іншым асобам здзяйсняць такія ж дзеянні. Гэта права датычыцца аб'ектаў інтэлектуальнай маёмасці. Выключнае права прадастаўляецца толькі аўтару, законнаму ўладальніку альбо асобе, атрымаўшай гэта права па дамове ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

**Выключныя правы на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці** (прав. аспекты)
**Исключительные права на результаты интеллектуальной деятельности**
**Exclusive right for results of intellectual activity**

Выключнае права на творы навукі, літаратуры і мастацтва (аўтарскае права); на выкананні, пастаноўкі, фанаграмы, перадачы эфірнага ці кабельнага вяшчання (сумежныя правы); на вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, гандлёвыя знакі, знакі абслугоўвання, фірменныя назвы, указанні паходжання ці назва месца паходжання тавара (прамысловая ўласнасць); тапалогіі інтэгральных мікрасхем, праграмы для электронна-вылічальных машын і базы дадзеных і іншыя вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, ахова якіх прадугледжана заканадаўствам.

**Выраўноўваючы грант** (пошук фінанс.)
**Выравнивающий грант**
**Matching grant**

Грошы, якія запаўняюць "прабелы" бюджэту праекта пасля атрымання асноўнага фінансавання.

**Вэб броўзэр** (суч. тэхн.)
**Веб броузер**
**Web browser**

Праграмнае забеспячэнне, якое дазваляе карыстальніку ў прывабным для яго выглядзе працаваць з аддаленым Web-серверам з Вашага камп'ютэра. Найбольш вядомыя праграмы-броўзэры Netscape Navigator, Microsoft Internet Explorer.

**Вэб старонка** (сучасн. тэхн.)
**Веб страница**
**Web page**

Гэта HTML (Hypertext Markup Language) дакумент, які ўтрымлівае лагічна закончаную сукупнасць інфармацыі, якая знаходзіцца на Вэб серверы.

## Г

**Гадавая справаздача** (грамад. сув.)
**Годовой отчёт**
**Annual report**

Звычайная штогадовая фінансавая справаздача, прызначаная для кантралюючых органаў, акцыянераў і спонсараў. Апошнім часам яна ператварылася ў па-мастацку аформленае рэкламнае выданне, якое паказвае не толькі магчымасці арганізацыі выканаць нейкія праектныя заданні, але і яе здольнасці эфектыўна прадставіць сваю дзейнасць для зацікаўленых колаў грамадскасці. У гадавой справаздачы вызначаюць дзве асноўныя часткі: лічбы, якія павінны паказаць фінансавыя поспехі арганізацыі, і афармленне,

што прадстаўляе яе культуру і крэатыўнасць, таксама ў справаздачах прадстаўляецца грамадскае значэнне дзейнасці арганізацыі і яе стратэгічныя накірункі. Зразумела, што гэтая форма рэкламы набывае рэальную важнасць ва ўмовах, калі можна падтрымліваць інфармацыйную і фінансавую празрыстасць дзейнасці арганізацыі.

**Гандлёвая палата** (прав. аспекты)
**Торговая палата**
**Chamber of commerce**

Гандлёвая Палата – неабкладаемая падаткамі арганізацыя, намаганні якой накіраваны на рэалізацыю агульных эканамічных інтарэсаў усіх камерцыйных прадпрыемстваў у дадзеным рэгіёне. "Гандлёвы Савет" і "Савет па Нерухомасці" з'яўляюцца органамі, падобнымі на Гандлёвую палату.

**Гарантыя** (прав. аспекты)
**Гарантия**
**Guarantee**

Парука, умова, якая забяспечвае што-небудзь, адзін са сродкаў забеспячэння абавязацельстваў. Гарант абавязваецца перад крэдыторам іншай асобы (даўжніка) адказваць цалкам ці часткова за выкананне абавязацельства гэтай асобы.

**Гарантыі для грамадскіх арганізацый** (прав. аспекты)
**Гарантии для общественных организаций**
**Guarantees for NGOs**

Дзяржава забяспечвае захаванне і ахову правоў і законных інтарэсаў грамадскіх арганізацый. Умяшальніцтва дзяржаўных органаў і службовых асоб у дзейнасць грамадскай арганізацыі, як і ўмяшальніцтва грамадскіх арганізацый у дзейнасць дзяржаўных органаў і службовых асоб з'яўляецца недапушчальнай, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (Крымінальны Кодэкс Рэспублікі Беларусь (арт. 194)).

**Гарызантальны падзел працы** (арг. разв.)
**Горизантальное разделение труда**
**Horizontal labour division**

Падзел вялікай колькасці працы на шматлікія невялікія спецыялізаваныя заданні, які дазваляе арганізацыі працаваць больш эфектыўна, чым калі б тыя самыя людзі працавалі самастойна.





**Геаграфія фонду** (пошук фінанс.)
**География фонда**
**Geography of a foundation**

Большасць фондаў і іншых крыніц фінансавання акрэсліваюць сваю дзейнасць пэўнымі часткамі свету, рэгіёнамі, дзяржавамі, абласцямі альбо раёнамі. Гэта можа датычыцца і месца правядзення працы і месцазнаходжання арганізацыі, якая выконвае праект.

**Грамадзянская супольнасць** (аг.п.)
**Гражданское сообщество**
**Civil society**

Мадэль арганізацыі грамадства, якая ў найбольшай ступені шануе чалавечую свабоду, годнасць і сталасць. Яна не толькі дэкларуе гэта, але пацвярджае на практыцы: у грамадзянскай супольнасці чалавек сапраўды свабодны і мае магчымасці рэалізоў-ваць сваю свабоду. Грамадзянская супольнасць забяспечвае свабодную прастору для грамадскага плюралізму.

**Грамадзянства Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Гражданство Республики Беларусь**
**Citizenship of the Republic of Belarus**

Неад'емны атрыбут дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, які вызначае прыналежнасць асобы дзяржаве, акрэслівае сукупнасць яе правоў і абавязкаў, іх абарону Рэспублікай Беларусь.

**Грамадская арганізацыя** (прав. аспекты)
**Общественная организация**
**Non-Governmental Organisation (NGO)**

Арганізацыя, заснаваная прыватнымі асобамі, створаная для рэалізацыі канкрэтнай непрыбытковай мэты, якая мае грамадскую значнасць.

**Грамадская дабрачынная арганізацыя** (прав. аспекты)
**Общественная благотворительная организация**
**Non-Governmental Charitable Organisation**

Некамерцыйная арганізацыя, вызваленая ад падаткаабкладання, якая атрымоўвае сродкі з бюджэту фондаў і карпарацый. Некаторыя дабрачынныя арганізацыі самі прадастаўляюць гранты.

**Грамадская думка** (аг. п.)
**Общественное мнение**
**Public opinion**

Думка большасці членаў грамадства па якім-небудзь канкрэтным пытанні альбо факце, у якім зацікаўлены гэтыя людзі.




**Грамадская падтрымка** (грамад. сув.)
**Общественная поддержка**
**Public support**

Добраахвотная дапамога, якая аказваецца рознымі сацыяльнымі сіламі і групамі (насельніцтвам, органамі ўлады, палітычнымі партыямі, іншымі сацыяльнымі рухамі і г.д.).

**Грамадская ўстанова** (прав. аспекты)
**Общественное учреждение**
**Public-service institution**

Грамадскае аб'яднанне, якое не мае сяброўства і ставіць перад сабой мэту – аказваць канкрэтнага віду паслугі, якія адпавядаюць інтарэсам удзельнікаў і адпавядаюць статутным мэтам указанага аб'яднання.

**Грамадскі рух** (прав. аспекты)
**Общественное движение**
**Social movement**

Грамадскім рухам з'яўляецца масавае грамадскае аб'яднанне, якое не мае сяброўства і ставіць перад сабой сацыяльныя, палітычныя і іншыя грамадска карысныя мэты, што падтрымліваюцца ўдзельнікамі грамадскага руху. Вышэйшым кіруючым органам грамадскага руху з'яўляецца з'езд (канферэнцыя) альбо агульны сход. У выпадку дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага





руху яго дзеючы кіруючы орган (выбарчы калегіяльны орган) здзяйсняе правы юрыдычнай асобы ад імя грамадскага руху і выконвае яго абавязкі ў апаведнасці са статутам.

**Грамадскі фонд** (прав. аспекты)
**Общественный фонд**
**Civil foundation**

Грамадскае аб'яднанне, якое не мае сяброўства, і мэта якога – фарміраванне маёмасці праз добраахвотныя ўнёскі, іншыя не забароненыя законам паступленні і выкарыстанне дадзенай маёмасці на грамадска карысныя мэты.

**Грамадства** (аг. п.)
**Общество**
**Society**

Сістэма, для якой характэрныя: наяўнасць пэўнай структуры, дыферынцыйнасць, вызначанасць прынцыпаў узаемасувязі і ўзаемадзеяння паміж элементамі (нарматыўнасць), наяў-насць базавай адзінкі, а таксама цэльнасць як сістэмная якасць.

**Грант** (пошук фінанс.)
**Грант**
**Grant**

З ангельскай мовы – дар, акт дарэння, субсідыя. Сродкі, якія бязвыплатна перадае фонд, карпарацыя, урадавая ўстанова, прыватная асоба арганізацыі, групе асоб ціі прыватнай асобе для выканання канкрэтнай працы.

**Грант для кансультацый** (пошук фінанс.)
**Грант для консультаций**
**Consulting grant**

Субсідыя для пакрыцця выдаткаў, звязаных з атрыманнем кансультацый па праекце альбо па справах арганізацыі.

**Грант для планавання** (пошук фінанс.)
**Грант для планирования**
**Planning grant**

Сродкі на правядзенне даследаванняў для складання праекта.

**Грант на даследаванні** (пошук фінанс.)
**Грант на исследования**
**Research grant**

Грант на даследаванні, што запланаваныя ў праекце.

**Грант на правядзенне канферэнцыі** (пошук фінанс.)
**Грант на проведение конференции**
**Conference grant**

Субсідыя для пакрыцця выдаткаў, звязаных з правядзеннм канферэнцыі.

**Грант прамога дзеяння** (пошук фінансав.)
**Грант прямого действия**
**Operating support grant**

Грант, які ідзе на аплату працы штатных супрацоўнікаў, пакрыццё ад-міністратыўных і іншых выдаткаў дадзенай праграмы альбо праекта.

**Грантаатрымальнік** (пошук фінанс.)
**Грантополучатель**
**Grantee, donee**

Асоба ці арганізацыя, якая атрымоўвае ад фонда запрошаныя сродкі на рэалізацію свайго праекта *(гл. таксама "беніфіцыяр").*

**Гранты асобам** (пошук фінанс.)
**Гранты лицам**
**Grants to individuals**

Сродкі, якія выдзяляюцца перш за ўсё асобам, а не непрыбытковым арганізацыям (звычайна стыпендыі і дапамога студэнтам).

**Група ўзаемадапамогі** (чалавеч. рэс.)
**Группа взаимопомощи**
**Group of mutual assistance**

Група людзей, перад якімі стаяць агульныя праблемы ці жыццёвыя сітуацыі і якія сабраліся разам дзеля падтрымкі і абмену інфармацыяй. Члены групы кіруюць ёй, вырашаюць, што яна будзе рабіць і якую карысць прынясе яе дзейнасць.





# Д

**Дабрачыннасць** (аг. п.)
**Благотворительность**
**Charity**

1. Бязвыплатная перадача сродкаў (дабрачыннае ахвяраванне), маёмасці, тавараў на патрэбы сацыяльнага альбо якога-небудзь іншага характару.
2. Аказанне матэрыяльнай дапамогі маламаёмным, сацыяльна неабароненым прыватнымі асобамі ці арганізацыямі. Можа быць накіравана на падтрымку, развіццё і заахвочванне грамадска значных формаў дзейнасці (напр., ахову навакольнага асяроддзя, помнікаў культуры і інш.)

**Дабрачынная акцыя** (аг. п.)
**Благотворительная акция**
**Charitable action**

Спецыяльна арганізаванае мерапрыемства па збору сродкаў, удзел у якім з'яўляецца платным для запрошаных і падчас якога ідзе збор ахвяраванняў (канцэрт, спектакль, танцы, кірмаш, аўкцыён, латарэя, прэзентацыя праграмы альбо нейкае здарэнне ў жыцці арганізацыі).

**Дабрачынная дзейнасць** (прав. аспекты)
**Благотворительная деятельность**
**Charitable activity**

1. Бескарыслівая дзейнасць, якая накіравана на карысць грамадства.
2. Пад дабрачыннай дзейнасцю разумеюць добраахвотную дзейнасць у форме безвыплатнай ці на ільготных умовах перадачы ва ўласнасць маёмасці, у тым ліку грашовых сродкаў і (ці) аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, ці правоў валодання, карыстання і распараджэння любымі аб'ектамі права ўласнасці, а таксама дзейнасць у форме бязвыплатнага ці на ільготных умовах выканання работ, аказання паслуг.

**Дабрачынны рахунак** (прав. аспекты)
**Благотворительный счет**
**Charitable account**

Рахунак мэтавага характару, адчынены ў банку прадпрыемствамі, прадпрымальнікамі і грамадзянамі для збору, захавання і

выкарыстання грашовых сродкаў, якія паступаюць у выглядзе бязвыплатнай дапамогі альбо ахвяравання з мэтай правядзення дабрачынных акцый, напрыклад, для лячэння грамадзян, будаўніцтва аб'ектаў розных прызначэнняў, а таксама – рамонту, рэканструкцыі будынкаў, якія з'яўляюцца культурнай альбо гістарычнай каштоўнасцю, для правядзення экалагічных мерапрыемстваў і інш.

**Дабрачынца** (аг. п.)
**Благотворитель**
**Philanthropist**

Асоба (арганізацыя), якая ажыццяўляе дабрачынную дзейнасць і не атрымоўвае за гэта ніякіх паслуг альбо матэрыяльных выгад ад суб'екта дабрачыннасці.

**Дадаткі ў заяўцы** (пошук фінанс.)
**Приложения в заявке**
**Appendix**

У дадзены раздзел уключаюцца звесткі, якія гратадаўца, магчыма, захоча мець у сваім распараджэнні, але якія няма неабходнасці ўключаць у асноўны тэкст заяўкі. Часцей за ўсё гэта частка заяўкі ўтрымлівае наступныя дакументы: табліцы і графікі, на якія вы спасылаецеся, пасведчанне аб рэгістрацыі, структура арганізацыі, спіс сябраў праўлення, лісты з выказваннем падтрымкі ад іншых арганізацый, рэзюме кансультантаў ці выканаўцаў праекта, абавязкі мяркуемага персаналу праекта, статыстычныя дадзеныя, фінансавыя дакументы, якія прайшлі аўдытарскую праверку, ацэначны інструментарый (анкеты, тэсты), газетныя артыкулы, брашуры, спіс коштаў неабходнага абсталявання.

**Дакладныя запіскі** (аг. п.)
**Докладные записки**
**Report**

Дакладныя запіскі ствараюцца для выкладання якога-небудзь пытання з вывадамі і прапановамі. Знешнія дакладныя запіскі падпісваюцца кіраўніком і афармляюцца на агульным бланку, унутраныя – падпісваюцца складальнікамі і афармляюцца на лісце паперы фармату А4.

**Далейшае (будучае) фінансаванне** (пошук фінанс.)
**Дальнейшее (будущее) финансирование**
**Future funding**

Раздзел заяўкі, у якім абгрунтоўваюцца шляхі фінансавага забеспячэння дзейнасці па заканчэнні праекта.

**Далейшая падтрымка** (пошук фінанс.)
**Дальнейшая поддержка**
**Continuous support**

Грант, выдача якога ўзнаўляецца на пастаяннай аснове.

**Дамова** (прав. аспекты)
**Договор**
**Contract**

Дамовай прызнаецца пагадненне паміж дзвюма альбо некалькімі асобамі аб усталяванні, змене ці спыненні грамадзянскіх правоў і абавязкаў.

**Дамова арэнды** (прав. аспекты)
**Договор аренды**
**Lease contract**

Дамова, паводле якой адзін бок (арэндадаўца) абавязваецца перадаць другому боку (арандатару) якую-небудзь маёмасць у часовае карыстанне за пэўную плату. У гэтай дамове выдзяляюцца кошт і аб'екты дзяржаўнай маёмасці, якія датычацца невытворчай сферы (жыллёва-камунальнага, сацыяльнага прызначэння), якія могуць перадавацца арандатару ў бязвыплатнае карыстанне. У дамове пазначаюць абавязацельствы арандатара ў адносінах да гэтых аб'ектаў. У дамову арэнды могуць быць уключаны абавязкі арэндадаўца па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, сацыяльным развіцці, аказанні інфармацыйнай, кансультацыйнай і іншых відаў дапамогі, стварэнні неабходных умоў для эфектыўнага выкарыстання арандаванай маёмасці і падтрыманні яе ў належным стане. Пры невыкананні абавязкаў па дамове вінаваты бок нясе адказнасць, якая ўстаноўлена Заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дамовай.

**Дамова падраду** (прав. аспекты)
**Договор подряда**
**Contract**

Дамова, паводле якой адзін з бакоў (падрадчык) абавязваецца выканаць па заданні другога боку (заказчыка) пэўную працу і здаць яе вынік заказчыку ва ўстаноўлены тэрмін, а заказчык абавязваецца прыняць вынікі працы і аплаціць іх. Праца выконваецца на рызыку падрадчыка, калі іншае не прадугледжана дамовай.

**Дзелавая рэпутацыя** (аг. п.)
**Деловая репутация**
**Business reputation**

1. Пад дзелавой рэпутацыяй грамадзяніна, які не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, разумеюць набытую грамадзянінам грамадскую ацэнку яго дзелавых і прафесійных якасцяў пры выкананні ім працоўных, службовых і грамадскіх абавязкаў.
2. Пад дзелавой рэпутацыяй юрыдычнай асобы ці індывідуальнага прадпрымальніка разумеюць ацэнку яго гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, як удзельніка гаспадарчых (эканамічных) праваадносін іншымі ўдзельнікамі маёмаснага абароту і грамадзянамі, якія такімі не з'яўляюцца.

**Дзіцячае грамадскае аб'яднанне** (прав. аспекты)
**Детское общественное объединение**
**Children NGO**

Дзіцячым прызнаецца аб'яднанне грамадзян ва ўзросце да 18 гадоў (не меньш за дзве трэці ад агульнай колькасці сябраў), якое выражае іх спецыфічныя інтарэсы, і статутная дзейнасць якога накіравана на забеспячэнне сацыяльнага станаўлення і развіцця дзяцей.

**Дзіцячы сацыяльны прытулак** (прав. аспеты)
**Детский социальный приют**
**Children social orphanage**

Выхавацельна-адукацыйная ўстанова сістэмы адукацыі, створаная дзеля аказання сацыяльна-педагагічнай дапамогі непаўналетнім, што знаходзяцца ў экстрэмальнай сітуацыі.





**Дзяржава-сябра Еўрапейскага Саюза (ЕС)** (аг. п.)
**Государство-член Европейского Союза (ЕС)**
**Member State of the European Union (EU)**

Дзяржава, якая з'яўляецца сябрам Еўрапейскага Саюза (што мае ў сваім складзе каля 40 дзяржаў, сярод іх – Албанія, Андора, Аўстрыя, Харватыя, Кіпр, Чэшская Рэспубліка, Данія, Эстонія, Фінляндыя, Францыя, Германія, Грэцыя, Венгрыя, Ісландыя, Ірландыя, Італія, Латвія, Ліхтэнштэйн, Літва, Люксембург, Мальта, Малдова, Нідэрланды, Нарвегія, Польшча, Партугалія, Румынія, Расія, Сан-Марына, Славакія, Славенія, Іспанія, Швецыя, Швейцарыя, Югаславія і Македонія, Турцыя, Украіна, Аб'яднанае Каралеўства). Еўрапейскі саюз быў створаны з мэтай дасягнення большай еднасці дзяржаў-удзельніц шляхам дасягнення згоды праз супольную дзейнасць *(гл. таксама "Еўрапейскі Саюз").*

**Дзяржаўная ўласнасць** (прав. аспекты)
**Государственная собственность**
**State property**

Дзяржаўная ўласнасць выступае ў выглядзе рэспубліканскай уласнасці (уласнасць Рэспублікі Беларусь) і камунальнай уласнасці (уласнасць адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак).

**Дзяржаўны рэестр грамадскіх аб'яднанняў** (прав. аспекты)
**Государственный реестр общественных объединений**
**State register of NGOs**

Спіс зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў, які вядзецца адпаведным дзяржаўным органам. У Рэспубліцы Беларусь – гэта Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь і Упраўленне юстыцыі выканаўчых камітэтаў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў. Усе дадзеныя перадаюцца ў дзесяцідзённы тэрмін у Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

**Дзяржаўныя донары** (пошук фінанс.)
**Государственные доноры**
**State donors**

Дзяржаўныя ўстановы, якія атрымліваюць сродкі з бюджэту сваёй дзяржавы для далейшага прадастаўлення іх у выглядзе грантаў.

**Добраахвотнае таварыства** (прав. аспекты)
**Добровольное товарищество**
**Voluntary association**

Адзін з відаў грамадскіх арганізацый, якія ствараюцца для развіцця самадзейнасці і палітычнай актыўнасці народных мас. Заснавальнікамі добраахвотнага таварыства могуць быць грамадзяне, дзяржаўныя ўстановы, гаспадарчыя органы і грамадскія арганізацыі. Ліквідуюцца добраахвотныя таварыствы паводле рашэння самога таварыства, а ў выпадках невыканання задач, дзеля якіх яно было створана, парушэння ім заканадаўства ці ўхілення ад пералічаных у статуце мэтаў і задач – паводле пастановы дзяржаўнага органа альбо грамадскай арганізацыі.

**Домэн** (сучасн. тэхн.)
**Домен**
**Domain**

Частка адрасу Інтэрнет, што знаходзіцца пасля спецыяльнага сімвала "@", напрыклад, "news.com".

**Донар** (пошук фінанс.)
**Донор**
**Donor**

Сінонім – грантадаўца. Арганізацыя, фонд, якія аказваюць матэрыяльную, тэхнічную ці грашовую падтрымку якога-небудзь праекта (праграмы).

**Друкаваная рэклама** (грамад. сув.)
**Печатная реклама**
**Printed advertisement**

Адзін з каналаў распаўсюджвання рэкламнай інфармацыі праз розныя віды паліграфічнай прадукцыі. Найбольш распаўсюджаныя віды друкаванай рэкламы: брашура, буклет, гадавая справаздача, каталог, стыкер, паштоўка, плакат, праспект, улётка, каляндар, дырэкт-мэйл.

**Друкаваны сродак масавай інфармацыі** (аг. п.)
**Печатное средство массовой информации**
**Printed mass media**

Газета, часопіс, брашура, альманах, бюлетэнь, іншае выданне, якое мае нязменную назву, парадкавы нумар, скразную нумарацыю старонак і якое распаўсюджваецца не радзей аднаго раза на год.

**Дублікат пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі, аб рэгістрацыі сімволікі ці статута грамадскай арганізацыі** (прав. аспекты)
**Дубликат свидетельства о государственной регистрации, о регистрации символики или устава общественной организации**
**Duplicate of a state registration certificate, symbols' registration certificate or the charter of NGO**

У выпадку страты альбо пашкоджання арыгіналаў пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання, пасведчання аб рэгістрацыі сімволікі альбо статута грамадскага аб'яднання рэгіструючаму органу падаюцца дакументы на атрыманне дубліката пасведчання аб рэгістрацыі. Заява аб выдачы дублікатаў разглядаецца рэгіструючым органам на працягу месяца.

**Дыпламатыя** (аг. п.)
**Дипломатия**
**Diplomacy**

Такт, майстэрства дамовіцца аб справах, нікога не пакрыўдзіўшы і не выклікаўшы варожых пачуццяў.

**Дырэкт-мэйл** (грамад. сув.)
**Директ-мэйл**
**Direct mail**

Непасрэдная паштовая рэклама, зварот (персанальны), скіраваны да канкрэтнага прадстаўніка мэтавай аўдыторыі; мае высокую эфектыўнасць, дзякуючы асабістай форме кантакту і адсутнасці выпадковай аўдыторыі; часта ўжываецца ў палітычных кампаніях.

**Дырэктыўны стыль лідэра** (арг. разв.)
**Директивный стиль лидера**
**Directive style of leadership**

Лідэр тыпу "рабі (выконвай) так, як я табе кажу". Забяспечвае пільны кантроль, у якасці стымулу выкарыстоўвае ўзнагароды, пагрозы і пакаранні.




***у спрэчцы нараджаецца ісціна***

**Дыскусія** (аг. п.)
**Дискуссия**
**Discussion**
Абмеркаванне якога-небудзь пытання на сходзе, у друку, у размове.

**Дысцыплінарная адказнасць** (прав. аспекты)
**Дисциплинарная ответственность**
**Disciplinary liability**
Адна з прававых форм уздзеяння на парушальнікаў працоўнай дысцыпліны. Рэалізуецца шляхам накладання на парушальніка дысцыплінарнага спагнання адміністрацыяй прадпрыемства, установы, арганізацыі, дзе той працуе, або вышэйстаячым у парадку падпарадкавання органам.

**Дэкларацыя** (аг. п.)
**Декларация**
**Declaration**
Афіцыйная заява, урачыстае абвяшчэнне ад імя дзяржавы, урада, партыі, арганізацыі асноўных прынцыпаў, а таксама дакумент, у якім яны выкладзены.





**Дэмакратычны стыль кіравання** (арг. разв.)
**Демократический стиль управления**
**Democratic style of leadership**
Кіраўнік тыпу "адзін чалавек – адзін голас". Заахвочвае людзей да прыняцця рашэнняў, прызнае і ўзнагароджвае поспехі каманды.

**Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Департамент по гуманитарной деятельности управления делами Президента Республики Беларусь**
**Department of humanitarian activities by the administration of the President of the Republic of Belarus**
Дадзены орган з'яўляецца структурным падраздзяленнем Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з правамі юрыдычнай асобы, які рэалізуе правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў галіне гуманітарнай дзейнасці юрыдычных і фізічных асоб Рэспублікі Беларусь, кіраванне дзейнасцю па арганізацыі ўліку, захоўвання, ацэнкі і рэалізацыі маёмасці, адабранай, арыштаванай, а таксама канфіскаванай ці звернутай у прыбытак дзяржавы іншым чынам.
Дэпартамент, да шматлікіх функцый якога належаць выдача ліцэнзій на атрыманне і распаўсюджванне гуманітарнай дапамогі, рэгістрацыя грантаў а таксама выдача ліцэнзіі арганізацыям, якія аздараўляюць дзяцей за мяжой

Е

**Еўрапейская эканамічная камісія ААН** (канкр. арг.)
**Европейская экономическая комиссия ООН**
**UN European economic commission**
Еўрапейская эканамічная камісія Арганізацыі Аб'яднаных Нацый створаная ў 1947 годзе, пацвярджае метадамі сваёй працы ідэалы Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Яна кіруецца тым, што мір паміж народамі дасягаецца праз разуменне, і перш за ўсё праз супрацоўніцтва. Зараз дзейнасць Камісіі ахоплівае 55 дзяржаў. Дзейнічае яна разам з нацыянальнымі інстытутамі і дзяржаўнымі ўстановамі, закладваючы статыстычную аснову, неабходную для прыняцця рашэнняў у сферы эканомікі. Камісія таксама збірае статыстычную інфармацыю, дзейнічае разам з нацыянальнымі статыстычнымі кіруючымі ўстановамі, Еўрастатам, і Арганізацыяй эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця.

**Еўрапейскі фонд па правах чалавека** (канкр. арг.)
**Европейский фонд по правам человека**
**European human rights foundation**

Еўрапейскі фонд па правах чалавека заснаваны ў 1980 годзе і знаходзіцца ў Брусэлі. Фонд падтрымлівае гуманістычныя ініцыятывы і абараняе грамадзянскія, палітычныя, сацыяльныя і культурныя правы. Фонд выдае субсідыі не больш за 10 000 экю (12 405 даляраў). У адрозненне ад большасці іншых грантаў на праваабарончую дзейнасць дапамогу гэтага фонду могуць атрымаць як асобныя людзі, так і грамадскія групы. Гэтыя гранты можна выкарыстоўваць і для пакрыцця выдаткаў на навуковыя даследаванні. Фонд аддае перавагу невялікім праектам з наватарскім падыходам да вырашэння праблемы.

## Ж

**Журналіст** (грамад. сув.)
**Журналист**
**Journalist**

Асоба, якая прафесійна займаецца зборам, рэдагаваннем, стварэннем альбо падрыхтоўкай паведамленняў і матэрыялаў для рэдакцый сродкаў масавай інфармацыі, і якая звязана з імі працоўнымі ці іншымі адносінамі па дамове альбо займаецца такой дзейнасцю па іх даручэнні.

**Жыццяпіс навуковага супрацоўніка** (пошук фінанс.)
**Жизнеописание научного сотрудника**
**Curriculum vitae (CV)**

У адрозненне ад рэзюме, можа быць больш разгорнутым. Ён асабліва зручны, калі Вы – навуковец з вялікім досведам працы і вялікай колькасцю публікацый. У гэтым выпадку Вам можа спатрэбіцца дадатковае месца для апісання Вашых даследаванняў і для спісу публікацый, якія з'яўляюцца дадаткам да CV. У большасці іншых выпадкаў дастаткова кароткага рэзюме.

## З

**Загад** (прав. аспекты)
**Приказ**
**Order**

1. Нарматыўны прававы акт функцыянальна-галіновага характару, які выдаецца кіраўніком рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў межах кампетэнцыі ўзначаленага ім органа ў адпаведнай сферы дзяржаўнага кіравання.





2. Прававы акт, што выдаецца кіраўніком арганізацыі, які дзейнічае на падставе адзінаначалля пры вырашэнні асноўных задач, якія стаяць перад гэтай арганізацыяй.

**Задачы праекта** (пошук фінанс.)
**Задачи проекта**
**Project goals**

Канкрэтныя і вымяральныя змены сітуацыі, якую вы апісваеце ў раздзеле "Пастаноўка праблемы". Гэтыя змены павінны адбыцца ў выніку выканання вашага праекта.

**Заканадаўства** (прав. аспекты)
**Законодательство**
**Legislation**

Сістэма нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць грамадскія адносіны.

**Заканадаўства аб грамадскіх аб'яднаннях** (прав. аспекты)
**Законодательство об общественных объединениях**
**NGO legislation**

Заканадаўства аб грамадскіх аб'яднаннях складаецца з Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дзеючага Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях" і іншых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь.

**Закон** (прав. аспекты)
**Закон**
**Law**

Нарматыўна-прававы акт, прыняты вышэйшым прадстаўнічым органам дзяржаўнай улады альбо шляхам усенароднага галасавання (рэферэндуму). Закон рэгулюе найбольш важныя грамадскія адносіны, валодае вышэйшай юрыдычнай сілай у адносінах да нарматыўных актаў усіх іншых органаў дзяржавы.

**Закранутыя асобы** (чалавеч. рэс.)
**Затронутые лица**
**Persons concerned**

Прыватныя асобы ці групы асоб, якія зацікаўлены ў канкрэтным праекце ці праграме, якія могуць паўплываць на развіццё праекта альбо выпрабаваць на сабе яго дзеянне.

**Замежны (міжнародны) назіральнік** (грамад. сув.)
**Иностранный (международный) наблюдатель**
**International observer**

Асоба, якая з'яўляецца прадстаўніком замежнай дзяржавы альбо міжнароднай арганізацыі, і якая набывае права на ажыццяўленне назірання за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, рэферэндумаў, адклікання дэпутатаў, членаў Савета Рэспублікі ў адпаведнасці з парадкам, устаноўленым існуючым Выбарчым Кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Запрашэнне да ўдзелу ў конкурсе** (пошук фінанс.)
**Приглашение участвовать в конкурсе**
**Request for proposal**

Запрашэнне ўяўляе сабой спіс патрабаванняў да парадку афармлення дакументаў на ўдзел у конкурсе. У большасці выпадкаў, калі размова ідзе пра ўдзел у конкурсе, маюцца на ўвазе грамадскія арганізацыі, якія прымаюць ўдзел у конкурсе на атрыманне гранта ад якога-небудзь фонду. Калі ўрад ці фонд абвяшчае новую праграму грантаў, ён дасылае запрашэнні да ўдзелу ў конкурсе патэнцыяльным арганізацыям-удзельніцам.

**Заработнная плата** (аг.п.)
**Заработная плата**
**Salary**

Сукупнасць узнагарод, якія вылічваюцца ў грашовых адзінках ці (і) натуральнай форме, і якія наймальнік павінен выплаціць работніку за фактычна зробленую працу, а таксама перыяды, ўключаныя ў працоўны час.

**Заўвагі ў заяўцы** (пошук фінанс.)
**Примечание в заявке**
**Notes**

Раздзел заяўкі – найбольш зручнае месца для таго, каб паведаміць пра сваю арганізацыю звесткі, якія могуць вылучаць вас сярод іншых арганізацый. Калі вы змесціце іх ў раздзеле "Уводзіны", яна, магчыма, згубіцца сярод вялікай колькасці інфармацыі, у гэтым жа раздзеле, наадварот, Вы будзеце мець магчымасць падаць іх самым лепшым чынам.





**Захоўванне спраў** (прав. аспекты)
**Хранение дел**
**Business files deposit**

Грамадскае аб'яднанне нясе адказнасць за захаванасць спраў, таму што гэтыя справы грамадскіх аб'яднанняў уваходзяць у лік нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь. Архіўныя дакументы грамадскіх аб'яднанняў могуць захоўвацца як у самім аб'яднанні, так і перадавацца на дзяржаўнае захоўванне. Доступ да архіўных дакументаў павінен быць абмежаваны. За захоўванне дакументаў адказвае непасрэдна кіраўнік грамадскага аб'яднання альбо адказная асоба.

**Заяўка** (пошук фінас.)
**Заявка**
**Proposal**

Складзенае па вызначанай форме апісанне праекта для атрымання фінансавання (гранта), часцей за ўсё на конкурснай аснове. Складаецца з наступных частак: суправаджальны ліст, тытульны ліст, змест, рэзюме (кароткі змест), уводзіны, апісанне праблемы, мэты і задачы, метадалогія і каляндарны план, вынікі і ацэнка, бюджэт і тлумачэнне бюджэту, далейшае фінансаванне, дадаткі.

**Зваротная сувязь** (аг. п.)
**Обратная связь**
**Feedback**

Асноўны прынцып, у адпаведнасці з якім эфектыўнасць выкання працоўнага задання залежыць ад той ці іншай зваротнай сувязі. Па-першае, зваротная сувязь на працоўным месцы павінна ахопліваць па магчымасці вялікія аспекты. Па-другое, рэжым зваротнай сувязі павінен уключаць прадсказальныя часовыя інтэрвалы паміж сеансамі сувязі, якія павінны быць кароткімі па часе. Аб'ём інфармацыі павінен быць такім, каб работнік мог яго ўспрыняць і дзейнічаць адпаведным чынам.

**Звязаная з праграмай інвестыцыя** (пошук фінанс.)
**Связанная с программой инвестиция**
**Programme-related investment**

Пазыка альбо іншая інвестыцыя (у адрозненне ад гранта), якая ўнесена фондам у якую-небудзь арганізацыю на правядзенне

праекта, блізкага да філантрапічных мэтаў і інтарэсаў дадзенага фонду.

**Імідж** (грамад. сув.)
**Имидж**
**Image**

Гэта вобраз арганізацыі ва ўяўленні грамадскасці. Можа быць некалькі розным для розных груп грамадскасці, у выніку таго, што прадказальныя паводзіны гэтых груп у адносінах да арганізацыі могуць быць рознымі. Для шырокай грамадскасці гэта можа быць грамадзянская пазіцыя арганізацыі. Для валанцёраў – гуманная місія. Для чыноўнікаў – энергія і дапамога арганізацыі ў вырашэнні сацыяльных праблем.

**Інавацыя** (аг. п.)
**Инновация**
**Innovation**

1. Што-небудзь новае, якое толькі што ўвайшло ва ўжытак, новаўвядзенне.
2. Новаўвядзенні ў галіне тэхнікі, тэхналогіі, арганізацыі працы і кіравання, заснаваныя на выкарыстанні дасягненняў навукі і перадавога досведу, а таксама выкарыстанне гэтых новаўвядзенняў у розных галінах і сферах дзейнасці.

**Інвентарызацыя** (аг. п.)
**Инвентаризация**
**Stock-taking**

Перыядычная праверка адпаведнасці фактычнай наяўнасці гаспадарчых сродкаў (матэрыяльных і іншых каштоўнасцяў) дадзеным бухгалтарскага ўліку; адзін са сродкаў кантролю за захаванем уласнасці. Праводзіцца ва ўстаноўленыя тэрміны (планавая інвентарызацы), раптоўна (рэвізія), пры змене матэрыяльна-адказных асоб, пасля стыхійных бедстваў, па патрабаванні следчых органаў, у іншых выпадках.

**Інвестыцыйная дзейнасць** (прав. аспекты)
**Инвестиционная деятельность**
**Investment**

Пад інвестыцыйнай дзейнасцю разумеюць дзейнасць юрыдычнай асобы ці (і) фізічнай асобы ці (і) дзяржавы (адміністратыўна-тэрытарыяльнай адзінкі дзяржавы) па ўкладанні інвестыцый у выраб прадукцыі (работ, паслуг) альбо іх іншым выкарыстанні дзеля атрымання прыбытку (даходу) і (ці) дзеля дасягнення іншага значнага выніку.

**Інвестыцыйны грант** (пошук фінанс.)
**Инвестиционный грант**
**Endowment grant**

Капіталаўкладанне, мэтай якога з'яўляецца забеспячэне даходу арганізацыі на працягу доўгага часу.

**Інвестыцыя** (прав. аспекты)
**Инвестиция**
**Investment**

Матэрыяльны ўнёсак і іншая маёмасная і інтэлектуальная каштоўнасць, якая ўкладаецца ў аб'екты прадпрымальніцкай і іншых відаў дзейнасці, у выніку якой утвараецца прыбытак альбо дасягаецца сацыяльны эфект.

**Індывідуальны (персаніфіцыраваны) улік** (прав. аспекты)
**Индивидуальный (персонифицированный) учёт**
**Personification**

Арганізацыя і вядзенне ўліку звестак аб кожнай асобе для мэтаў і патрэб арганізацыі.

**Ініцыятыва** (аг. п.)
**Инициатива**
**Initiative**

Самастойны пачын, першы крок у якой-небудзь справе, абумоўлены ўнутраным пабуджэннем да дзеяння. Вядучая роля ў якіх-небудзь дзеяннях. Здольнасць да самастойных актыўных дзеянняў, прадпрымальнасць.

**Ініцыятыўная група** (чалавеч. рэс.)
**Инициативная группа**
**Social initiative**

Сінонім - сацыяльная ініцыятыва. Незарэгістраванае грамадскае аб'яднанне грамадзян Рэспублікі Беларусь.

# ІНТЭРНЕТ



## сіла, што трансфармуе свядомасць

**Інструкцыя** (аг. п.)
**Инструкция**
**Instruction**
Кіруючыя ўказанні, збор правілаў, які вызначае парадак і спосаб ажыццяўлення чаго-небудзь.

**Інтэлектуальная ўласнасць** (аг. п.)
**Интеллектуальная собственность**
**Intellectual property**
*Гл. "Выключнае права на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці"*

**Інтэрв'ю** (аг. п.)
**Интервью**
**Interview**
1. Прызначаная для друку, радыё альбо тэлебачання гутарка журналіста з якой-небудзь асобай.
2. У сацыялагічных даследаваннях – гутарка даследчыка паводле загадзя намечанага плана з асобай альбо групай асоб, адказы якіх на пытанні даследчыка служаць зыходным эмпірычным матэрыялам для абагульненняў.





**Інтэрнет** (сучасн. тэхн.)
**Интернет**
**Internet**
Інтэрнет – сусветная камп'ютэрная сетка, свет інфармацыі, які адчыняе непасрэдны доступ да бясконцай колькасці інфармацыйных рэсурсаў усіх краін свету.

**Інфармацыйнае агенцтва** (грамад. сув.)
**Информационное агентство**
**Information agency**
Юрыдычная асоба альбо індывідуальны прадпрымальнік, які рэгулярна займаецца зборам, захаваннем і распаўсюджваннем інфармацыйных матэрыялаў, які мае статус рэдакцыі, выканаўцы і распаўсюджвальніка.

**Інфармацыйная прадукцыя** (прав. аспекты)
**Информационная продукция**
**Information product**
Матэрыялізаваны вынік інфармацыйных працэсаў, прызначаны для забеспячэння інфармацыйных патрэб органаў дзяржаўнай улады, юрыдычных і фізічных асоб.

**Інфармацыйны пакет для прэсы** (грамад. сув.)
**Информационный пакет для прессы**
**Press information packet**
Гэты пакет павінен уключаць: 1.Заявы выступоўцаў з іх імёнамі і кантактнымі тэлефонамі, надрукаваныя на бланках Вашай арганізацыі. 2.Прэс-рэліз. 3.Пералік пастаўленых пытанняў. 4.Дадатковыя магчымыя кантакты па пытаннях, якія датычацца справы. 5.Меркаванні экспертаў. 6.Інфармацыя пра арганізацыю-спонсара, прэс-канферэнцыю. Вы можаце ўключыць і іншыя матэрыялы, такія як графікі, апошнюю інфармацыю па заканадаўчых ініцыятывах, пункты гледжання ці аналітычныя артыкулы, якія падтрымліваюць Вашу пазіцыю і г. д.

**Інфармацыйны рэсурс** (аг.п.)
**Информационный ресурс**
**Information resource**
Арганізаваная сукупнасць дакументаванай інфармацыі, якая ўключае ў сябе базы дадзеных і іншыя масівы інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах.

**Інфармацыйны цэнтр** (прав. аспекты)
**Информационный центр**
**Information centre**

Спецыялізаваная арганізацыя, якая ажыццяўляе навукова-інфармацыйную дзейнасць у нейкай галіне ці рэгіёне. *(гл. таксама – "інфармацыйнае агенцтва")*

**Інфармацыя** (аг. п.)
**Информация**
**Information**

1. Звесткі аб асобах, прадметах, фактах, з'явах, падзеях і працэсах.
2. Звесткі, якія перадаюцца людзьмі вусна, пісьмова, альбо іншым спосабам, а таксама сам працэс перадачы ці атрымання такіх звестак.

## K

**Кааліцыі** (прав. аспекты)
**Коалиции**
**Coalitions**

Кааліцыі – фармальныя / нефармальныя саюзы арганізацый, якія маюць агульныя мэты. Некаторыя кааліцыі ўтвараюцца спецыяльна дзеля дасягнення якой-небудзь канкрэтнай мэты. Нефармальныя кааліцыі звычайна ўтвараюцца дзеля прыняцця аднаго закону альбо правядзення спецыфічнай палітыкі. Кааліцыя з'яўляецца вельмі добрым сродкам лабіявання ў той час як яе сябры могуць пакінуць у баку адрозненні сваіх арганізацый і сканцэнтравацца на дасягненні адзінай мэты.

**Каардынацыя донараў** (пошук фінанс.)
**Координация доноров**
**Donors' coordination**

Спробы вядучых агенцваў, груп донараў альбо кіраўніцтва наладзіць абмен інфармацыяй і больш эфектыўна інтэграваць сваю працу.

**Калектыўны знак** (арг. разв.)
**Коллективный знак**
**Collective trade mark**

1. Гандлёвы знак саюза, асацыяцыі, канцэрна ці іншага гаспадарчага аб'яднання, прызначаны для маркіроўкі выпускаемых альбо рэалізуемых ім тавараў, якія маюць адзіныя якасці ці нейкія іншыя агульныя характарыстыкі.





2. Гандлёвы знак аб'яднання юрыдычных асоб, прызначаны для маркіроўкі выпускаемых альбо рэалізуемых ім тавараў, якія маюць адзіныя якасці ці нейкія іншыя агульныя характарыстыкі.

**Каляндарны план** (стратэг. план.)
**Календарный план**
**Time-table**

Пералік мерапрыемстваў з указаннем часу іх правядзення, які складаецца арганізацыяй з мэтай планавання сваёй дзейнасці.

**Каманда** (чалавеч. рэс.)
**Команда**
**Team**

Невялікая група людзей, найчасцей, меньш за дваццаць чалавек, што валодаюць здольнасцямі, якія дапаўняюць адна адну, маюць агульную мэту, а таксама шэраг пастаўленых спецыфічных задач, за рашэнне якіх яны нясуць узаемную адказнасць.




***быць камандай дзейнічаць у звязцы***

**Камандзіроўка** (аг. п.)
**Командировка**
**Business trip**
1. Службовае даручэнне, звязанае з выездам куды-небудзь.
2. Паездка для выканання такога даручэння.

**Камерцыйныя арганізацыі** (прав. аспекты)
**Коммерческие организации**
**Profit-making organisations**
Юрыдычныя асобы, якія імкнуцца да атрымання прыбытку ў якасці асноўнай мэты сваёй дзейнасці і (ці) размяркоўваюць прыбыткі сярод удзельнікаў. Юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца камерцыйнымі арганізацыямі, і могуць узнікаць у форме гаспадарчых таварыстваў.

**Камітэт размеркавання** (пошук фінанс.)
**Комитет распределения**
**Distribution committee**
Камітэт, адказны за прыняцце рашэнняў па прадастаўленні фінансавай дапамогі. Для мясцовых фондаў камітэт размеркавання з'яўляецца прадстаўніком грамадскасці, які абслугоўваецца фондамі.

**Кампанія па збору значнай сумы сродкаў (агульнага капіталу)** (пошук фінанс.)
**Компания по сбору крупной суммы средств (общего капитала)**
**Capital campaign**
Кампанія, працягласцю ў некалькі гадоў, па збору значнай сумы сродкаў на доўгатэрміновыя мэты, такія як, кампаніі па збору ахвяраванняў ці сродкаў на будаўніцтва.

**Кампанія па прасоўванні грамадскіх інтарэсаў** (грамад. сув.)
**Компания по продвижению общественных интересов**
**Company on social interests' advancement**
Серыя ўзаемазвязаных мерапрыемстваў на працягу вызначанага перыяду часу для дасягнення канкрэтных вынікаў у вырашэнні грамадска значнай праблемы.





**Кампанія экалагічная** (аг. п.)
**Компания экологическая**
**Ecological campaign**
Сістэма калектыўных, арганізаваных па часе і прасторы дзеянняў, якія маюць на мэце вырашэнне канкрэтнай экалагічнай праблемы.

**Камп'ютэр** (сучасн. тэхн.)
**Компьютер**
**Computer**
Электронна-вылічальная машына, якая можа выконваць, як мінімум, тры наступныя функцыі: прымаць інфармацыю, якая ўводзіцца, у структураваным выглядзе, перапрацоўваць яе па раней дадзеных правілах і выдаваць вынікі. Камп'ютэры могуць мець розныя габарыты, формы, магчымасці і галіны ўжывання.

**Канвенцыя міжнародная** (аг. п.)
**Конвенция международная**
**International convention**
Адзін з відаў міжнароднай дамовы. Найчасцей канвенцыя з'яўляецца шматбаковай міжнароднай дамовай па пытаннях эканамічнага, юрыдычнага, тэнічнага, гуманітарнага характару, а таксама дамовай аб законах і звычаях вайны.

**Кансультатыўны камітэт** (чалавеч. рэс.)
**Консультативный комитет**
**Consultative committee**
Група асоб, якая кансультуе "савет дырэктароў" некамерцыйнай арганізацыі, адзін са спосабаў прыцягнення да працы шырока вядомых спецыялістаў, якія пры гэтым не прама ўдзейнічаюць на кіраванне арганізацыяй.

**Кансультацыйныя паслугі** (пошук фінанс.)
**Консультационные услуги**
**Consulting services**
Прафесійная кансультацыйная падтрымка фондам праекта, які закранае агульныя інтарэсы фонду і некамерцыйнай арганізацыі (неграшовая падтрымка).

**Кансультацыя** (аг. п.)
**Консультация**
**Consultation**
Парада, якая даецца спецыялістам.

**Кантракт** (прав. аспекты)
**Контракт**
**Contract**
Разнавіднасць працоўнай дамовы, якая заключаецца ў пісьмовай форме на пэўны тэрмін і адрозніваецца ад агульных норм заканадаўства аб працы. Кантракт можа заключацца для выканання працы, якая па сваім змесце носіць пастаянны характар.

**Кантроль грамадскі** (аг. п.)
**Контроль общественный**
**Civil control**
Адна з важных форм сістэмы кантролю, якая прыцягвае шырокія колы насельніцтва да кіравання грамадствам і дзяржавай. Яго ажыццяўляюць у асноўным прафесійныя саюзы і розныя добраахвотныя таварыствы, якія праводзяць гэту працу праз розныя грамадскія камісіі, рабочыя сходы і г. д. Важная сфера кантрольнай дзейнасці грамадскіх арганізацый – захаванне правоў і законных інтарэсаў працоўных.

**Кантроль за адпаведнасцю дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў заканадаўству і статуту** (прав. аспекты)
**Контроль за соответствием деятельности общественных объединений законодательству и уставу**
**Control of NGO activity accordance to the legislation and the charter**
Нагляд за адпаведнасцю дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і законам Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюць Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь і падначаленыя яму пракуроры. Кантроль за адпаведнасцю дзейнасці грамадскіх аб'днаняў заканадаўству і статуту ажыццяўляюць органы, якія зарэгістравалі дадзеныя аб'яднанні. Кантроль за фінансавай дзейнасцю ажыццяўляюць дзяржаўныя падатковыя органы. Іншае ўмяшальніцтва ў дзейнасць грамадскіх арганізацый забаронена.





**Кантрольна-рэвізійны орган** (прав. аспекты)
**Контрольно-ревизионный орган**
**Control body**
Орган (камісія), які вядзе рэвізію фінансавай і гаспадарчай дзейнасці арганізацыі і выбіраецца агульным сходам на тэрмін не меньш за 3 гады. Колькасць членаў кантрольна-рэвізійнай камісіі можа быць рознай. Членамі камісіі не могуць быць сябры савета арганізацыі. Кантрольна-рэвізійная камісія падрыхтоўвае заключэнне да гадавой справаздачы і балансу. Усе службовыя асобы арганізацыі абавязаны па запыце кантрольна-рэвізійнай камісіі прадаставіць неабходную інфармацыю і дакументы.

**Канферэнцыя** (аг. п.)
**Конференция**
**Conference**
Вялікі сход, нарада прадстаўнікоў якіх-небудзь дзяржаў, грамадскіх, навуковых ці іншых арганізацый, груп, які збіраецца дзеля абмеркавання і вырашэння пэўных пытанняў *(гл. таксама - “відэаканферэнцыя”).*

**Канфіскацыя маёмасці** (прав. аспекты)
**Конфискация имущества**
**Confiscation of property**
1. Адбіранне маёмасці ва ўласніка ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, як санкцыя за ўчыненае злачынства альбо іншае правапарушэнне. Пры гэтым канфіскацыя маёмасці ў адміністратыўным парадку дапускаецца толькі з улікам умоў і парадку, якія прадугледжаны законам. Рашэнне аб канфіскацыі, прынятае ў адміністратыўным парадку, можа быць абскарджана ў судзе.
2. Прымусовае бязвыплатнае адсуджэнне ва ўласнасць дзяржавы ўсёй альбо часткі маёмасці, якая з'яўляецца асабістай уласнасцю асуджанага.

КАНФЛІКТ



***Не злуйся – будзь прыгожым***

**Канфлікт** (аг. п.)
**Конфликт**
**Conflict**

Сутыкненне супрацьлегла накіраваных мэтаў, інтарэсаў, думак розных людзей.

**Канцэртна-гастрольная дзейнасць** (аг. п.)
**Концертно-гастрольная деятельность**
**Concert-touring activity**

Канцэртна-гастрольнай дзейнасцю з'яўляецца арганізацыя і правядзенне сольных і гала-канцэртаў выканаўцаў і мастацкіх калектываў, драматычных, оперных і балетных спектакляў, аўтарскіх вечароў, цыркавых праграм, канцэртаў-прэзентацый, іншых тэатральна-відовішчных мерапрыемстваў, незалежна ад колькасці гледачоў. На ажыццяўленне гэтага віду дзейнасці неабходна ліцэнзія на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь,

**Капітальны грант** (пошук фінанс.)
**Капитальный грант**
**Major grant**

Грант для капітальных мэтаў, такіх, як капітальны рамонт ці набыццё памяшканняў, будынкаў.





**Каталог** (аг. п.)
**Каталог**
**Catalogue**

1. Сістэматызаваны пералік прадметаў (кніг, экспанатаў, тавараў і інш.) падабраных па пэўнай прыкмеце і размешчаных у канкрэтна-вызначаным парадку, што палягчае іх пошук.
2. Шматстаронкавае збрашураванае выданне невялікім тыражом, прысвечанае цэламу шэрагу прадуктаў ці прапаноў арганізацыі, альбо поўнаму зместу выставы ці экспазіцыі. Каталог звычайна арыентаваны на прафесійную аўдыторыю, таму ў ім можа быць шмат табліц, лічбаў і звестак тэхнічнага характару.

**Каштоўнасці арганізацыі** (арг. разв.)
**Ценности организации**
**Values of an organisation**

Гэта базавыя прынцыпы, якімі кіруецца арганізацыя ў сваёй дзейнасці. З іх можна вылучыць наступныя: эканамічная – пытанні, звязаныя з размеркаваннем асноўнага прыбытку і памерам даходу, тэхналагічная – пытанні вытворчасці і ўзроўню якасці і колькасці, грамадская – арганізацыя вачыма сваіх сябраў, сацыяльна-палітычная – увесь комплекс адносін з кліентурай арганізацыі, трансцэдэнтальная – арганізацыя вачыма сваіх супрацоўнікаў.

**Кваліфікацыя** (аг п.)
**Квалификация**
**Qualification**

Узровень агульнай і спецыяльнай падрыхтоўкі работніка, засведчаны ўстаноўленымі заканадаўствам відамі дакументаў (атэстат, дыплом, пасведчанне і інш.).

**Кворум** (прав. аспекты)
**Кворум**
**Quorum**

Устаноўленая законам ці статутам колькасць прысутных на вызначаным мерапрыемстве, якая лічыцца абавязковай умовай для прызнання яго рашэнняў сапраўднымі і юрыдычна значнымі.

**Кейс гісторыя** (грамад. сув.)
**Кейс история**
**Case history**

Выпадак-гісторыя, выкарыстоўваецца ў СМІ для аповеду пра добрае выкарыстанне спажыўцом прадукту ці паслугі арганізацыі, альбо пра вырашэнне праблемнай сітуацыі.

**Кіраўнік арганізацыі** (чалавеч. рэс.)
**Руководитель организации**
**Head of an organisation**

Фізічная асоба, якая ў выніку паўнамоцтваў, нададзеных ёй законам альбо ўстаноўчымі дакументамі арганізацыі здзяйсняе кіраўніцтва арганізацыяй, у тым ліку выконвае функцыі яе аднаасобнага выканаўчага органа.

**Кіраўніцтва** (арг. разв.)
**Руководство**
**Leadership**

1. Працэс кіравання чыёй-небудзь дзейнасцю.
2. Працэс, які ўключае ў сябе лідэрства, а таксама функцыі планавання, арганізацыі дзейнасці, падбору людзей для працы ў арганізацыі і кантролю за яе дзейнасцю.

**Кіруючыя органы – Агульны сход** (аг. п.)
**Руководящие органы – Общее собрание**
**Supervisory body – The general assembly**

Вышэйшым кіруючым органам арганізацыі з'яўляецца агульны сход усіх сябраў, які склікаецца не радзей аднаго разу на год. Да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу адносяць: вырашэнне пытанняў аб стварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі арганізацыі, зацвярджэнне статута, унясенне змяненняў і дапаўненняў у статут, выбар прыярытэтных накірункаў дзейнасці, вызначэнне колькаснага складу, выбар і адкліканне сябраў савета арганізацыі, устанаўленне іх службовых акладаў, выбранне кантрольна-рэвізійнай камісіі, спыненне яе дзейнасці, зацвярджэнне гадавой спаваздачы савета арганізацыі і заключэння кантрольна-рэвізійнай камісіі.





**Клуб** (аг. п.)
**Клуб**
**Club**

1. Грамадская арганізацыя, якая аб'ядноўвае грамадзян на падставе агульнасці, аднолькавасці, інтарэсаў заняткаў.
2. Культурна-асветніцкая ўстанова, у якой збіраюцца людзі для адпачынку; будынкі, памяшканні такой установы.
3. Установа альбо арганізацыя (часцей за ўсё міжнародная), якая займаецца фінансавай альбо камерцыйнай дзейнасцю.

**Круглы стол** (аг. п.)
**Круглый стол**
**Round table discussion**

Сход, нарада, удзельнікі якой абмяркоўваюць спецыяльныя пытанні ў форме непасрэднай размовы, абмену думкамі.

**Крымінальная адказнасць** (прав. аспекты)
**Уголовная ответственность**
**Criminal liability**

Абавязак вінаватай асобы ва ўстаноўленым законам парадку разлічыцца за ўчыненае злачынства: зазнаць пэўныя праваабмежаванні, якія вынікаюць з закону, быць асуджаным і пакараным.

**Культурная творчая дзейнасць** (прав. аспекты)
**Культурная творческая деятельность**
**Cultural creative activity**

Інтэлектуальная творчасць, якая завяршаецца з'яўленнем новага, не існаваўшага раней самастойнага выніку ў галіне культуры, літаратуры, мастацтва і іншай культурнай дзейнасці.

**Курсы** (аг. п.)
**Курсы**
**Courses**

1. Закончаны цыкл, увесь аб'ём спецыяльнага навучання, якіх-небудзь працэдур.
2. Поўнае выкладанне якой-небудзь навукі, альбо яе часткі.

**Лабіяванне** (прав. аспекты)
**Лоббирование**
**Lobbying**

Прасоўванне і адстойванне грамадскіх інтарэсаў у заканадаўчым працэсе (ініцыяванне законапраектаў, праца з дэпутатамі і фракцыямі, экспертыза законапраектаў і г.д.).

**Лагатып** (грамад. сув.)
**Логотип**
**Logotype**

Важны элемент фірменнага стылю, арыгінальны варыянт напісання назвы рэкламадаўцы. Часта блытаюць з сімволікай, але асноўнае ў лагатыпе – менавіта назва, шрыфтавая кампазіцыя. Лагатып звычайна рэгіструецца, як і гандлёвая марка, і абараняецца законам ад злоўжывальнікаў.

**Ліга** (аг. п.)
**Лига**
**League**

Саюз, згуртаванне, аб'яднанне асоб, арганізацый, дзяржаў.

**Лідэрства** (арг. разв.)
**Лидерство**
**Leadership**

Працэс, праз які вызначаныя асобы могуць матываваць і весці за сабой іншых людзей да пастаўленых мэтаў і задач.

**Ліквідацыя грамадскага аб'яднання** (прав. аспекты)
**Ликвидация общественного объединения**
**Liquidation of NGO**

Спыненне дзейнасці грамадскага аб'яднання. Ліквідацыя адбываецца па рашэнні суда ў выпадках: здзяйснення аб'яднаннем дзеянняў, якія ўказаны ў артыкуле 3 дзеючага Закону "Аб грамадскіх аб'яднаннях," паўторнага на працягу года здзяйснення дзеянняў, за якія было вынесена пісьмовае папярэджанне, калі пры рэгістрацыі грамадскага аб'яднання з боку яго заснавальнікаў былі дапушчаны парушэнні дзеючага Закону.








***гвалт! з торбай пускаюць!***

**Ліквідацыя юрыдычнай асобы** (прав. аспекты)
**Ликвидация юридического лица**
**Liquidation of a juridical person**

Спыненне дзейнасці юрыдычнай асобы альбо органа без пераходу правоў і абавязкаў у парадку правапераемства да іншых асоб, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

**Ліст-запыт** (пошук фінанс.)
**Письмо-запрос**
**Letter of inquiry**

Папярэдні запыт, кароткая заяўка ў выглядзе ліста з базавай інфармацыяй аб арганізацыі і яе праекце.

**Ліст падтрымкі** (пошук фінанс.)
**Письмо поддержки**
**Letter of support and endorsement**

Ліст ад дзяржаўных устаноў, арганізацый і прыватных асоб, якія ўхваляюць Ваш праект. Звычайна такія лісты павінны быць адрасаваны кіраўніку Вашай арганізацыі (дырэктару, старшыні і інш.). Гэты ліст павінен быць адасланы разам з заяўкай, каб не згубіцца па дарозе. Карысна прадаставіць аўтарам ліста падрабязную інфармацыю, якая дапаможа ў яго складанні.

**Ліцэнзія** (прав. аспекты)
**Лицензия**
**License**

Спецыяльны дазвол на ажыццяўленне канкрэтнага віду дзейнасці, які пацвярджае, што суб'ект гаспадарання прымае на сябе абавязкі забяспечыць ажыццяўленне гэтага віду дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі нарматыўна-тэхнічных дакументаў.

## М

**Маёмасць арганізацыі** (аг. п.)
**Имущество организации**
**Property of an organisation**

Арганізацыя можа мець у сваёй уласнасці надзелы зямлі, будынкі, пабудовы, жыллёвы фонд, транспарт, маёмасць культурна-адукацыйнага і аздараўляльнага прызначэння, грашовыя сродкі, акцыі, іншыя каштоўныя паперы і іншую маёмасць, неабходную для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці арганізацыі, указанай у статуце. Маёмасць арганізацыі фарміруецца з: сяброўскіх унёскаў, дабрачынных ахвяраванняў, працы добраахвотнікаў, з іншых не забароненых законам паступленняў.

**Мазгавая атака (штурм)** (аг. п.)
**Мозговая атака (штурм)**
**Brainstorm**

Прыём вырашэння праблемы, які ўключае добраахвотны абмен думкамі.

**Маладзёжнае грамадскае аб'яднанне** (прав. аспекты)
**Молодёжное общественное объединение**
**Youth NGO**

Маладзёжным прызнаецца аб'яднанне грамадзян ва ўзросце да трыццаці аднаго году (не менш за дзве трэці ад агульнай колькасці сябраў), якое выражае іх спецыфічныя інтарэсы, і статутная дзейнасць якога накіравана на забеспячэнне сацыяльнага станаўлення і развіцця моладзі.





**Маніторынг** (арг. разв.)
**Мониторинг**
**Monitoring**

Няспынны працэс збору інфармацыі па пэўных аспектах дзейнасці, які ажыццяўляецца дзеля аналізу змен сітуацыі, узнікаючых праблем і кантролю за выкананнем графіка працы.

**Маркетынг** (аг. п.)
**Маркетинг**
**Marketing**

1. Від чалавечай дзейнасці, накіраванай на задавальненне патрэб шляхам абмену.
2. Сістэма арганізацыі гаспадарчай дзейнасці, заснаваная на вывучэнні рынкавага попыту, магчымасцяў збыту прадукцыі, рэалізацыі паслуг.

**Маркетынг грамадскай арганізацыі** (арг. разв.)
**Маркетинг общественной организации**
**NGO marketing**

1. Ажыццяўляемае арганізацыяй кіраванне попытам на выніку яе дзейнасці.
2. Сацыяльны і кіруючы працэс, накіраваны на задавальненне патрэб індывідуўмаў і груп шляхам прапановы і абмену паслуг.
3. Дасягненне мэтаў, якія стаяць перад арганізацыяй, шляхам умацавання супрацоўніцтва, усталявання адносін з кліентамі.

**Масавая інфармацыя** (грамад. сув.)
**Массовая информация**
**Mass information**

Прызначаныя для неабмежаванага кола асоб друкаваныя, аўдыальныя, аўдыёвізуальныя і іншыя паведамленні і матэрыялы, апублікаваныя ў друку ці даведзеныя да шырокіх колаў насельніцтва праз тэлерадыёвяшчанне альбо ў іншай форме перыядычнага распаўсюджвання.

**Масавы пошук фінансавання** (пошук фінанс.)
**Массовый поиск финансирования**
**Grassroots fudraising**

Збор сродкаў прыватнымі асобамі альбо групай асоб. Звычайна самі сябры арганізацыі – людзі, якія жывуць у дадзенай мясцовасці альбо людзі, якія з'яўляюцца кліентамі арганізацыі – займаюцца гэтым відам фандрайзінгу. Як правіла, грашовыя сродкі здабываюць з дапамогай латарэй і аўкцыёнаў.

**Матывацыя** (аг. п.)
**Мотивация**
**Motivation**

Сукупнасць прычын, якія ўплываюць на прыняцце рашэнняў.

**Матыў** (аг. п.)
**Мотив**
**Motive**

Пабуджальная прычына да якога-небудзь дзеяння.

**Матэрыяльна-фінансавая аснова дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў** (прав. аспекты)
**Материально-финансовая основа деятельности общественных объединений**
**Material-financial basis of NGO activity**

Грамадскія аб'яднанні могуць мець любую маёмасць, неабходную ім для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці, прадугледжанай статутам, за выключэннем аб'ектаў, якія згодна закону могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

**Матэрыяльны ўнёсак** (пошук фінанс.)
**Материальный вклад**
**In-kind contribution**

Унёсак абсталяваннем альбо іншымі матэрыяльнымі рэсурсамі, у адрозненне ад грашова-крэдытнага гранта. Некаторыя арганізацыі могуць таксама прадастаўляць плошчу пад што-небудзь альбо дапамогу сваіх штатных супрацоўнікаў.





**Мемарандум** (грамад. сув.)
**Меморандум**
**Memorandum**

1. Дыпламатычны дакумент, які ўручаецца прадстаўніку іншай краіны, з выкладзенымі ў ім поглядамі ўрада на якое-небудзь пытанне.
2. Гэта пісьмовая інфармацыя, якую адны дзелавыя людзі дасылаюць іншым дзелавым людзям унутры сваёй арганізацыі. Напрыклад, мемарандумы дасылаюць кіраўнікі супрацоўнікам (якія знаходзяцца ў тым жа будынку). Калі адпраўнік і атрымальнік працуюць у адной арганізацыі, мемарандум – тэхнічна правільная форма для пісьмовых паведамленняў.

**Менеджмент** (аг. п.)
**Менеджмент**
**Management**

1. Дзейнасць па рацыянальнай арганізацыі і кіраванні вытворчасцю, якая ажыццяўляецца наёмнымі і прафесійнымі работнікамі – менеджэрамі.
2. Кіраванне вытворчасцю альбо якой-небудзь арганізацыяй. Таксама: сістэма прынцыпаў, метадаў, сродкаў і формаў кіравання, якія распрацоўваюцца і выкарыстоўваюцца ў некаторых краінах для павышэння эфектыўнасці вытворчасці альбо якой-небудзь іншай грамадскай дзейнасці.

**Мерапрыемства** (аг. п.)
**Мероприятие**
**Arrangement**

Сукупнасць дзеянняў, аб'яднаных адной грамадска значнай мэтай.

**Метад рычага** (пошук фінанс.)
**Метод рычага**
**Lever method**

Выкарыстанне ўласных рэсурсаў для збору рэсурсаў ад іншых донараў.

**Метадалогія** (аг. п.)
**Методология**
**Methodology**

1. Прынцыпы і спосабы арганізацыі тэарэтычнай і практычнай дзейнасці.

2. Сукупнасць метадаў, якія прымяняюцца ў якой-небудзь навуцы.

**Метадалогія ў заяўцы** (пошук фінанс.)
**Методология в заявке**
**Methods**

*Гл. "Метады праекта"*

**Метады праекта** (пошук фінас.)
**Методы проекта**
**Methods of a project**

Раздзел заяўкі, з якога павінна быць зразумела што будзе зроблена, хто будзе ажыццяўляць дзеянні, як яны будуць ажыццяўляцца, калі і ў якой паслядоўнасці, якія рэсурсы (выканаўцы, памяшканні, абсталяванне і інш.) будуць выкарыстаны.

**Мецэнат** (аг. п.)
**Меценат**
**Patron of the arts**

Апякун навук і мастацтваў (ад імя рымскага дзеяча Мецэната, які падтрымліваў паэтаў).

**Міжнародная арганізацыя** (прав. аспекты)
**Международная организация**
**International organisation**

Міждзяржаўная (міжурадавая) арганізацыя, створаная дзеля ажыццяўлення пэўных мэтаў міжнароднага характару ў адпаведнасці з устаноўчым дакументам гэтай арганізацыі.

**Міжнародная дамова Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Международный договор Республики Беларусь**
**Treaty of the Republic of Belarus**

Міждзяржаўная альбо міжурадавая дамова, заключаная ў пісьмовай форме з замежнай дзяржавай альбо дзяржавамі, з кіраўніцтвам замежнай дзяржавы, альбо кіраўніцтвамі замежных дзяржаў, альбо з міжнароднай арганізацыяй ці міжнароднымі арганізацыямі, якая рэгулюецца міжнародным правам, незалежна ад таго ўтрымліваецца дамова у адным дакуменце ці ў звязаных паміж сабой дакументах, а таксама незалежна ад яго канкрэтнай





назвы і спосабу заключэння (дамова, пагадненне, канвенцыя, рашэнне, пакт, пратакол, абмен лістамі альбо нотамі і інш.).

**Міжнародны валютны фонд** (канкр. арг.)
**Международный валютный фонд**
**International currency foundation**

Міжнародны валютны фонд быў створаны ў 1944 годзе на канферэнцыі сусветных лідэраў у Брэтан-Вудс (ЗША). Міжнародны валютны фонд ажыццяўляе маніторынг сусветных валют, садзейнічае падтрымцы арганізаванай сусветнай плацёжнай сістэмы, прадастаўляе пазыку дзяржавам, якія маюць сур'ёзны дэфіцыт плацёжнага балансу.

**Міжнародныя сувязі грамадскіх аб'яднанняў (прав. аспекы)**
**Международные связи общественных объединений**
**International contacts of NGOs**

Грамадскія аб'яднанні ў адпаведнасці з іх статутамі могуць уступаць у міжнародныя грамадскія аб'яднанні, прымаць удзел у стварэнні міжнародных саюзаў грамадскіх аб'яднанняў, падтрымліваць прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні і рабіць іншыя крокі, згодна заканадаўства Рэспублікі Беларусь і яе міжнародных абавязацельстваў.

**Міністэрства** (прав. аспекты)
**Министерство**
**Ministry**

Цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе кіраўніцтва даручанай яму галіной эканамічнага, сацыяльна-культурнага будаўніцтва альбо адміністратыўна-палітычнай дзейнасці і нясе адказнасць за яе стан і развіццё. Для выканання ўскладзеных на іх задач Міністэрствам надаюцца паўнамоцтвы дзяржаўнаўладарнага характару і яны маюць права выдаваць юрыдычныя акты, абавязковыя для выканання падначаленымі арганізацыямі.

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Министерство информации Республики Беларусь**
**Ministry of Information of the Republic of Belarus**

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і падпарадкоўва-

ецца Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь. Асноўнымі задачамі з’яўляюцца: дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне передачы і распаўсюджвання інфармацыі, рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы масавай інфармацыі, кнігавыдання, паліграфіі і кнігараспаўсюджвання; кантроль за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі. Ажыццяўляе рэгістрацыю сродкаў масавай інфармацыі, а таксама ліцэнзаванне выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці.

**Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь**
**Ministry of Labour and Social Support of the Republic of Belarus**

Рэспубліканскае міністэрства, задачамі якога з'яўляюцца: распрацоўка прапаноў і рэалізацыя асноўных накірункаў і прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі па рашэнні комплексных праблем ў сацыяльна-працоўнай галіне, галіне народанасельніцтва, па павышэнні ўзроўню жыцця і даходаў насельніцтва, па развіццю сацыяльнага страхавання і кадравага патэнцыялу, ўдасканаленню сістэмы аплаты працы і сацыяльнага партнёрства, арганізацыі пенсійнай сістэмы, сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі, па паляпшэнні ўмоў і аховы працы, забеспячэнні эфектыўнай занятасці і сацыяльных гарантый, сацыяльнай абароне сям'і, жанчын, грамадзян састарэлага ўзросту і ветэранаў, інвалідаў, грамадзян звоненых у запас (адстаўку) з вайсковай службы і з органаў унутраных спраў і членаў іх сем'яў і іншых катэгорый грамадзян, якім патрэбна дзяржаўная падтрымка, па ўдасканаленні заканадаўства аб працы, занятасці, міграцыі і сацыяльнай абароне насельніцтва і кантролю за яго выкананнем, ажыццяўленні міжнароднага супрацоўніцтва ва ўстаноўленай галіне дзейнасці.

Цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання, які выдае ліцэнзіі на ажыццяўленне наступных сацыяльных паслуг: кансультацыйна-інфармацыйныя, сацыяльна-рэабілітацыйныя, пасрэдніцкія, прадастаўленне часовага прытулку, дзённае знаходжанне ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, сацыяльнае абслугоўванне ў стацыянарных установах і дома.





**Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Министерство юстиции Республики Беларусь**
**Ministry of Justice of the Republic of Belarus**

Рэспубліканскае міністэрства, задачамі якога з'яўляюцца: умацаванне законнасці, абарона правоў і законных інтарэсаў дзяржаўных, грамадскіх арганізацый і грамадзян, удасканаленне сумесна з іншымі дзяржаўнымі органамі дзейнасці па барацьбе са злачыннасцю і іншымі правапарушэннямі, метадычнае кіраўніц-тва і каардынацыя работы дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый па прапагандзе прававых ведаў сярод насельніцтва і інш. Орган, які выдае ліцэнзіі на аказанне юрыдычных паслуг, распаўсюджванне прававой інфармацыі.

**Мінскі гарадскі і абласныя выканаўчыя камітэты** (прав. аспекты)
**Минский городской и областные исполнительные комитеты**
**Minsk City and Regional Executive Committees**

Пастаянна дзеючы выканаўчы і распарадчы орган, які выбіраецца на сесіі Савета народных дэпутатаў. Выконвае шматлікія функцыі па арганізацыі жыццядзейнасці на падведамнай тэрыторыі, ажыццяўляе кантакты з размешчанымі на іх тэрыторыі прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі, насельніцтвам і грамадзянамі ва ўсёй паўнаце адносін, прадугледжаных заканадаўствам. Орган дзяржаўнага кіравання, які выдае ліцэнзіі на арганізацыю дзіцячых сацыяльных прытулкаў і сацыяльна-педагагічных цэнтраў, ліцэнзіі на аказанне дапамогі грамадзянам у самастойнай адукацыі.

**Місія арганізацыі** (арг. разв.)
**Миссия організацыі**
**Mission of an organisation**

1. Фармулёўка, у якой вызначаюцца абслугоўваемыя арганізацыяй групы насельніцтва, геаграфічныя раёны, на якія распаўсюджваецца яе дзейнасць.
2. Асноўная агульная мэта арганізацыі, якая выразна акрэслівае мэты існавання арганізацыі.

**Мітынг** (аг. п.)
**Митинг**
**Meeting**

Масавы збор грамадзян дзеля публічнага абмеркавання і выражэння іх адносін да дзеянняў асоб і арганізацый, падзей грамадска-палітычнага жыцця, а таксама да вырашэнняў пытанняў, якія закранаюць іх інтарэсы.

**Мова звароту да фонду** (пошук. фінанс.)
**Язык обращения в фонд**
**Appeal language**

Мова на якой напісана заяўка ў фонд на атрыманне гранта. Замежныя фонды, якія маюць прадстаўніцтвы ў Расіі і Беларусі, прымаюць заяўкі напісаныя на рускай мове. Але нават у гэтым выпадку лепш разлічваць на перакладчыкаў і падаваць заяўкі на дзвюх мовах.

**Мэта** (аг.п.)
**Цель**
**Goal**

Актыўны, дзейсны бок чалавечай свядомасці, прадбачанне ў ёй вынікаў, на дасягненне якіх накіраваны дзеянні.

**Мэтавая аўдыторыя** (грамад. сув.)
**Целевая аудитория**
**Target audience**

Гэта людзі, якія адабраны арганізацыяй для інфармацыйнага ўздзеяння. Часцей за ўсё, добра вядомы толькі тры альбо чатыры "мэтавыя аўдыторыі": СМІ, "кліенты", чыноўнікі, спонсары. У рэальным жыцці мэтавых аўдыторый значна больш і чым больш арганізацыя сегментуе сваё асяроддзе, тым больш дыферэнцыруе яна свой падыход да кожнага сегменту грамадскасці, тым большы поспех яе чакае.

**Мэтавы ўнёсак** (пошук фінанс.)
**Целевой взнос**
**Special purpose grant**

Бязвыплатная перадача сродкаў на выкананне мэты сацыяльнага альбо іншага характару.





**Мэты арганізацыі** (арг. разв.)
**Цели организации**
**Goals of an organisation**

Плануемыя канчатковыя вынікі ў розных аспектах дзейнасці арганізацыі, якія прытрымліваюцца яе місіі.

**Мэты і задачы ў заяўцы** (пошук фінанс.)
**Цели и задачи в заявке**
**Goals and objectives**

Раздзел заяўкі, у якім апісваюцца плануемыя канчатковыя вынікі праекта. Мэты фармулююць агульныя прынцыпы, і іх канчатковыя вынікі не заўжды можна вымераць. Абапіраючыся толькі на мэты, цяжка зразумець, ці выканальны праект. У гэтым выпадку на дапамогу прыходзяць больш канкрэтныя, вымяральныя задачы, якія маюць непасрэдныя адносіны да вырашаемай праблемы і могуць быць дасягнуты за нейкі пэўны час. Задачы захоўваюць інфармацыю аб тым, што, калі і якім чынам вы збіраецеся рабіць, а таксама інфармацыю аб тым, як можна вымераць вынікі вашай дзейнасці.

**Мясцовае грамадскае аб'яднанне** (прав. аспекты)
**Местное общественное объединение**
**Local NGO**

Мясцовым прызнаецца грамадскае аб'яднанне, дзейнасць якога распаўсюджваецца на тэрыторыю адной ці некалькіх адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак.

**Мясцовае самакіраванне** (прав. аспекты)
**Местное самоуправление**
**Local self-government**

Форма арганізацыі і дзейнасці грамадзян для самастойнага рашэння непасрэдна самімі альбо праз выбраныя імі органы сацыяльных, эканамічных, палітычных і культурных пытанняў мясцовага значэння зыходзячы з інтарэсаў насельніцтва і асаблівасцяў развіцця адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак на аснове ўласнай матэрыяльна-фінансавай базы і прыцягнутых сродкаў.

**Мясцовы фонд** (пошук фінанс.)
**Местный фонд**
**Community foundation**

Арганізацыя, якая прадастаўляе гранты на дабрачынныя мэты ў вызначанай супольнасці, вобласці альбо рэгіёне. Рэсурсы, даступныя фонду, звычайна прадастаўляюцца шмат якімі донарамі ў выглядзе незалежна кіруемых укладаў, прыбытак ад якіх ідзе на далейшыя гранты.

**Мясцовыя органы ўлады Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Местные органы власти Республики Беларусь**
**Local authorities of the Republic of Belarus**

Саветы народных дэпутатаў абласцей, гарадоў, раёнаў, раёнаў у гарадах, вёсак і пасёлкаў, прававы статус якіх вызначаецца іх прыродай як прадстаўнічых органаў дзяржаўнай улады і асноўнага звяна ў сістэме мясцовага самакіравання. Рашэнні мясцовых Саветаў, іх органаў і службовых асоб, якія прымаюцца ў межах паўнамоцтваў, нададзеных законам, абавязковыя для выканання ўсімі размешчанымі на падпарадкаванай ім тэрыторыі арганізацыямі, грамадскімі аб'яднаннямі і грамадзянамі.

## Н

**Навакольнае асяроддзе** (аг. п.)
**Внешняя среда**
**External environment**

Навакольнае асяроддзе ўключае ў сябе эканамічныя ўмовы, спажыўцоў, прафесійныя саюзы, кіруючыя акты, заканадаўства, канкуруючыя арганізацыі, сістэму каштоўнасцяў у грамадстве, грамадскія погляды, тэхніку і тэхналогію і іншыя часткі. Усе гэтыя фактары ўплываюць на тое, што адбываецца непасрэдна ў арганізацыі.

**Навучальная праграма** (стратэг. план.)
**Обучающая программа**
**Teaching programme**

Праграма, у якой арганізацыя-партнёр навучае сваіх кліентаў. Неабходна мець на ўвазе: па закону такі праект лічыцца партнёрскім толькі ў тым выпадку, калі паслугі прадастаўляюцца бясплатна. Калі ж за паслугі патрэбна плаціць, гэта ўжо з'яўляецца падрадам.








**Навучанне (у грамадскай арганізацыі)** (аг. п.)
**Обучение (в общественной организации)**
**Education (at NGO)**

Перадача каму-небудзь якіх-небудзь ведаў, навыкаў. Перадача досведу і поглядаў. У грамадскіх арганізацыях навучанне ажыццяўляецца праз семінары і трэнінгі.

**Наглядныя матэрыялы** (аг. п.)
**Наглядные материалы**
**Visual materials**

Візуальныя матэрыялы, якія дапамагаюць лепшаму ўспрыманню інфармацыі, такія як графікі, дыяграмы, фатаграфіі, карыкатуры і інш.

**Наймальнік** (прав. аспекты)
**Наниматель**
**Employer**

Юрыдычная альбо фізічная асоба, якой заканадаўствам дадзена права заключэння і спынення працоўнай дамовы з работнікам.

**Накладныя выдаткі** (пошук фінанс.)
**Накладные расходы**
**Overheads**

Адміністратыўныя выдаткі на ажыццяўленне праекта альбо праграмы.

**Наменклатура спраў** (прав. аспекты)
**Номенклатура дел**
**Business nomenclature**

Наменклатурай спраў з'яўляецца сістэматызаваны спіс назваў спраў, якія ўтвараюцца ў працэсе дзейнасці грамадскага аб'яднання з указаннем тэрмінаў іх захоўвання.

**Нарматыўная дамова** (прав. аспекты)
**Нормативный договор**
**Normative agreement**

Пагадненне, якое ўсталёўвае агульныя правілы рэгулявання адносін паміж некалькімі дзяржавамі (у міжнародным праве) альбо некалькімі арганізацыямі ўнутры дзяржавы.

**Нацыяналізацыя** (прав. аспекты)
**Национализация**
**Nationalization**

Пераход маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян і юрыдычных асоб, у дзяржаўную ўласнасць. Нацыяналізацыя дапушчальная толькі на падставе прынятага ў адпаведнасці з Канстытуцыяй закону аб парадку і ўмовах нацыяналізацыі гэтай маёмасці і са своечасовай і поўнай кампенсацыяй асобе, маёмасць якой нацыяналізавана, кошту гэтай маёмасці і іншых страт, нанесеных яе канфіскацыяй.

**Нацыянальны фонд** (пошук фінанс.)
**Национальный фонд**
**National foundation**

Недзяржаўная арганізацыя ў дадзенай краіне, падпарадкоўваецца мясцоваму кіраўніцтву. Як правіла, нацыянальныя фонды займаюцца распаўсюджваннем датацый і ажыццяўленнем праграм і цалкам альбо часткова фінансуюцца галаўным фондам.





**Незалежны фонд** (пошук фінанс.)
**Независимый фонд**
**Independent foundation**

Фонд, больш шырока вядомы як прыватны, сямейны, спецыяльнага дзеяння.

**Некамерцыйныя арганізацыі** (прав. аспекты)
**Некоммерческие организации**
**Non-commercial organisations**

Юрыдычныя асобы, асноўнай мэтай дзейнасці якіх не з'яўляецца атрыманне прыбытку і размеркаванне яго сярод удзельнікаў. Юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі, могуць стварацца ў форме спажывецкіх кааператываў, грамадскіх ці рэлігійных арганізацый (аб'яднанняў), якія фінансуюцца ўласнікам устаноў, дабрачынных і іншых фондаў, а таксама ў іншых формах, прадугледжаных заканадаўствам.

**Непрамыя выдаткі** (арг. разв.)
**Непрямые расходы**
**Indirect expenses**

Выдаткі, неабходныя арганізацыі для яе развіцця і падтрымкі жыццяздольнасці ў перыяды адсутнасці фінансуемых праектаў.

**Нефінансавыя формы прапарцыянальнага ўдзелу** (пошук фінанс.)
**Нефинансовые формы пропорционального участия**
**Non-fiscal forms of proportional collaboration**

Дапаўненне фінансавага ўнёска аднаго з донараў нефінансавымі рэсурсамі іншых партнёраў.

**Норма права** (прав. аспекты)
**Норма права**
**Legal regulation**

Устаноўленае альбо санкцыянаванае дзяржавай і забяспечанае яе прымусовай сілай правіла, якое рэгулюе ўзаемаадносіны асобных грамадзян, органаў і арганізацый. У нормах права вызначаны правы і абавязкі дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, службовых асоб, грамадзян, з дапамогай якіх арганізуецца іх дзейнасць і паводзіны. Калі меры выхавання, прафілактыка аказваюц-

ца недастатковымі супраць парушэння норм права і чалавек дапускае правапарушэнне, ён нясе за яго юрыдычную адказнасць.

**Ноў-хаў** (аг. п.)
**Ноу-хау**
**Know how**

У перакладзе з ангельскай мовы – ведаць, як рабіць. Абазначэнне тэхнічных ведаў, вытворчага досведу, навыкаў, камерцыйнай і іншай інфармацыі, неабходнай для вырабу пэўнай прадукцыі, тавараў, узнаўлення вытворчага працэсу, тэхналогіі і г. д. Тэрмін ужываецца ў міжнародных пагадненнях, дамовах, якія прадугледжваюць абмен дакументацыяй, навучанне работнікаў, удзел спецыялістаў.

## О

**Органы дзяржаўнага кіравання** (прав. аспекты)
**Органы государственного управления**
**State controllers**

Органы, якія арганізуюць выканаўчую і распарадчую дзейнасць, якая ажыццяўляецца на аснове Канстытуцыі, законаў і падзаконных актаў; міністэрствы, дзяржаўныя камітэты, ведамствы. У залежнасці ад сферы дзейнасці ў дзяржаўным кіраванні вылучаюць падсістэмы: кіраванне гаспадаркай, сацыяльна-культурным будаўніцтвам (адукацыяй, навукай, культурай, аховай здароўя, фізкультурай і спортам, сацыяльным забеспячэннем і гэтак далей) і адміністратыўна-палітычнай дзейнасцю (абарона краіны, грамадскага парадку, грамадскай і дзяржаўнай бяспекі, знешнімі адносінамі і інш.).

## П

**Паблік Рылэйшанз** (грамад. сув.)
**Паблик Рилэйшнз**
**Public Relations (PR)**

У перакладзе з ангельскай мовы – сувязі з грамадскасцю. Плануемыя, працяглыя намаганні, якія накіраваны на стварэнне і падтрымку добразычлівых адносін і ўзаемаразумення паміж арганізацыяй і грамадствам. *(таксама, часта гавораць – "піар" (PR))*

**Паблісіці** (грамад. сув.)
**Паблисити**
**Publicity**

У перакладзе з ангельскай мовы – рэклама. Спрыяльныя камерцыйныя паведамленні, прэзентацыі або звесткі, якія перадаюцца праз сродкі масавай інфармацыі, але не аплочваюцца зацікаўленай асобай (канкрэтным спонсарам).





**Падатак** (прав. аспекты)
**Налог**
**Tax**

Устаноўленая дзяржавай абавязковая выплата, якая бярэцца з грамадзян і юрыдычных асоб.

**Падвядзенне вынікаў і ацэнка** (пошук фінанс.)
**Подведение итогов и оценка**
**Evaluation**

Раздзел заяўкі, дзе абгрунтоўваецца далейшая ступень дасягнення пастаўленых мэтаў і ацэньваецца рэалізацыя праекта.

**Падтрымка капіталу** (пошук фінанс.)
**Поддержка капитала**
**Capital support**

*Гл. "Капітальны грант"*

**Пазіцыянаванне** (грамад. сув.)
**Позиционирование**
**Positioning**

1. Дзеянні па забеспячэнні для прадукта канкурэнтаздольнага становішча на рынку і распрацоўка адпаведнага комплекса маркетынга.
2. Гэта вызначэнне для Вашага прадукту (г.зн. тавару, маркі, фірмы, асобы, ідэі, грамадскай арганізацыі) асобнага, унікальнага месца ў свядомасці спажыўца. Асноўны прынцып пазіцыянавання – "пазіцыя" у галовах публікі не ствараецца і не будуецца нанова, але абапіраецца на ўжо звыклае, добра вядомае.

**Палажэнне** (прав.аспекты)
**Положение**
**Regulation**

Прававы акт, які ўсталёўвае асноўныя правілы арганізацыі і дзейнасці дзяржаўных органаў, структурных падраздзяленняў органа, а таксама ніжэйшых устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў. Структура тэксту палажэння: агульныя палажэнні, ас-

ноўныя задачы, функцыі, правы і абавязкі, кіраўніцтва, узаемаадносіны, сувязі, кантроль, маёмасць і сродкі, праверка і рэвізія дзейнасці, рэарганізацыя і ліквідацыя.

**Паліграфічная дзейнасць** (аг. п.)
**Полиграфическая деятельность**
**Printing activity**

Паліграфічнай дзейнасцю з'яўляецца шматразовае рэпрадуцыраванне аднолькавых копій якіх-небудзь ілюстрацый, літар, знакаў, малюнкаў і спосаб друкаванага памнажэння тэксту, ілюстрацый і г. д. у выглядзе кніг, часопісаў, брашур, газет, буклетаў, плакатаў, афіш, улётак, геаграфічных карт і атласаў, марак, грашовых знакаў, этыкетак, канвертаў, бланкаў і іншых відаў друкаванай прадукцыі, якая выпрабляецца пры дапамозе сукупнасці тэхнічных і тэхналагічных сродкаў.

**Палітыка** (аг. п.)
**Политика**
**Policy**

1. Агульныя арыенціры для дзеянняў і прыняцця рашэнняў, якія робяць лягчэйшым працэс дасягнення мэтаў.
2. Навука пра задачы і мэты дзяржавы і пра сродкі, якія ёсць у распараджэнні ці бываюць неабходныя для дасягнення гэтых мэтаў.

**Палітычная партыя** (прав. аспекты)
**Политическая партия**
**Political party**

Палітычнай партыяй з'яўляецца незалежнае, створанае на падставе індывідуальнага добраахвотнага сяброўства аб'яднанне грамадзян, якое дзейнічае ў межах Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, садзейнічае выяўленню палітычнай волі грамадзян і прымае ўдзел у выбарах.

**Палітычная сістэма грамадства** (прав. аспекты)
**Политическая система общества**
**Political system**

Упарадкаваная на аснове права і іншых сацыяльных норм сукупнасць інстытутаў (дзяржаўных органаў, палітычных партый, рухаў, грамадскіх арганізацый і інш.), у межах якой праходзіць палітычнае жыццё грамадства і ажыццяўляецца палітычная ўлада.

**Паралельнае фінансаванне** (аг. п.)
**Параллельное финансирование**
**Parallel financing**

Фінансаванне аднаго праекта рознымі фондамі паасобку. Партнёры прыходзяць да згоды адносна агульнай мэты, але рашаюць весці фінансаванне і выплаты асобна, выкарыстоўваючы кожны свае фінансавыя, адміністратыўныя і кіраўніцкія структуры.

**Партнёрства** (арг. разв.)
**Партнёрство**
**Partnership**

Доўгатэрміновыя ўзаемавыгадныя адносіны паміж дзвюма альбо больш арганізацыямі, якія базуюцца на прыняцці фармальнага пагаднення і накіраваны на рэалізацыю канкрэтных, агульных мэтаў і задач.

**Пасада** (прав. аспекты)
**Должность**
**Position**

Службовае становішча работніка, абумоўленае колам яго абавязкаў, службовымі правамі і характарам адказнасці.

**Пастанова** (прав. аспекты**)**
**Постановление**
**Resolution**

Акт, які прымаецца Палатай Прадстаўнікоў ці Саветам Рэспублікі Беларусь па арганізацыйных і некаторых іншых пытаннях, звязаных з ажыццяўленнем вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады сваіх паўнамоцтваў. Таксама, рашэнні, якія маюць нарматыўны характар альбо важнае народна-гаспадарчае і агульнае значэнне.

**Пастаноўка праблемы альбо абгрунтаванне патрэб у заяўцы** (пошук фінанс.)
**Постановка проблемы или обоснование потребностей в заявке**
**Problem statement or needs assessment**

Частка заяўкі, у якой апісваецца сітуацыя, што натхняе Вас пачаць распрацоўку праекта. Вы павінны растлумачыць, навошта патрэбен Ваш праект. Дадзеная праблема павінна адлюст-

роўваць аб'ектыўную сітуацыю, гэта значыць праблемы па-за Вашай арганізацыяй – з жыцця Вашых кліентаў, мясцовых жыхароў, горада альбо дзяржавы. Фармулёўка праблемы не павінна адлюстроўваць унутраныя патрэбы Вашай арганізацыі, за выключэннем выпадкаў, калі вы шукаеце сродкі на павышэнне эфектыўнасці ўласнай працы. У прыватнасці, адсутнасць у Вас сродкаў – гэта не праблема. Гэта відавочна з самога факта звяртання за фінансавай дапамогай. Важна адказаць на пытанне, дзеля рашэння якой праблемы Вам патрэбны сродкі.

**Паштоўка** (грамад. сув.)
**Открытка**
**Postcard**

Добра ілюстраванае малафарматнае выданне, прызначанае найперш для паштовай рассылкі, звычайна служыць для віншавання ці інфармавання партнёраў, кліентаў, электарату ці супрацоўнікаў арганізацыі.

**Перыядычнае друкаванае выданне** (аг. п.)
**Периодическое печатное издание**
**Periodical printed publication**

Пад перыядычным друкаваным выданнем разумеюць газету, часопіс, брашуру, альманах, бюлетэнь, іншае выданне, якое мае нязменную назву, парадкавы нумар і якое выходзіць у свет не радзей аднаго разу на год. Акрамя гэтага сюды ж адносяць перыядычнае распаўсюджванне тыражом 300 і больш экзэмпляраў тэкстаў, створаных пры дапамозе камп'ютэраў і сабраных з іх баз дадзеных інфармацыі, а таксама ў адносінах да іншых сродкаў масавай інфармацыі прадукцыя якіх распаўсюджваецца ў выглядзе друкаваных паведамленняў, плакатаў, лістовак і іншых матэрыялаў.

**Пікетаванне** (аг. п.)
**Пикетирование**
**Picketing**

Публічнае выказванне грамадзянінам альбо групай грамадзян грамадска-палітычных, групавых, асабістых і іншых інтарэсаў альбо пратэсту (без шэсця), у тым ліку спосабам галадоўкі, з выкарыстаннем альбо без выкарыстання плакатаў і транспарантаў па якіх-небудзь праблемах, а таксама з выкарыстаннем іншых сродкаў.





**Плакат** (грамад. сув.)
**Плакат**
**Poster**

Несфальцаванае, звычайна каляровае мастацкае выданне, фамату А4 і болей, якое рэкламуе прадукт, ідэю альбо арганізацыю.

**План выпадковасцяў** (пошук фінанс.)
**План случайностей**
**Accidental plan**

План дзеянняў, якія будуць выкарыстоўвацца ў выпадку грунтоўных змен абставінаў.

**Пошук фінансавання** (пошук фінанс.)
**Поиск финансирования**
**Fundraising**

*Гл. “Фандрайзінг”*



**Пра бона** (аг. п.)
**Про боно**
**Pro bono**

Неаплочваемая затрата асабістага часу і ведаў, за выключэннем пакрыцця прамых выдаткаў, звязаных з працай (напрыклад, камандзіроўкі і сувязь).

**Права** (прав. аспекты)
**Право**
**Right**

Інстытут грамадскага жыцця, прызначаны для рэгулявання найбольш значных грамадскіх адносін, якія патрабуюць дзяржаўнай аховы. Побач з іншымі сацыяльнымі рэгулятарамі (мараль, звычаі, традыцыі, рэлігія, культура і інш.) права накіравана на забеспячэнне развіцця і дзеяння ўсяго сацыяльнага арганізма ў адпаведнасці з эканамічнымі законамі і аб'ектыўнымі патрэбамі грамадскага развіцця.

**Права на аб'яднанне ў грамадскія арганізацыі** (прав. аспекты)
**Права на объединения в общественные организации**
**Right for NGO creation**

Найважнейшае палітычнае права грамадзян на аб'яднанне іх на аснове агульнасці інтарэсаў і свабоднага волевыяўлення ў добраахвотныя фарміраванні, знаходжанне ў грамадскіх арганізацыях, рэалізацыю правоў і абавязкаў, звязаных з сяброўствам у дадзенай арганізацыі. Права на аб'яднанне садзейнічае рэалізацыі іншых правоў грамадзян – свабоды слова, друку, сходаў і мітынгаў, удзелу ў кіраванні і інш. Права на аб'яднанне ў грамадскія арганізацыі прадугледжана сістэмай прававых норм розных галін заканадаўства. Вядучае месца сярод іх займае Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

**Праверка** (прав. аспекты)
**Проверка**
**Verification**

Спосаб кантролю, у працэсе якога ўстанаўліваецца законнасць і дакладнасць канкрэтных аперацый па адным ці некалькіх узаемазвязаных накірунках дзейнасці правяраемага суб'екта.





**Правілы** (аг. п.)
**Правила**
**Rules**

Планы, якія выразна акрэсліваюць, што можна і што нельга зрабіць у дадзенай канкрэтнай сітуацыі.

**Правы грамадскіх арганізацый** (прав. аспекты)
**Права общественных организаций**
**Rights of NGOs**

Як юрыдычная асоба, грамадская арганізацыя мае грамадзянскія правы, суадносныя з мэтамі дзейнасці, якія прадугледжаны ў яе ўстаноўчых дакументах, а таксама па прадмеце дзейнасці, калі ён адзначаны ва ўстаноўчых дакументах, і нясе звязаныя з гэтай дзейнасцю абавязкі. Грамадская арганізацыя мае наступныя правы: стварэнне асацыяцый (саюзаў), падтрымка міжнароднай сувязі, права мець сімволіку, ахова дзелавой рэпутацыі, прадастаўляць і ахоўваць правы і законныя інтарэсы сваіх сябраў (удзельнікаў) у дзяржаўных, гаспадарчых і грамадскіх органах і арганізацыях, звяртацца ў суд дзеля абароны правоў і законных інтарэсаў сябраў грамадскіх арганізацый, удзельнічаць у разглядзе спраў у судах праз прадстаўнікоў грамадскасці, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю, якае мае адносіны да іх дзейнасці, засноўваць уласныя і карыстацца ва ўстаноўленым парадку дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі, ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць, мець маёмасць, выступаць у якасці наймальніка, атрымліваць зводную статыстычную інфармацыю, ствараць бібліятэкі, музеі, архівы, прымаць удзел ва ўдасканаленні заканадаўства, выступаць з адпаведнай ініцыятывай перад асобамі, якія валодаюць правам на ўнясенне прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці акта.

**Праграма Еўрапейскага Саюза Тасіс** (канкр. арг.)
**Программа Европейского Союза Тасис**
**The European Union's TACIS Programme**

Тасіс – праграма Еўрапейскага Саюза, якая садзейнічае развіццю рынкавай эканомікі і дэмакратыі ў новых Незалежных Дзяржавах, шляхам бязвыплатнага прадастаўлення ноў-хаў. З 1991 па лініі Тасіс было выдзелена звыш 3 млрд. ЭКЮ, што дазволіла пачаць ажыццяўленне звыш 2500 праектаў.

**Праграмы** (стратэг. план.)
**Программы**
**Programmes**

Планы, якія ўключаюць у сябе мэты і асноўныя крокі, што з'яўляюцца неабходнымі дзеля дасягнення гэтых мэтаў за нейкі пэўны час, а таксама патрабуемыя для гэтага рэсурсы.

**Прадметны бюджэт** (пошук фінанс.)
**Предметный бюджет**
**Line-item budget**

Спіс выдаткаў, звязаных і не звязаных з персаналам праекта (заработныя платы, выдаткі на неабходныя для ажыццяўлення праекта матэрыялы).

**Прадпрымальніцкая дзейнасць** (прав. аспекты)
**Предпринимательская деятельность**
**Business undertakings**

Самастойная дзейнасць юрыдычных і фізічных асоб, якая ажыццяўляецца імі ў грамадзянскім абароце ад свайго імя, на сваю рызыку і пад сваю маёмасную адказнасць; дзейнасць, накіраваная на сістэматычнае атрыманне прыбытку ад карыстання маёмасцю, ад продажу рэчаў, вырабленых, перапрацаваных альбо набытых указанымі асобамі на продаж, а таксама ад выканання работ ці аказання паслуг, калі гэтыя паслугі ці работы прызначаны для рэалізацыі іншым асобам і не выкарыстоўваюцца для ўласнага спажывання.

**Прадстаўніцтва** (прав. аспекты)
**Представительство**
**Representation**

1. Адасобленае падраздзяленне юрыдычнай асобы, размешчанае па-за месцам яго знаходжання, якое абараняе і прадстаўляе інтарэсы юрыдычнай асобы і здзяйсняе ад яго імя іншыя юрыдычныя дзеянні.
2. Ажыццяўленне адной асобай (прадстаўніком) ад імя другой асобы (таго, каго прадстаўляюць) у выніку паўнамоцтва, заснаванага на даверанасці, заканадаўстве альбо акце ўпаўнаважанага на гэта дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання альбо самакіравання, здзелак, якія непасрэдна ствараюць, змяняюць і спыняюць грамадзянскія правы і абавязкі прадстаўляемага.





**Прадстаўніцтва замежнай арганізацыі** (прав. аспекты)
**Представительство иностранной организации**
**Representation of a foreign organisation**

Прадстаўніцтвам замежнай арганізацыі з'яўляецца яе адасобленае падраздзяленне, размешчанае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якое абараняе і прадстаўляе інтарэсы замежнай арганізацыі і ажыццяўляе іншыя функцыі, якія не супярэчаць заканадаўству.

**Праект** (стратэг. план.)
**Проект**
**Project**

1. Кароткатэрміновая справа, якая разлічана на доўгатэрміновы эфект.
2. План рэалізацыі канкрэтнай справы, якая прытрымліваецца місіі арганізацыі.

**Прапаганда** (грамад. сув.)
**Пропаганда**
**Propaganda**

Ідэйнае ўздзеянне на шырокія колы насельніцтва, распаўсюджванне і прасоўванне некаторых ідэй і поглядаў.

**Праспект** (грамад. сув.)
**Проспект**
**Prospect**

Добра ілюстраванае збрашураванае рэкламнае выданне з падрабязным апісаннем уласцівасцяў і асаблівасцяў прадуктаў альбо паслуг, якія прапануе арганізацыя; прызначаны ў асноўным для прэсы, патэнцыйных партнёраў і спонсараў.

**Праўленне** (арг. разв.)
**Правление**
**Board of directors**

Група, у якую ўваходзяць вядомыя ў грамадстве людзі. Асноўная задача Праўлення – фарміраваць стратэгію арганізацыі, а таксама забяспечыць добразычлівыя адносіны фінансавых колаў да яе дзейнасці.

**Прафесійны саюз** (прав. аспекты)
**Профессиональный союз**
**Trade union**

Прафесійны саюз з'яўляецца добраахвотнай грамадскай арганізацыя, якая аб'ядноўвае грамадзян, у тым ліку навучэнцаў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, звязаных агульнымі інтарэсамі па роду дзейнасці, як у вытворчай, так і ў невытворчай сферах, дзеля абароны працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў, якія выцякаюць з агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і якія ўсталяваны Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека, Міжнародным пактам аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, канвенцыямі Міжнароднай арганізацыі працы і іншымі ратыфікаванымі ва ўстаноўленым парадку міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь.

**Працоўная дамова** (прав. аспекты)
**Трудовой договор**
**Labour contract**

Пагадненне паміж работнікам і наймальнікам (наймальнікамі), у адпаведнасці з якім работнік абавязваецца выконваць працу па вызначанай адной альбо некалькіх пэўных прафесіях, спецыяльнасцях альбо пасадах, якія адпавядаюць кваліфікацыі згодна штатнага раскладу і прытрымліваецца ўнутранага працоўнага распарадку, а наймальнік у сваю чаргу абавязваецца даць работніку, абумоўленую працоўнай дамовай работу, забяспечыць умовы для працы, прадугледжаныя заканадаўствам аб працы, мясцовымі нарматыўнымі актамі і пагадненнем бакоў, своечасова выплочваць работніку заработную плату.

**Працоўны план праекта** (пошук фінанс.)
**Рабочий план проекта**
**Summary chart of key activities**

Парадак выканання праекта. У гэтым плане Вы павінны падзяліць выкананне праекта на этапы і вызначыць аб'ём працы па кожным з іх, уключыць усе мерапрыемствы, якія апісаны у раздзеле "Стратэгія дасягнення мэтаў". Прапануемая паслядоўнасць іх ажыццяўлення павінна быць лагічнай і мэтанакіраванай.



**Працэдуры** (аг. п.)
**Процедуры**
**Procedure**

1. Прадпісанні ў адносінах да таго, якія дзеянні могуць быць распачаты ў нейкай канкрэтнай сітуацыі.
2. Афіцыйны парадак дзеянняў, выканання, абмеркавання чаго-небудзь.

**Прыватны фонд** (пошук фінанс.)
**Частный фонд**
**Private foundation**

Недзяржаўная, некамерцыйная арганізацыя (якая фінансуецца адной крыніцай, такой як: прыватная асоба, сям'я, карпарацыя), якая сама вызначае сваю праграму дзейнасці. Прыватныя фонды – арганізацыі, мэта якіх – падтрымка сацыяльнай, адукацыйнай, рэлігійнай і іншых відаў дабрачыннай дзейнасці. Прыватныя фонды садзейнічаць агульнаму дабрабыту грамадства, у прыватнасці – шляхам прадастаўлення грантаў.

**Прыватныя донары** (пошук фінанс.)
**Частные доноры**
**Private donors**

Фонды, прыватныя некамерцыйныя арганізацыі, якія атрымоўваюць сродкі ад грамадзян (ахвяраванні) альбо ад камерцыйных фірм ці прыватных асоб дзеля далейшага прадастаўлення гэтых сродкаў у якасці грантаў.

**Прынцыпы стварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў** (прав. аспекты)
**Принципы создания и деятельности общественных объединений**
**Principles of NGO creation and activity**

Грамадскія аб'яднанні ствараюцца і дзейнічаюць на падставе прынцыпаў добраахвотнасці, самастойнасці і галоснасці. Грамадскія аб'яднанні засноўваюць сваю дзейнасць згодна статута і ажыццяўляюць яе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, дзеючым Законам "Аб грамадскіх аб'яднаннях" і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** (прав. аспекты)
**Президент Республики Беларусь**
**President of the Republic of Belarus**

Прэзідэнт з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Прэзідэнт з'яўляецца вышэйшай службовай асобай Рэспублікі Беларусь, якая ўвасабляе адзінства народа, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. Прэзідэнт прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспецы і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады.

**Прэс-архіў** (грамад. сув.)
**Пресс-архив**
**Press-archives**

Гэта спецыяльная падборка матэрыялаў, дакументаў, фотаздымкаў рознага перыяду дзейнасці арганізацыі. Выкарыстоўваецца ў якасці дадатковай інфармацыі для сродкаў масавай інфармацыі.

**Прэс-канферэнцыя** (грамад. сув.)
**Пресс-конференция**
**Press-conference**

Адзін з прыёмаў перадачы інфармацыі сродкам масавай інфармацыі з мэтай асвятлення якога-небудзь важнага пытання.

**Прэс-рэліз** (грамад. сув.)
**Пресс-релиз**
**Press release**

1. Простае паведамленне для прэсы, у якім апісваецца нейкая падзея і паведамляецца, куды трэба звярнуцца па больш падрабязную інфармацыю.
2. Падрыхтаваная інфармацыя аб выпуску новага тавару альбо іншым важным здарэнні для арганізацыі, распаўсюджаная сярод органаў друку для магчымага апублікавання.





**Прэс-служба** (грамад. сув.)
**Пресс-служба**
**Press service**

Неабходны элемент у структуры арганізацыі, якая імкнецца быць вядомай у грамадстве. Галоўная задача прэс-службы – падтрымліваць кантакты з мас-медыя дзеля фарміравання пазітыўнага іміджу арганізацыі. Галоўная яе стратэгія – стварэнне паблісіці, а асноўныя формы кантактаў – прэс-канферэнцыі, брыфінгі, прэс-рэлізы, інтэрв'ю.

## Р

**Работнік** (прав. аспекты)
**Работник**
**Worker**

Асоба, якая мае працоўныя адносіны з наймальнікам на падставе заключанай працоўнай дамовы.

**Развіццё праграмы** (пошук фінанс.)
**Развитие программы**
**Programme development**

Пад "развіццём праграмы" разумеюць грант на падтрымку асобных праектаў ці праграм у адрозненне ад грантаў на агульную падтрымку.

**Рэарганізацыя арганізацыі** (прав. аспекты)
**Реорганизация организации**
**Reorganisation of an organisation**

Рэарганізацыя арганізацыі – зліццё, пераўтварэнне, далучэнне, падзел, выдзяленне арганізацыі. Можа здзяйсняцца па рашэнні яе заснавальнікаў (удзельнікаў) або органам юрыдычнай асобы, упаўнаважаным на гэта ўстаноўчымі дакументамі.

**Рэвізія** (прав. аспекты)
**Ревизия**
**Audit**

Праверка фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемтсваў, арганізацый, устаноў або службовых асоб за пэўны перыяд; найбольш глыбокае і поўнае абследаванне фінансава-гаспадарчай дзейнасці юрыдычных асоб з мэтай праверкі яе законнасці, правільнасці і мэтазгоднасці. Рэвізію праводзяць розныя кантра-

люючыя органы, найчасцей фінансавыя, а таксама органы дзяржаўнага кіравання ў адносінах да падведамных арганізацый. Вынікі рэвізіі афармляюцца актам, які мае важнае юрыдычнае значэнне. Акт падпісваюць кіраўнік рэвізійнай групы, кіраўнік і галоўны бухгалтар арганізацыі, якую правяраюць.

**Рэгістрацыя арганізацыйных структур** (прав. аспекты)
**Регистрация организационных структур**
**Registration of organisational structures**

Фіксацыя факта стварэння ў грамадскай арганізацыі яе структуры. Статутам грамадскага аб'яднання ў ліку іншых палажэнняў акрэсліваецца яго структура. Грамадскае аб'яднанне можа быць цэласным і не мець у сваім складзе арганізацыйных структур, альбо можа мець такія структуры, якія ўтвараюцца з правамі альбо без правоў юрыдычнай асобы. Арганізацыйныя структуры ствараюцца ў парадку альбо на ўмовах, акрэсленых у статуце грамадскага аб'яднання. Арганізацыйная структура дзейнічае на падставе статута грамадскай арганізацыі альбо асобнага Палажэння, зацверджанага паўнамоцнымі органамі.

**Рэгістрацыя дакументаў** (прав. аспекты)
**Регистрация документов**
**Documents registration**

Фіксацыя факта стварэння альбо набыцця грамадскай арганізацыяй дакумента шляхам прастаўлення на ім рэгістрацыйнага індэксу з запісам неабходных звестак аб дакуменце ў журналах рэгістрацыі. Дакументы рэгіструюцца толькі адзін раз.

**Рэгістрацыя недзяржаўных грамадскіх арганізацый** (прав. аспекты)
**Регистрация негосударственных общественных организаций**
**Registration of NGOs**

Фіксацыя факта стварэння недзяржаўнай грамадскай арганізацыі. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь устаноўлена дзяржаўная рэгістрацыя грамадскіх арганізацый і іх саюзаў (асацыяцый). Дзейнасць незарэгістраваных і не прайшоўшых перарэгістрацыю грамадскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі забаронена. Рэгістрацыя міжнародных і рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый ажыццяўляецца Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Мясцовыя грамадскія арганізацыі рэгіструюцца Упраўленнямі юстыцыі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў па месцы знаходжання кіруючага органа. Рэгістрацыя арганізацыйных структур грамадскіх арганізацый іншых дзяржаў ажыццяўляецца Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях". Рэгістрацыя прадстаўніцтваў грамадскіх структур іншых дзяржаў, прадстаўніцтваў іншых некамерцыйных замежных арганізацый ажыццяўляецца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь "Аб парадку адкрыцця і дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь прадстаўніцтваў замежных фірм і арганізацый" ад 22.07.1997 №929.





**Рэгістрацыя саюзаў (асацыяцый) грамадскіх арганізацый** (прав. аспекты)
**Регистрация союзов (ассоциаций) общественных организаций**
**NGO unions and associations registration**

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам грамадскія арганізацыі могуць добраахвотна аб'ядноўвацца ў асацыяцыі (саюзы). Яны, як і самі грамадскія арганізацыі, з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі. Дзяржаўная рэгістрацыя саюзаў грамадскіх арганізацый ажыццяўляецца ў тым жа парадку і ў тыя ж тэрміны, што і дзяржаўная рэгістрацыя грамадскіх арганізацый.

**Рэгістрацыя сімволікі** (прав. аспекты)
**Регистрация символики**
**Symbols registration**

Фіксацыя факта наяўнасці сімволікі ў арганізацыі. Для рэгістрацыі сімволікі грамадскага аб'яднання, калі яна ажыццяўляецца асобна ад рэгістрацыі грамадскага аб'яднання, на працягу месяца з дня яе зацвярджэння пасля ўзгаднення з Дзяржаўным камітэтам па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь (аддзелам па архівах і справаводству аблвыканкама) рэгіструючаму органу падаюцца дакументы на рэгістрацыю сімволікі. Пры прыняцці рашэння аб рэгістрацыі сімволікі грамадскаму аб'яднанню выдаецца пасведчанне аб рэгістрацыі сімволікі. Рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі сімволікі грамадскага аб'яднання можа быць прынята ў выпадку невыканання на працягу

месяца умоў, пералічаных у рашэнні аб адтэрміноўцы дзяржаўнай рэгістрацыі альбо наяўнасці заключэння Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводству (аддзелам па архівах і справаводству аблвыканкама) аб неадпаведнасці сімволікі існуючым патрабаванням.

**Рэзалюцыя** (прав. аспекты)
**Резолюция**
**Resolution**

Пісьмовае ўказанне кіраўніка аб парадку выканання ці выкарыстання дакумента.

**Рэзюме арганізацыі** (пошук фінанс.)
**Резюме организации**
**Resume of an organisation**

Раздзел заяўкі (прэзентацыя арганізацыі), галоўная мэта якога – стварыць прывабны імідж арганізацыі ў вачах фонду. Гэтая частка заяўкі павінна мець наступную інфармацыю: дата стварэння арганізацыі, кіраўнік арганізацыі, колькасны склад арганізацыі, місія арганізацыі, галоўныя накірункі дзейнасці, ажыццяўляемыя праекты, арганізацыі, з якімі супрацоўнічае Ваша арганізацыя, здзейсненыя акцыі і мерапрыемствы, дасягненні арганізацыі, грантадаўцы, з якімі супрацоўнічала альбо супрацоўнічае арганізацыя.

**Рэйтынг** (аг. п.)
**Рейтинг**
**Rating**

Ацэнка, аднясенне да класу, разраду ці катэгорыі ў адпаведнасці з прынятай ацэначнай сістэмай альбо класіфікацыяй.

**Рэквізіты** (прав. аспекты)
**Реквизиты**
**Properties**

Абавязковыя звесткі, якія павінны быць у дакуменце для прызнання яго сапраўдным. Такімі звесткамі, напрыклад, у дамове аб перевозцы ці ў транспартнай накладной з'яўляюцца: назва і дата складання дакумента, назва і адрас прадпрыемства ці арганізацыі, якая склала дакумент, бакі, што ўдзельнічаюць у гэтай аперацыі, змест аперацыі, падставы для яе правядзення, адзінкі вымярэння і аб'ём аперацый, подпісы адказных асоб. Найбольш строгія патрабаванні ўстаноўлены для бухгалтарскіх дакументаў, у якіх могуць быць прадугледжаны дадатковыя рэквізіты.

**Рэквізіцыя** (прав. аспекты)
**Реквизиция**
**Requisition**

У выпадках стыхійных бедстваў, аварый, эпідэмій, эпізаотый (пашырэнне інфекцыйнай хваробы жывёл на значнай тэрыторыі) і пры іншых умовах, якія носяць надзвычайны характар, маёмасць у інтарэсах грамадства па рашэнні дзяржаўных органаў можа быць канфіскавана ва ўласніка ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных законам, з выплатай яму кошту маёмасці.

**Рэклама** (грамад. сув.)
**Реклама**
**Advertisement**

Рэклама – гэта неасабовыя формы камунікацыі (узаемадзеяння), якія ажыццяўляюцца праз сродкі распаўсюджання інфармацыі.

**Рэкламная кампанія грамадскай арганізацыі** (грамад. сув.)
**Рекламная компания общественной организации**
**Advertising company of NGO**

Шэраг крокаў, якія дазваляюць данесці інфармацыю аб арганізацыі, яе дзейнасці, поспехах і дасягненнях да розных мэтавых груп у сціплай і прывабнай форме.

**Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне** (прав. аспекты)
**Республиканское общественное объединение**
**National NGO**

Рэспубліканскім прызнаецца грамадскае аб'яднанне, дзейнасць якога распаўсюджваецца на тэрыторыю ўсёй Рэспублікі Беларусь і сябрамі якога павінны быць прадстаўнікі з кожнай вобласці Рэспублікі Беларусь.

**Рэсурсны цэнтр** (прав. аспекты)
**Ресурсный центр**
**Resource centre**

Грамадская арганізацыя, якая бязвыплатна аказвае інфармацыйную, тэхнічную, кансультатыўную і іншыя віды дапамогі. Напрыклад, БРГА "Аб'яднаны шлях".

**Рэсурсы** (арг. разв.)
**Ресурсы**
**Resources**

Адзін з асноўных фактараў, які адлюстроўвае магчымасці арганізацыі, могуць быць чалавечыя ці матэрыяльныя.



**Савет арганізацыі** (чалавеч. рэс.)
**Совет организации**
**Council of an organisation**

Пастаянна дзейнічаючым кіруючым органам арганізацыі з'яўляецца савет арганізацыі, які выбіраецца агульным сходам на тэрмін да 3 гадоў і з'яўляецца падсправаздачным агульнаму сходу. Рашэнне аб персанальным складзе савета арганізацыі прымаецца не меньш чым 2/3 галасоў ад колькасці прысутных на агульным сходзе сябраў арганізацыі. Да выключнай кампетэнцыі савета арганізацыі адносяць: прыём і выключэнне з сябраў арганізацыі, усталяванне памеру сяброўскіх унёскаў, зацвярджэнне праграмы дзейнасці бюджэту арганізацыі, зацвярджэнне штатнага раскладу, прыняцце рашэння аб утварэнні камерцыйных ці некамерцыйных арганізацый, падпісанне ад імя арганізацыі дакументаў, непасрэднае прадстаўленне арганізацыі ў органах дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, вырашэнне ўсіх пытанняў, звязаных з дзейнасцю арганізацыі, акрамя тых, якія аднесены да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу і савета арганізацыі. Старшыня савета дзейнічае ад імя арганізацыі без даверанасці.

**Савет па міжнародных даследаваннях і абменах** (канкр. арг.)
**Совет по международным исследованиям и обменам**
**International Research and Exchanges Board (IREX)**

Адна з самых дасведчаных амерыканскіх арганізацый, якая садзейнічае ўсталяванню кантактаў, развіццю супрацоўніцтва і пашырэнню ўзаемадзеяння паміж акадэмічнымі таварыствамі дзяржаў былога Савецкага Саюза, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Манголіі і ЗША. IREX прадастаўляе стыпендыі для правядзення навуковых даследаванняў гуманітарных і грамадскіх навук, дае магчымасць атрымаць ацэнку эксперта па вялікім спектры дысцыплін і садзейнічае правядзенню экспертнага аналізу. Асноўнымі задачамі Прадстаўніцтва IREX у Беларусі з'яўляюцца: правядзенне сярод беларускіх навукоўцаў і спецыялістаў адчыненых агульнанацыянальных конкурсаў на атрыманне грантаў для правядзення індывідуальных навуковых даследаванняў і для ўдзелу ў адукацыйных і іншых праграмах у ЗША; садзейнічанне ўзнікненню ўмоў для правядзення даследчых работ амерыканскіх навукоўцаў у Беларусі; правядзенне праграм прафесійнай падрыхтоўкі і развіцця, якія адпавядаюць станаўленню дэмакратычнага грамадства ў новых эканамічных абставінах. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці ў Інтэрнет: www.irex.minsk.by

**Сацыяльна-педагагічны цэнтр** (прав. аспекты)
**Социально-педагогический центр**
**Social-teaching centre**

З'яўляецца ўстановай адукацыі, якая здзяйсняе сацыяльна-педагагічную, псіхолага-педагагічную, сацыяльна-псіхалагічную, сацыяльна-прававую, карэктыўна-рэабілітацыйную дапамогу дзецям і бацькам (асобам, якія іх замяшчаюць), якія маюць неабходнасць у такой дапамозе.

**Сацыяльна-рэабілітацыйныя паслугі** (грамад. сув.)
**Социально-реабилитационные услуги**
**Social-rehabilitation services**

Дапамога ў медыцынскай, прафесійнай, працоўнай, псіхалагічнай, педагагічнай рэабілітацыі і адаптацыі грамадзян і сем'яў, што знаходзяцца ў цяжкім жыццёвым становішчы.

**Сацыяльны валанцёр** (чалавеч. рэс.)
**Социальный волонтер**
**Social volunteer**

Фізічная асоба, якая добраахвотна аказвае сацыяльныя паслугі.

**Сацыяльны прытулак** (прав. аспекты)
**Социальный приют**
**Social refuge**

Часовае месца пражывання, выхавання (адукацыі) і забеспячэння ўсім неабходным дзяцей – сірот, дзяцей, якія засталіся без апякунства, асоб, якія не маюць жылля, асоб, якія пакутавалі ад фізічных здзекаў альбо псіхічнага ўплыву, стыхійных бедстваў, катастроф.

**Свабодная рэклама** (грамад. сув.)
**Свободная реклама**
**Free advertising**

Рэклама арганізацыі, якая можа складацца з прэс-рэліза з фотаздымкамі, цікавай гісторыі якой-небудзь вядомай асобы, ў якой ідзе гаворка і аб вашай арганізацыі ў тым ліку. Радыё і тэлебачанне заўсёды шукаюць што-небудзь цікавае для сваіх перадач, можа быць, гэта Ваш шанс.

**Свецка-дзелавая перапіска** (грамад. сув.)
**Светско-деловая переписка**
**Business correspondence**

Гэта перапіска на ўзроўні кіраўніцтва, якая адрасавана вышэйстаячым кіраўнікам. Яна выказвае: падзяку, клопат альбо спачуванне каму-небудзь унутры (альбо па-за) арганізацыі, сумесную стратэгію, грамадскую дзейнасць.

**Семінар** (аг. п.)
**Семинар**
**Seminar**

Групавыя заняткі, гурток якой-небудзь спецыяльнай падрыхтоўкі, дзеля павышэння кваліфікацыі.

**Сервер** (сучасн. тэхн.)
**Сервер**
**Server**

1. Праграмнае забеспячэнне, якое кіруе доступам да сеткі і яе рэсурсаў.
2. Камп'ютэр, на якім ўсталявана такое праграмнае забеспячэнне.

**Сервер правайдэр** (сучасн. тэхн.)
**Сервер провайдер**
**Server provider**

Арганізацыя, якая забяспечвае выхад у Інтэрнет.

**Сітуацыйнае лідэрства** (арг. разв.)
**Ситуационное лидерство**
**Situational leadership**

Прыстасаванне кіраўніком свайго стылю лідэрства да ўзроўню развіцця людзей, якія працуюць у арганізацыі, пры пастаноўцы кожнай задачы.





**Складальнік заяўкі** (пошук фінанс.)
**Составитель заявки**
**Grantseeker**

Асоба, якая ажыццяўляе даследаванні фондаў і складае заяўкі ў патэнцыйныя крыніцы фінансавання.

**Складанне вопісу** (аг. п.)
**Составление описи**
**Inventory compiling**

На справы доўгага захоўвання і па асабовым складзе складаюцца асобныя вопісы па ўсталяванай форме. Складанне вопісаў ажыццяўляецца на працягу 2-х гадоў пасля заканчэння спраў у справаводстве.

**Службовыя асобы** (прав. аспекты)
**Должностные лица**
**Officers**

Пад службовымі асобамі разумеюць:

1. Прадстаўнікоў улады, гэта значыць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і роўна дзяржаўных служачых, якія маюць права ў межах сваіх паўнамоцтваў аддаваць загады альбо распараджэнні, прымаць рашэнні, якія датычацца асоб, непадпарадкаваных ім па службе.
2. Прадстаўнікоў грамадскасці, гэта значыць асоб, якія не знаходзяцца на дзяржаўнай службе, але якім нададзены ва ўсталяваным парадку паўнамоцтвы прадстаўнікоў улады пры выкананні абавязкаў па ахове грамадскага парадку, па барацьбе з праваПарушальнікамі, па выкананні правасуддзя.
3. Асоб, якія пастаянна альбо часова, альбо па спецыяльным паўнамоцтве займаюць ў розных установах, арганізацыях альбо на прадпрыемствах (незалежна ад форм уласнасці), ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, іншых войсках і вайсковых фарміраваннях Рэспублікі Беларусь, пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых альбо адміністратыўна-гаспадарчых абавязкаў, альбо асоб ўпаўнаважаных ва ўсталяваным парадку на здзяйсненне юрыдычназначных дзеянняў.

**Спадарожны грант** (пошук фінанс.)
**Сопутствующий грант**
**Matching grant**

Грант, які суправаджае нейкі іншы грант, дадзены іншым донарам.

**Спажывец** (прав. аспекты)
**Потребитель**
**Consumer**

1. Любы суб'ект грамадзянскага права, які мае намер заказаць альбо набыць тавар, суб'ект, які заказвае, набывае альбо выкарыстоўвае тавар (калі ў апошнім выпадку тавар, у тым ліку састаўная частка іншага тавару, з'яўляецца прадметам здзейсненых і здзяйсняемых грамадска-праваых здзелак).
2. Грамадзянін, які заказвае, набывае альбо мае намер набыць ці заказаць нейкія тавары, ужываць іх дзеля асабістых, побытавых ці сямейных патрэб.

**Спажывецкі кааператыў** (прав. аспекты)
**Потребительский кооператив**
**Consumers' cooperative**

Спажывецкім кааператывам прызнаецца добраахвотнае аб'яднанне грамадзян і юрыдычных асоб на падставе сяброўства з мэтай задавальнення матэрыяльных (маёмасных) і іншых патрэб удзельнікаў, якое ажыццяўляецца праз аб'яднанне яго сябрамі маёмасных паевых унёскаў.

**Спецыялізаваны фонд** (прав. аспекты)
**Специализированный фонд**
**Special purpose foundation**

Прыватны фонд, які дае гранты на развіццё праектаў у адной, цікавай для яго сферы дзейнасці.

**Спецыяльнасць** (прав. аспекты)
**Специальность**
**Profession**

Сукупнасць набытых шляхам спецыяльнай падрыхтоўкі і досведу працы ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для выканання пэўнага віда працоўнай дзейнасці ў межах дадзенай прафесіі.





**Спіс пасад і службовых абавязкаў удзельнікаў праекта** (пошук фінанс.)
**Список должностей и должностных обязанностей участников проекта**
**Job description**

Спіс пасад асноўных выканаўцаў праекта складаецца з наступных звестак: пасада ў праекце, прозвішча, імя, імя па бацьку выканаўцы. Побач з кожнай пасадай змяшчаюцца адпаведныя абавязкі і кваліфікацыя выканаўцы (адукацыя, спецыяльнасць, досвед працы).
Такі спіс запытваюць не ўсе фонды, але рэкамендуецца ўключыць яго ў дадаткі да заяўкі.

**Спонсарства** (грамад. сув.)
**Спонсорство**
**Sponsorship**

Перадача сродкаў на патрэбы і (ці) праграмы ін-шай арганізацыі з мэтай атрымання пэўнай камерцыйнай выгады.

**Справа** (аг. п.)
**Дело**
**Matter**

1. Праца, занятак, дзейнасць.
2. Судовае разбіральніцтва, працэс.
3. Збор дакументаў, якія датычацца якога-небудзь факта ці асобы.

**Сродкі масавай інфармацыі** (грамад. сув.)
**Средства массовой информации**
**Mass media**

Сродкамі масавай інфармацыі лічаць перыядычнае друкаванае выданне, тэле-, радыёарганізацыю,

СПОНСАРСТВА



*Ну, калі ласка!..*

радыё-, тэле-, відэа-, кінахранікальную праграму, іншую форму (сродак) перыядычнага распаўсюджвання масавай інфармацыі.

**Стартавыя грошы** (пошук фінанс.)
**Стартовые деньги**
**Seed money**

Грант, які выкарыстоўваюць для пачатку новага праекта альбо дзейнасці арганізацыі (можа выкарыстовацца для выплаты заработнай платы ці на іншыя аператыўныя выдаткі).

**Старшыня** (прав. аспекты)
**Председатель**
**Chairman**

1. Асоба, якая ўзначальвае арганізацыю.
2. Асоба, якая сваёй кваліфікаванасцю арганізуе і кантралюе ход работы арганізацыі.

**Статут** (прав. аспекты)
**Устав**
**Charter**

Нарматыўна-прававы акт, які вызначае парадак дзейнасці дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый, устаноў, а таксама парадак дзейнасці дзяржаўных служачых і іншых асоб у вызначаных сферах дзейнасці.

**Страты** (прав. аспекты)
**Убытки**
**Losses**

У грамадзянскім праве пад стратамі разумеюць выдаткі, якія асоба, чыё права парушана, рабіла дзеля аднаўлення парушанага права; страта ці пашкоджанне маёмасці (рэальная шкода), а таксама неатрыманыя прыбыткі, якія гэта асоба атрымала б пры звычайных умовах грамадзянскага абароту, калі б яго права не было парушана (страчаная выгада).

**Стратэгічнае кіраванне** (арг. разв.)
**Стратегическое управление**
**Strategic management**

Пад стратэгічным кіраваннем разумеюць інтаграцыйнае кіраванне, якое ахоплівае планаванне, ажыццяўленне і кантроль агульнага стратэгічнага планавання.





## СТРАТЭГІЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ



**Стратэгічнае планаванне** (стратэг. план.)
**Стратегическое планирование**
**Strategic planning**

1. Набор дзеянняў і рашэнняў, якія прымае кіраўніцтва да распрацоўкі спецыфічных стратэгій для таго каб дапамагчы арганізацыі дасягнуць сваіх мэтаў.
2. Стратэгічнае планаванне складаецца з адаптацыі рэсурсаў і мэтаў арганізацыі да разнастайных і зменлівых умоў дзейнасці.

**Стратэгічны выбар** (стратэг. план.)
**Стратегический выбор**
**Strategic choice**

Рашэнне, выбранае з мноства магчымасцяў, якое заснавана на аналізе сітуацыі, місіі арганізацыі, рэсурсах і накірунках дзейнасці, якія кіраўніцтва лічыць найбольш эфектыўнымі.

**Стратэгія** (стратэг. план.)
**Стратегия**
**Strategy**

Дэталёвы ўсебаковы комплексны план, які прытрымліваецца місіі арганізацыі і забяспечвае дасягненне яе мэтаў.

**Стыкер** (грамад. сув.)
**Стикер**
**Sticker**

Таксама – налепка, флаер альбо мініплакат – друкуюцца на клейкай паперы і прызначаюцца для наклейвання ў самых розных месцах альбо для раздачы. Яны адлюстроўваюць адну тэму, але так, каб яе сэнс можна было "ухапіць" на працягу некалькіх секунд, альбо проста прэзентуюць фірменны знак арганізацыі. "Вулічныя" налепкі варта выкарыстоўваць абачліва. Каб яны не забруджвалі асяроддзе, не псавалі рэчаў і не выклікалі адмоўнай рэакцыі.

**Стыль лідэра, арыентаваны на дасягненні** (арг. разв.)
**Стиль лидера, ориентированный на достижения**
**Achievement oriented style of leadership**

Лідэр "строгі, але справядлівы". Дае людзям канкрэтныя ўказанні, натхняе перакананнямі і сваёй рэакцыяй на выкананне пастаўленых задач.

**Стыль лідэра "асабістым прыкладам"** (арг. разв.)
**Стиль лидера "силой личного примера"**
**Style of leadership "personal experience"**

Кіраўнік тыпу "рабі як я". Сам выконвае шмат заданняў. Чакае ад членаў групы працы, што яны будуць кіравацца яго прыкладам, не баіцца высокіх стандартаў і дае людзям працаваць самастойна.

**Стыль лідэра "настаўніка"** (арг. разв.)
**Стиль лидера "наставника"**
**Teaching style of leadership**

Кіраўнік тыпу "вы можаце зрабіць гэта самі". Дапамагае, дае магчымасці асабістаму развіццю кожнаму з супрацоўнікаў.

**Стыпендыі асобам** (пошук фінанс.)
**Стипендии лицам**
**Scholarships to individuals**

Дапамога непасрэдна фізічным асобам у выглядзе адукацыйных грантаў ці стыпендый.





**Стыпендыі на правядзенне навукова-даследчых работ** (пошук фінанс.)
**Стипендии на проведение научно-исследовательских работ**
**Fellowships**

Сродкі, якія выдзяляюцца адукацыйным установам на падтрымку праграм стыпендый на правядзенне навукова-даследчых работ. Некалькі фондаў прысуджаюць такія стыпендыі непасрэдна фізічным асобам.

**Субсідыі для грамадскіх арганізацый** (прав. аспекты)
**Субсидии для общественных организаций**
**Subsidy for NGOs**

Адзін з відаў дзяржаўнай падтрымкі грамадскіх аб'яднанняў, якая мае на мэце стымуляванне грамадскіх аб'яднанняў да актывізацыі грамадска-карыснай дзейнасці.

**Сумарныя фонды** (аг. п.)
**Суммарные фонды**
**General foundations**

Агульная казна, якая складаецца з роўных ці раўнацэнных сродкаў некалькіх партнёраў, і якая прызначана для спецыфічнай праграмы.

**Сумеснае прадпрыемства** (прав. аспекты)
**Совместное предприятие**
**Joint enterprise**

1. Прадпрыемства, якое ствараецца з мэтай ажыццяўлення вытворчай, навукова-вытворчай, навукова-тэхнічнай і іншай гаспадарчай дзейнасці ў галінах прамысловасці, навукі, сельскай гаспадаркі і ў іншых галінах народнай гаспадаркі з удзелам мясцовых арганізацый і фірм замежных краін. Дзейнасць сумеснага прадпрыемства рэгулюецца на падставе Законаў "Аб прадпрыемтвах у Рэспубліцы Беларусь", "Аб прадпрымальніцкай дзейнасці", "Аб замежных інвестыцыях", а таксама міждзяржаўных або міжурадавых дамоў Рэспублікі Беларусь або гаспадарчых дамоў. Удзельнікамі сумеснага прадпрыемства могуць быць адно або неалькі прадпрыемстваў Беларусі, якія з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і адна або некалькі замежных фірм, якія таксама з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

2. Аб'яднанне намаганняў двух і болей грантадаўцаў. Партнёры сумеснага прадпрыемства могуць падзяляць абавязкі ў галіне фінансавання, інфармацыйных і тэхнічных унёскаў.

**Суправаджальны ліст** (пошук фінанс.)
**Сопроводительное письмо**
**Cover letter**

Першая частка заяўкі, якая змяшчая ў сабе кароткую інфармацыю аб праекце, а таксама кантактныя звесткі.

**Супрацоўніцтва** (грамад. сув.)
**Сотрудничество**
**Collaboration**

Працэс, у выніку якога некалькі арганізацый заключаюць доўгатэрміновае афіцыйнае пагадненне аб сумеснай працы па дасягненні агульных мэтаў альбо распрацоўцы канкрэтнага праекта.

**Сусветны банк** (канкр. арг.)
**Всемирный банк**
**World bank**

Сусветны банк – буйнейшая ў свеце крыніца аказання дапамогі на мэты развіцця. Штогод ён прадастаўляе дзяржавам-кліентам каля 30 млрд. даляраў ЗША. Банк выкарыстоўвае свае фінансавыя рэсурсы, высокакваліфікаваны персанал і вялікую базу дзеля таго, каб аказваць індывідуальную дапамогу краінам, якія развіваюцца, і дзяржавам з пераходнай эканомікай.

**Схема арганізацыі працы – аргсхема** (пошук фінанс.)
**Схема организации работы – оргсхема**
**Table of business management**

Аргсхема – гэта графічнае прадстаўленне арганізацыйнай структуры праекта. Са схемы павінна быць зразумела, хто кім у арганізацыі кіруе, хто з кім супрацоўнічае. Яна павінна быць вельмі сціплай.

**Сход** (аг. п.)
**Собрание**
**Meeting**

Сумесная прысутнасць групы грамадзян, якія знаходзяцца дзеля публічнага абмеркавання і выказвання сваіх адносін да дзеянняў асоб і арганізацый, здарэнняў грамадска-палітычнага жыцця, а таксама да вырашэння пытанняў, што закранаюць іх інтарэсы.





**Сябра спажывецкага кааператыва** (прав. аспекты)
**Член потребительского кооператива**
**Member of a consumers' cooperative**

Грамадзянін Рэспублікі Беларусь, прыняты ва ўстаноўленым парадку ў сябры спажывецкага таварыства, які зрабіў уступны і паевы ўнёскі.

**Сяброўскія ўнёскі** (аг. п.)
**Членские взносы**
**Membership dues**

Унёскі ў агульны фонд арганізацыі людзьмі, якія з'яўляюцца сябрамі гэтай арганізацыі.




***ну, не міласціну падаеш!***

**Сямейны фонд** (пошук фінанс.)
**Семейный фонд**
**Family foundation**

Незалежны прыватны фонд, які існуе на сродкі членаў адной сям'і. Члены гэтага сямейства часта з'яўляюцца супрацоўнікамі і кіраўнікамі фонду і маюць вялікі ўплыў на прыняцце рашэнняў па пытаннях пошуку фінансавання.

T

**Таварны знак (брэнд, знак абслугоўвання)** (аг. п.)
**Товарный знак (бренд, знак обслуживания)**
**Trade mark**

Абазначэнне, якое садзейнічае адрозненню тавараў ці паслуг адной асобы ад аднародных тавараў і паслуг іншых асоб.

**Тактыка** (стратэг. план.)
**Тактика**
**Tactic**

Кароткатэрміновая стратэгія для дасягнення мэты, якая распрацоўваецца на ўзроўні кіраўнікоў сярэдняга звяна.

**Тактычныя задачы** (стратэг. план.)
**Тактические задачи**
**Tactic tasks**

Канкрэтныя (падлягаючыя колькаснай ацэнцы) ўчынкі (крокі) па дасягненні стратэгічнай мэты.

**Талака** (аг. п.)
**Толока**
**Talaka**

Калектыўная дапамога ў гаспадарчых работах, як правіла, бясплатная.

**TACIC** (канкр. арг.)
**ТАСИС**
**TACIS**

*Гл. "Праграма Еўрапейскага Саюза Тасіс"*





**Творчы саюз** (прав. аспекты)
**Творческий союз**
**Creative union**

Грамадскае аб' яднанне творчых работнікаў, якія сваімі дасягненням зрабілі ўнёсак у развіццё культуры, мастацтва і іншай культурнай творчай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, створанае ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку на аснове агульнасці інтарэсаў яго сябраў (удзельнікаў) у вызначанай галіне творчай дзейнасці для задавальнення іх духоўных альбо нематэрыяльных патрэб.

**Тлумачэнне да бюджэту** (пошук фінанс.)
**Пояснение к бюджету**
**Budget narrative**

Гэта частка заяўкі, якая змяшчае тлумачэнні некаторых складаных атыкулаў бюджэту.

**Трасты** (пошук фінанс.)
**Трасты**
**Trusts**

Трасты ці фонды – гэта арганізацыі, установы, створаныя прыватнымі асобамі дзеля распаўсюджвання сродкаў на дабрачынныя мэты. Часцей за ўсё яны маюць пачатковы капітал, атрыманы ад заснавальнікаў, а прыбыткі ад інвестыцый гэтых сродкаў распаўсюджваюцца ў форме субсідый.

**Трэнінг** (аг. п.)
**Тренинг**
**Training**

Сістэма, рэжым заняткаў, накіраваных ад адпрацоўку навыкаў і ўменняў у нейкай канкрэтнай галіне ведаў.

**Трэці сектар** (аг. п.)
**Третий сектор**
**The third sector**

Пад трэцім (грамадскім) сектарам разумеюць аб'яднанне людзей, якія сабраліся разам дзеля таго, каб дапамагчы сабе і іншым не з мэтай атрымання прыбытку, а з мэтай што-небудзь змяніць у сваім жыцці. Трэцім яго прынята лічыць у адносінах да дзяржаўнага сектара (першы сектар) і бізнес структур (другі сектар).

**Тытульны ліст заяўкі** (пошук фінанс.)
**Титульный лист заявки**
**Title page**

Вельмі важная частка заяўкі. Лепей усяго пачаць гэты ліст словамі: "Заяўка да:" ("Proposal to:"), пасля чаго ўказаць назву фонду, затым назву праекта, скончыць фразай "Прадастаўлена на разгледжанне (кім): ("Submitted by:"). Такое афармленне падкрэслівае, што Вы жадаеце надаць заяўцы форму асабістага звароту.

**Тэлеграмы (тэлетайпаграмы)** (аг. п. )
**Телеграммы (телетайпограммы)**
**Telegrams**

Абагульненая назва розных па змесце дакументаў, якія выдзяляюцца ў сувязі з адмысловым спосабам перадачы тэксту. Тэлеграмы складаюцца ў выпадках, калі адпраўка дакументаў поштай не забяспечвае своечасовага вырашэння пытанняў.

**Тэхнічная дапамога** (пошук фінанс.)
**Техническая помощь**
**Technical assistance**

Дапамога, прадастаўленая грамадскай арганізацыі супрацоўнікамі фонду ці староннім спецыялістам, якія прапаноўваюць свае паслугі дадзенай арганізацыі. Можа заключаць у сабе наступныя віды дапамогі: пытанні фандрайзінгу, бюджэтнага планавання, юрыдычныя кансультацыі, пытанні маркетынгу і менеджменту.

## У

**Уводзіны заяўкі** (пошук фінанс.)
**Введение заявки**
**Introduction**

Частка заяўкі, у якой распавядаецца пра арганізацыю-заяўніка. У гэтай частцы вы больш падрабязна знаёміце фундатара з вашай арганізацыяй, падаючы яе лепшага боку. Ва Уводзінах павінны быць змешчаны наступныя пункты: місія і мэта арганізацыі, дата стварэння арганізацыі, узнагароды і прэміі, якімі была адзначана праца вашай арганізацыі, паспяхова выкананыя праекты і праграмы, звесткі пра тую частку насельніцтва, з якой звязана ваша дзейнасць, крыніцы фінансавання, аб'ём працоўнага бюджэту на бягучы фінансавы год, асаблівасці вашай арганізацыі.





На Уводзіны, як і на бюджэт звяртаецца найбольшая ўвага, і аналізуюцца яны вельмі скрупулёзна, таму калі ў маладой арганізацыі няма дастатковага досведу, пра які яны маглі б паведаміць, патрэбна звярнуцца па дапамогу да іншых арганізацый, прыцягнуць да супрацоўніцтва ў складанні заяўкі больш дасведчанага партнёра.

**Указ** (прав. аспекты)
**Указ**
**Decree**

Нарматыўны акт кіраўніка дзяржавы альбо пастаяннага калегіяльнага органа, які ствараецца вышэйшым прадстаўнічым органам дзяржаўнай улады.

**Указанне** (аг. п.)
**Указание**
**Instructions**

Настаўленне, тлумачэнне, якое ўказвае, як патрэбна дзейнічаць. Указанне выдаецца па пытаннях інфармацыйна-метадычнага характару, а таксама звязаных з арганізацыяй выканання загаду, інструкцый і іншых актаў.

**Улётка** (грамад. сув.)
**Листовка**
**Flier**

Выданне на адной старонцы, звычайна вялікім накладам, прысвечанае адной тэме, альбо аднаму тавару; яе задача – хуткае распаўсюджванне новай інфармацыі. Цяпер робіцца ўсё больш папулярным такі варыянт улёткі, як флаер – малафарматная, але кідка аформленая. Улётка – вельмі распаўсюджаная, але малаэфектыная форма рэкламы, бо значная частка тыражу трапляе да выпадковай аўдыторыі і не даходзіць да адрасата, не ўспрымаецца ім.

**Улік** (аг. п.)
**Учёт**
**Record**

1. Устанаўленне наяўнасці, колькасці чаго-небудзь, праз падлікі.
2. Рэгістрацыя з занясеннем у спіс асоб, якія з'яўляюцца сябрамі якой-небудзь арганізацыі.

**Унутраны кантроль** (аг. п.)
**Внутренний контроль**
**Internal control**
Агульны курс і меры, накіраваныя на атрыманне гарантыі, што спецыяльныя мэты арганізацыі будуць дасягнуты.

**Упаўнаважаная службовая асоба наймальніка** (прав. аспекты)
**Уполномоченное должностное лицо нанимателя**
**Employer**
Кіраўнік (яго намеснікі) арганізацыі (адасобленага падраздзялення), кіраўнік структурнага падраздзялення (яго намеснікі), майстар, спецыяліст альбо іншы работнік, якому заканадаўствам альбо наймальнікам прадастаўлена права прымаць усе альбо асобныя рашэнні, што выцякаюць з працоўных і сумежных з імі пытанняў.

**Усеагульная Дэкларацыя Правоў Чалавека** (прав. аспекты)
**Всеобщая Декларация Прав Человека**
**Universal Declaration of Human Rights**
Міжнародны дакумент, які абвяшчае асноўныя правы і свабоды кожнага чалавека.
Усеагульная Дэкларацыя Правоў Чалавека была прынятая Генеральнай Асамблеяй Арганізацый Аб'яднаных Нацый 10 снежня 1948 года.
Паводле гэтай Дэкларацыі дзяржавы павінны паважаць правы чалавека і асноўныя свабоды для ўсіх незалежна ад расы, полу, мовы і рэлігіі, палітычных і іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмаснага або іншага становішча; чалавек мае права на жыццё, свабоду і бяспеку асобы; права на працу і належны жыццёвы ўзровень.

**Установа** (прав. аспекты)
**Учреждение**
**Institution**
Арганізацыя, якая створана ўласнікам для ажыццяўлення кіраўнічых, сацыяльна-культурных альбо іншых функцый некамерцыйнага характару і фінансуемая ім цалкам альбо часткова.





Ф

**Факсіміле (факс)** (аг. п.)
**Факсимиле (факс)**
**Facsimile**
Матэрыял, які перадаецца па тэлефоннай сувязі.

**Факт-ліст** (грамад. сув.)
**Факт-лист**
**Fact sheet**
Гэта кароткі дакумент, які кампактна адлюстроўвае профіль арганізацыі, службовай асобы альбо падзеі. Тыповы аднастаронкавы факт-ліст уключае ў сябе кароткае апісанне арганізацыі, імёны кіраўнікоў, месцазнаходжанне, бягучыя лічбы, якія адлюстроўваюць дзейнасць, асноўныя дасягненні і праблемы, кароткую гісторыю арганізацыі. Факт-лісты дасылаюцца рэдактарам СМІ і служаць крыніцай матэрыялаў для артыкулаў.

**Фандрайзінг** (пошук фінанс.)
**Фандрайзинг**
**Fundraising**
Пошук крыніц рэсурсаў у працэсе збору сродкаў для рэалізацыі сацыяльна значных праграм і (або) дзеля падтрымкі арганізацыі.

**Фарміраванне спраў** (аг. п.)
**Формирование дел**
**Files formation**
Фарміраваннем спраў называецца групоўка дакументаў у справы ў адпаведнасці з зацверджанай наменклатурай спраў. Пры афармленні спраў звяраецца адпаведнасць дакументаў назве справы па наменклатуры. Пры фаміраванні спраў трэба быць паслядоўным у складанні дакументаў, якія павінны быць ў справе.

**Фасілітатар стратэгічнага планаванні** (стратэг. план.)
**Фасилитатор стратегического планирования**
**Facilitator for assistance in strategic planning**
Незалежны спецыяліст з якой-небудзь іншай арганізацыі, які можа дапамагчы па цэлым шэрагу пытанняў: дапамога ў агульным працэсе стратэгічнага планавання, дапамога ў складанні пытанняў неабходных для арганізацыі інфармацыі і інш.

**Федэратыўная праграма прадастаўлення грантаў** (пошук фінанс.)
**Федеративная программа предоставления грантов**
**Federal giving programme**

Сумесны праект некаторых грамадскіх арганізацый, якія жадаюць атрымаць фінансавую падтрымку, якімі кіруе "парасонавая" грамадская арганізацыя, у абавязкі якой уваходзіць размеркаванне атрыманых грантаў сярод астатніх грамадскіх арганізацый.

**Філантрапія** (аг. п.)
**Филантропия**
**Philanthropy**

Літаральна – "любоў да чалавецтва". Абазначае акт дарэння; у сувязі з дзейнасцю НДА гэты тэрмін падразумявае акт прадастаўлення фінансавай дапамогі (грант).

**Філіял** (прав. аспекты)
**Филиал**
**Branch**

Адасобленае падраздзяленне юрыдычнай асобы, размешчанае па-за месцам яго знаходжання, якое ажыццяўляе ўсе альбо частку яго функцый, у тым ліку функцыі прадстаўніцтва.

**Фінансавае абавязацельства** (аг. п.)
**Финансовое обязательство**
**Financial commitment**

Фармальнае, як правіла, пісьмовае пацвярджэнне выдачы грошай, каштоўнасцяў, якое гарантуе фінансавую падтрымку якойнебудзь арганізацыі, што прадастаўляецца іншай арганізацыяй, фондам і г.д.

**Фінансавае абяцанне** (аг. п.)
**Финансовое обещание**
**Financial promise**

Прамое, часце за ўсё вуснае абяцанне аб прадастаўленні фінансавай падтрымкі.





**Фінансавая справаздача грантаатрымальніка** (пошук фін.)
**Финансовый отчёт грантополучателя**
**Grantee's financial report**

Дэталёвая фінансавая справаздача арганізацыі фонду аб выкарыстанні гранта. Часцей усяго фінанасавая справаздача ўтрымлівае поўны спіс усіх затрат, даходаў і выдаткаў, актываў і грашовых пазык.

**Фінансавая стабільнасць** (арг. разв.)
**Финансовая стабильность**
**Financial stability**

Гэта такі стан арганізацыі, пры якім яна можа аплочваць не толькі свае, але і бягучыя выдаткі, маючы канкрэтныя крыніцы паступлення сродкаў.

**Фірменная назва** (прав. аспекты)
**Фирменное наименование**
**Brand name**

Імя арганізацыі, якое дапамагае стварыць прыцягальны імідж і прывабіць патэнцыйных кліентаў і партнёраў арганізацыі. Фірменая назва – гэта адзін з аб'ектаў інтэлектуальнай маёмасці побач з вынаходствамі, таварнымі знакамі.

**Фірменны стыль** (грамад. сув.)
**Фирменный стиль**
**Corporate identity**

Адзінства пастаянных візуальных і тэкставых элементаў, якое дапамагае ідэнтыфікаваць прыналежнасць да канкрэтнай арганізацыі. Асноўныя яго часткі: лагатып, сімволіка, слоганы, пэўныя шрыфты і колеры. Распрацоўка фірменнага стылю – сур'ёзная прафесійная задача, а прыняты стыль неабходна захоўваць, не дапускаючы выпадковых зменаў, іначай яго існаванне губляе ўсялякі сэнс.

**Фонд** (пошук фінанс.)
**Фонд**
**Foundation**

Некамерцыйная арганізацыя без сяброўства, заснаваная грамадзянамі і (ці) юрыдычнымі асобамі на прынцыпах добраахвотных маёмасных унёскаў. Арганізацыя мае на мэце дасягненне сацыяльных, культурных, дабрачынных, адукацыйных, альбо

іншых грамадска-карысных мэтаў праз прадастаўленне фінансавай або тэхнічнай падтрымкі на рэалізацыю праектаў або праграм грамадскіх арганізацый, дзяржаўных структур, прыватных асоб (у залежнасці ад мэтаў дзейнасці фонду).

**Фонд агульных мэтаў** (пошук фінанс.)
**Фонд общих целей**
**General purpose foundation**
Незалежны прыватны фонд, які з'яўляецца грантадаўцам у розных сферах.

**Фонд прамога дзеяння** (пошук фінанс.)
**Фонд прямого действия**
**Operating foundation**
Прыватны фонд, які выкарыстоўвае свае рэсурсы для падтрымкі ўласных даследаванняў альбо непасрэднага прадастаўлення паслуг. Такія фонды могуць прадастаўляць гранты і іншым арганізацыям, але сумы ў гэтых выпадках меньшыя за тыя, што ідуць непасрэдна на патрэбы самога фонду.

**Фундатар** (пошук фінанс.)
**Фандер**
**Funder**
Той, хто прадастаўляе фінансавыя сродкі; арганізацыя ці група, якія прадастаўляюць свае фінансавыя рэсурсы на патрэбы сацыяльных праграм.

## Х

**Характарыстыка** (аг. п.)
**Характеристика**
**Character reference**
Афіцыйны дакумент, у якім змяшчаецца водгук (ацэнка) пра чыю-небудзь працоўную і грамадскую дзейнасць.

**"Хуткія гранты" (ад праграмы TACIC)** (канкр. арг.)
**"Бытрые гранты" (от программы ТАСИС)**
**"Fast grants" (from TACIS)**
Сістэма "хуткіх грантаў" распрацавана ў межах праграмы "TACIC", каб пазбегнуць бюракратычных працэдур і хутка атрымаць невялікія сумы грошай (да 100 тыс. экю – гэта каля 124 тыс. даляраў). Калі працягласць Вашага праекта не больш за дзевяць месяцаў, то Вы маеце права на атрыманне "хуткага гранта". Такі грант можна





выкарыстоўваць для кансультацыйных паслуг, для даследаванняў, на арганізацыю канферэнцыі і семінараў, для прафесійнай падрыхтоўкі. Гэтыя гранты пакрываюць не больш 30% ад агульнага кошту праекта. Яны не могуць служыць стыпендыямі для канкрэтных асоб.

## Ц

**Цывільная адказнасць** (прав. аспекты)
**Гражданская ответственность**
**Civil liabilities**
Ускладаемы на фізічную або юрыдычную асобу абавязак кампенсаваць маёмасныя страты, нанесеныя невыкананнем або неналежным выкананнем дамоўнага ці іншага абавязацельства або ўчыненнем якіх-небудзь супрацьпраўных дзеянняў.

**Цэнзура** (аг. п.)
**Цензура**
**Censorship**
Палітыка-прававы інстытут, які ажыццяўляе кантроль за зместам, абнародаваннем і распаўсюджваннем масавай інфармацыі з мэтай недапушчэння альбо абмежавання распаўсюджвання інфармацыі і ідэй, якія прызнаюцца грамадствам і дзяржавай непажаданымі альбо шкоднымі.

## Ч

**Чалавечыя рэсурсы** (чалавеч. рэс.)
**Человеческие ресурсы**
**Human resources**
Групы людзей, сумесная праца якіх накіравана на дасягненне агульнай мэты і базуецца на адзіных каштоўнасцях, падобных ідэйных устаноўках і матывацыях.

**Часткі заяўкі** (пошук фінанс.)
**Части заявки**
**Parts of an application form for a grant**
Заяўка складаецца з наступных частак: тытульны ліст, кароткая анатацыя, уводзіны, пастаноўка праблемы, мэты і задачы, метады, ацэнка і справаздачнасць, далейшае фінансаванне, бюджэт, дадаткі.

## Ш

**Шматгадовае абавязацельства** (пошук фінанс.)
**Многолетнее обязательство**
**Long-term liabilities**
Асігнаванне бюджэтаў, разлічанае на некалькі гадоў, і прызначанае для канкрэтных прыярытэтных патрэб, праграм ці праектаў.

**Штат арганізацыі** (аг. п.)
**Штат организации**
**Staff of an organisation**

Асноўныя штатныя пасады Вашай арганізацыі, колькасць супрацоўнікаў – пастаянных і часовых. Буйныя арганізацыі маюць некалькі варыянтаў такіх апісанняў рознай велічыні – ад самых кароткіх да шматлістаавых ілюстраваных брашур. На пачатку дзейнасці можна скласці адно ўніверсальнае апісанне на 1-2 старонкі і пры неабходнасці дапаўняць і змяняць яго.

**Штогадовая справаздача** (пошук фінанс.)
**Ежегодный отчёт**
**Annual report**

Добраахвотная справаздача, выдадзеная фондам альбо карпарацыяй, якая ўтрымлівае інфармацыю аб фінансавых дадзеных і апісанне яе (карпарацыі) дзеянняў у галіне фандрайзінгу. Штогадовыя справаздачы вар'іруюцца ад простых машынапісных дакументаў, што ўяўляюць сабой спіс гадавых грантаў, да дэталізаваных публікацый, якія забяспечваюць істотную інфармацыю аб грантах.

## Э

**Электронная пошта** (сучасн. тэхн.)
**Электронная почта**
**E-mail**

Найбольш распаўсюджаная паслуга Інтэрнет. З яе дапамогай Вы можаце абменьвацца электроннымі паведамленнямі з мільёнамі людзей ва ўсім свеце. Людзі выкарыстоўваюць электронную пошту для тых жа мэтаў, што і звычайную пошту альбо тэлефонную сувязь.

## Ю

**Юрыдычная адказнасць** (прав.аспекты)
**Юридическая ответственность**
**Legal responsibility**

Дзяржаўны прымус да выканання патрабаванняў права; праваадносіны, у якіх кожны з бакоў абавязаны адказваць за свае ўчынкі перад іншым бокам, дзяржавай і грамадствам. Адрозніваюць 4 віды юрыдычнай адказнасці: крымінальная, адміністратыўная, дысцылінарная і цывільная.





**Юрыдычная асоба** (прав. аспекты)
**Юридическое лицо**
**Juridical person**

Арганізацыя, якая мае ў сваёй уласнасці, гаспадарчым вядзенні альбо аператыўным кіраванні адасобленую маёмасць, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязацельствах, мае магчымасць ад свайго імя набываць ці ажыццяўляць маёмасныя і асабовыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе. Юрыдычная асоба павінна мець самастойны баланс і каштарыс.

**Юрыдычная кансультацыя** (прав. аспекты)
**Юридическая консультация**
**Legal consultation**

1. Нізавое звяно адвакатуры, што аб'ядноўвае ўсіх адвакатаў, якія працуюць у пэўным населеным пункце (раёне, горадзе). Юрыдычная кансультацыя не з'яўляецца асобай юрыдычнай, але мае ўласны бягучы рахунак, пячатку і штамп усталяванай формы. У сваёй дзейнасці падсправаздачная прэзідыуму (гарадскому, абласному) калегіі адвакатаў.
2. Тэрмін "юрыдычная кансультацыя" ужываецца таксама для абазначэння парады, даведкі, тлумачэння па пытаннях права.

**Юрысконсульт** (чалавеч. рэс.)
**Юрисконсульт**
**Legal adviser**

1. Службовая асоба, юрыст, які адказвае за вырашэнне прававых пытанняў ва ўстанове і з'яўляецца абаронцам яе інтарэсаў.
2. Работнік прававой службы на прадпрыемстве, ва ўстанове, у арганізацыі. Юрысконсульт ажыццяўляе кантроль за законнасцю загадаў і распараджэнняў, што выдае кіраўнік (у межах яго кампетэнцыі), удзельнічае ў складанні дамоваў, якія заключаюцца з іншымі прадпрыемствамі, вядзе ў судзе справы, па якіх прадпрыемства выступае як ісцец альбо адказчык, кансультуе рабочых і служачых па прававых пытаннях.

**Юрыст** (чалавеч. рэс.)
**Юрист**
**Lawyer**

Спецыяліст па юрыдычных навуках, юрыдычных пытаннях.

## Бібліяграфія

Dictionary of social protection terms. English, Russian, German, French = Словарь терминов по социальной защите. Английский, Русский, Немецкий, Французский / Office for Official Publications of the European Communities. – Luxembourg, 1996.

Frame, J. Davidson. Managing projects in organizations. – San Francisco,1995.

Guidebook to Proposal Writing in CEE and the Former Soviet Union / The Institute for Local Government and Public Service. – Budapest, 1995.

Norton M., Eastwood M. Directory of Social Change. Writing Better Fundraising Applications. – Liverpool,1997.

How to work with Tacis. For organisations seeking to obtain Tacis contacts / Tacis Information Office. – Brussels, 1998.

Pezzullo S. The International Youth Foundation. Growing Your Organisation: a Sustainability Resource Book for NGOs. – Baltimore, 2000.

The complete guide to nonprofit management / Smith, Bucklin and Association. – New York, 1994.

The drama of leadership / John Wiley and Sons, Inc. – New York, 1996.

Аб творчых саюзах і творчых работніках: Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 1999 г. // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – №4.

Аксенова О., Лунева Л., Халий И. Место под солнцем: Практическое пособие для экологических некоммерческих организаций. – 1998.

Бастунец А., Пастухов М.,Топорашев Ю. Закон о СМИ: альтернативный вариант. – Минск, 2002.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.1/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1996. – 552 с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.3/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1996. – 511 с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.5/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1997. – 576 с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.6/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1998. – 576 с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.7/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1998. – 608 с.: іл.



Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.8/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1998. – 576 с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.9/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1999. – 560 с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.10/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1999. – 544 с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.12/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – 560s с.: іл.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.13/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – 576 с.: іл.

Булыка А.М. Слоўнік іншамоўных слоў:У 2 т. Т. 2. – Мн., 1999. – 736 с.

Бухгалтерский учёт в общественных объединениях / БРОО "Объединённый путь". – Мн., 1999.

Бэсслер Т., Смит М.У. Как строить донорские партнёрства. – New York, 1997.

В поисках ЭКЮ. Деньги Европейского союза для общественных организаций / Европейская Программа Взаимодействия. – М., 1995.

Вопросы Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь: Постановление Совета Министров РБ от 31.10.2001 №1589 // Национальные реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – №105.

Вырашэнне канфліктаў. Дэмакратычнае лідэрства / БРГА "Аб'яднаны Шлях", Цэнтр "Супольнасць". – Гомель, 1997.

Гражданский кодекс Республики Беларусь// Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1999. – №7-9.

Грин Ч.Т., Грин И.К. Как составить успешный проект. Шаг за шагом: Пер. с англ.- NGO Centrs-Riga, 1997.

Договора гражданско-правового характера в деятельности общественных объединений / БРОО "Объединённый путь". – Мн., 1999.

Дункан У. Д. Основополагающие идеи в менеджменте. – М., 1996.

Дэниеле Джон Д., Радеба Ли Х. Международный бизнес. – М.: Дело Лтд., 1994.

Избирательный кодекс Республики Беларусь // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – №25.

Инвестиционный кодекс Республики Беларусь // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – №37.

Инструкция о банковских операциях по международным расчетам (документарные аккредитивы, гарантии, инкассо): Утв. Правлением На-

ционального банка Республики Беларусь 25.08.1998, протокол №15.3 // Бюллетень нормативно-правовой информации. – 1998. – №23.

Интеллектуальная собственность общественных организаций / БРОО "Объединённый путь". – Мн., 1999.

Как писать заявку на грант / Гомельский ресурсный центр общественных объединений при Гомельском областном отделении Белорусского комитета "Дети Чернобыля". – Гомель, 1998.

Как создать неприбыльную организацию и управлять ею / United Way International Moscow Liaison. – Люберцы, 1993.

Кампания по продвижению общественных интересов: Развернутая программа семинара для общественных организаций / Американский Фонд Развития, Московский исследовательский центр по правам человека.

Каўрус А. А. Дакумент па-беларуску. – Мн., 1994.

Кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях // Собрание законов Белорусской ССР, указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, постановлений Совета Министров Белорусской ССР. – 1984 г. – №35.

Комаров С. А., Малько А. В. Теория государства и права: Учебно-методическое пособие: Краткий учебник для вузов. – М.: Издательская группа НОРМА-ИНФРА.- М., 1999.

Комментарии к Гражданскому кодексу Республики Беларусь: В 2 кн. Кн. 1. / Отв. ред. В. Ф. Чигир. – 2-ое изд. – Мн.: Амалфея, 2000.

Конституция Республики Беларусь // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 1999. – №1.

Котлер Ф. Основы маркетинга: Пер. с англ. – М.: Ростинтэр, 1996. – 704 с.

Лаптенок А. Искусство информации, выборы: работа с общественностью. – Мн., 1995.

Лицензируемые виды деятельности в работе общественных объединений / БРОО "Объединённый путь". – Мн., 1999.

Менеджмент НПО или просто о сложном / Творческий центр Counterpart. – Киев, 1998.

Мескон М.Х., Альберт М., Хедоури Ф. Основы менеджмента: Пер. с англ. – М.: Дело, 1992.

Методические рекомендации по организации работы с документами в общественных объединениях / БРОО "Объединённый путь". – Мн., 1999.



Міхальчанка А. М., Давыдава Э. М. Дапаможнік па справаводству. – Мн., 1993.

На пороге нового тысячелетия / Всемирный Банк. – Мн.

Нататнік / Інфарматыўны бюлетэнь няўрадавых арганізацыяў Віцебшчыны. – Віцебск, 2000.

О банках и банковской деятельности в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь от 14 декабря 1990 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. – 1990. – №2.

О благотворительной деятельности и благотворительных организациях : Проект Закона Республики Беларусь : [Электронный ресурс] / Национальный центр правовой информации. - Мн., 2003. - Режим доступа: http:// www.pravo.by.

О государственном регулировании внешнеторговой деятельности: Закон Республики Беларусь от 29 декабря 1998 г. // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1999. – №4.

О гражданстве Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь от 18 октября 1991 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1991. – №32.

О защите прав потребителей: Закон Республики Беларусь от 19 ноября 1993 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1993. – №35.

О международных договорах Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь от 8 июля 1998 г. // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1998. – №29-30.

О местном самоуправлении: Закон Республики Беларусь от 20.02.91 №617-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1995. – №15-16.

О некоторых вопросах деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь: Указ Президента РБ №660 от 13.11.2001 // Национальные реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – №108.

О нормативных правовых актах Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь от 10 января 2000 г. // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – №7.

О патентах на изобретения и полезные модели: Закон Республики Беларусь от 8 июля 1997 г. // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1997. – №27.

О печати и других средствах массовой информации: Закон Республики Беларусь от 13 января 1995 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1995. – №12.

О политических партиях: Закон Республики Беларусь от 5 октября 1994 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1994. – №30.

О практике рассмотрения судами гражданских дел о защите чести, достоинства и деловой репутации: Постановление Пленума Верховного Суда Республики Беларусь от 23.12.1999 г. №15 // Судовы веснік. – 2000. – №1.

О предпринимательстве в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь от 28 мая 1991 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. – 1991. – №19.

О президенте Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь от 21 февраля 1995 г. , в редакции Закона Республики Беларусь от 7 июля 1997 г. // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1997. – №24.

О противодействивии монополистической деятельности и развитии конкуренции: Закон Республики Беларусь от 10 января 2000 г. // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – №8.

О профессиональных союзах: Закон Республики Беларусь от 14 января 2000 г. // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – №23.

О свободе вероисповеданий и религиозых организациях: Закон Республики Беларусь от 17 декабря 1992 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1993. – №2.

О собраниях, митингах, уличных шествиях, демонстрациях и пикетировании: Закон Республики Беларусь от 30 декабря 1997 г. // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1998. – №2.

О собственности в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь от 11 декабря 1990 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. – 1990. – №2.

О социальном обслуживании: Закон Республики Беларусь от 22 мая 2000 г. // Национальные реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – №50.

О товарных знаках и знаках обслуживания: Закон Республики Беларусь от 5 февраля 1993 года // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1993. – №13.

Об адвакатуре: Закон Республики Беларусь от 15 июня 1993 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1993. – №20.



Об аренде: Закон Республики Беларусь от 12 декабря 1990 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета БССР. – 1991. – №1.

Об аудиторской деятельности: Закон Республики Беларусь от 8 ноября 1994 г. // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. – 1994. – №35.

Об утверждении Положения о Министерстве информации Республики Беларусь: Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 26.10.2001 в редакции Постановления от 23.10.2003 № 1457 и от 03.03.2003 № 291// Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – №5.

Ожегов С. И., Шведов Н. Ю. Толковый словарь русского языка. – М., 1997.

ООН в вашей повседневной жизни / Организация Объединённых Наций. – Женева, 1999.

Основные понятия финансового менеждемента для неправительственных организаций: Матер. междунар. семинара БДФ-ХДФ. – Мн., 1995.

Основы деятельности и успеха некоммерческих организаций / Российское представительство CAF. – М., 1995.

Основы работы на компьютере / IREX/Pro Media. – Мн., 1999.

От идеи – к воплощению / Независимая Служба Мира. – М., 1994.

Поиски финансирования: План занятия / БРОО "Объединённый путь". – Мн.

Положение о порядке открытия банками счетов клиентам: Утв. Правлением Национального банка Республики Беларусь 29.12.1998, протокол №19.3 // Банковский вестник. – 1999. – №3.

Положение о потребительской кооперации в Республике Беларусь: Утв. Декретом Президента Республики Беларусь от 20.08.1999 №32 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 1999. – №65.

Положение общественных объединений в Республике Беларусь / БРОО "Объединённый путь". – Мн., 2001.

Положения о коммерческой тайне: Утв. Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 06.11.1992 №670 // Собрание постановлений Правительства Республики Беларусь, – 1992. – №32.

Правовое положение общественных объединений в Республике Беларусь / БРОО "Объединённый путь". – Мозырь, 2001.

Примерная инструкция по делопроизводству в министерствах, госкомитетах и других центральных органах управления, учреждениях, организациях и на предприятиях Республики Беларусь: Утв. приказом Государственного комитета по архивам и делопроизводству Республики Беларусь от 23.05.1995 №13 // Бюллетень нормативно-правовой информации. – 1995. – №11.

Путь к успеху / Центр Социально-технического просвещения "Голубка". – М.,1995.

Размаўляем па-беларуску: спроба кароткага PR-глясарыю // Бюлетэнь Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў. - 2003. – Студзень.

Ресурсы Интернет для общественных организаций / Центр СКАФ. – Мн., 1999.

Сборник нормативных актов, регулирующих деятельность общественных объединений и политических партий / Управление Юстиции Витебского облисполкома. – Витебск, 1997.

Связи с общественностью: технология успеха / БРОО "Объединённый путь". – Мн.

Секреты гранта / Учебно-консультационное агенство "Интерстандарт". – Киев, 1996.

Семинар по общественно-деловым отношениям неправительственных неприбыльных организаций со СМИ, государством и бизнесом / Творческий Центр Counterpart. – Украина, 1999.

Слагаемые успеха некоммерческих организаций / CAF. – Россия, 1997.

Словарь юридических терминов / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Мн., 2000.

Создание и регистрация некоммерческих организаций / Общественный Экологический Центр "Даурия". – Чита, 2001.

Создание, функционирование и развитие общественной организации / Центр Поддержки Ассоциаций и Фондов. – Мн., 1999.

Соколова И. И. Настольная книга главного редактора. – М., 2001.

Стратегическое планирование для общественных организаций / CAP. – Мн., 1998.

Тренинг НПО: миссия, видение, структура, лидерство / Творческий Центр Counterpart. – Украина, 1998.

Тренинг по общественно-деловым отношениям / Творческий центр Counterpart.- Украина, 1999.



Третий сектор, или благотворительность для "чайников" / BBC, MPM. – М., 1997.

Трудовой кодекс Республики Беларусь // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. -1999. – №80.

Уголовно – процессуальный кодекс Республики Беларусь // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1999. – №28-29.

Уголовный Кодекс Республики Беларусь // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 1999. – №76.

Управление некоммерческими организациями: Материалы учебной конференции / Университет Джонса Хопкинса; United Way International. – 1994.

Фенрых П., Роўда У. Да дэмакратыі праз грамадзянскую супольнасць. – Шчэцін, 1999.

Фрюминг Р., Лаком Ж. Взаимодействие ради результата, практикум делового общения. – М., 1997.

Эффективное развитие общественной организации / БРОО "Объединенный путь". – Мн., 1998.

Юридические аспекты деятельности некоммерческих организаций / Программа Поддержки Некоммерческого Сектора. – Мн., 2000.

Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: С.В.Кузьмін і інш. – Мн.: БелЭн, 1992. – 636 с.

Як пісаць прапанову / Foundation for Education for Democracy. – Варшава, 1998.

Даведачнае выданне
**Энцыклапедыя тэрмінаў для грамадскіх арганізацый**

Укладальнікі:
**Самалоўскіх** Вераніка Сяргееўна
**Чырко** Іна Міхайлаўна

Рэдактар
**Козіч** Наталля Мікалаеўна

Карэктар *Н.М.Козіч*
Камп'ютэрная вёрстка *А.Д.Радзькоў*
Дызайн вокладкі і малюнкі *М.А.Нікіфаровіч*

Распаўсюджваецца БЯСПЛАТНА